*Студыйны варыянт*

# КАНСПЕКТЫ
## ДАПАМОЖНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ
## ДЛЯ КАТЭХЕЗАЎ

X кл.

Катэхетычная секцыя пры ККББ
2008 г.

Тэма № 1, X кл.

# СВЕТ, У ЯКІМ Я ЖЫВУ

***Дыдактычная мэта:*** перадаць вучням праўду пра стварэнне свету і чалавека, якія паўсталі з Божай любові.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваць у вучняў пачуццё ўдзячнасці да Бога і бацькоў за дар жыцця, а таксама гатоўнасць несці адказнасць за парадак у свеце, за сябе і іншых.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Быц 1; 2, 7; каляровыя карткі і алоўкі для кожнага вучня, мазаіка для кожнага вучня, падрыхтаваныя з лістоў А4, прылады для малявання, аўдыёзапіс тэксту пра стварэнне свету, дыск з прыгожай мелодыяй.

***Метады катэхезы:*** складанне мазаікі, праца ў групах.

## *Ход заняткаў*

***Малітва:*** Апостальскі сімвал веры.

### Чалавек пытае

Усё, што існуе, мае свой пачатак. Чалавек як разумная істота задае пытанне пра пачатак існавання свету. Углядаючыся ў навакольны свет, немагчыма не заўважыць, што ён мае свайго аўтара. Святое Пісанне, у якім ёсць апісанне стварэння свету, кажа нам, што гэты Аўтар — Пан Бог.

### Бог адказвае

*Вучні атрымліваюць мазаіку і прылады для малявання. Заданне для груп: намаляваць тое, што ўзнікне ў іх уяўленні падчас праслухоўвання аўдыёзапісу. Пасля раздачы матэрыялаў катэхет (К.) уключае запіс тэксту з кнігі Быцця ў суправаджэнні прыгожай мелодыі (напр. «Стварэнне свету» Ф. Гайдна, «Чатыры пары года» А. Вівальдзі). Праца працягваецца 15 хвілін. Затым усе аркушы паперы К. складае ў форме сэрца.*

Дадатак да тэмы «Свет, у якім я жыву» кл.Х



Як вы ўжо заўважылі, у нашым сэрцы не хапае яшчэ адной дэталі.

*К. уключае спакойную музыку і чытае ўрывак з Кнігі Быцця. Затым бярэ дэталь з надпісам* **Ты**, *паказвае яе асобна кожнаму вучню і кладзе ў цэнтр мазаікі.*

Ствараючы свет, Пан Бог ведаў, што ў ім будзе жыць кожны з нас. Кожнага з нас Ён паклікаў да жыцця, кожны з нас — Ягонае стварэнне. Кожны з нас мае сваё заданне ў створаным Богам свеце. Працуючы далей над тэкстам, мы даведаемся, якое заданне Бог даручыў кожнаму з нас.

*К. дзеліць клас на 3 групы, кожнай дае асобнае пытанне і тэкст Кнігі Быцця. Кожная група пэўным колерам павінна падкрэсліць адказ, які знойдзе ў тэксце:*

— Што тэкст Кнігі Быцця кажа пра Бога?

— Што тэкст Кнігі Быцця кажа пра чалавека?

— Што тэкст Кнігі Быцця кажа пра іншыя стварэнні?

(*Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік)*

.

• Бог Усемагутны, Ён стварае свет з нічога — сваёю моцаю. Бог робіць гэта з любові.

• Бог стварае чалавека на свой вобраз (розум і воля).

• Бог стварае мужчыну і жанчыну (рознасць полу), іх сувязь манагамная.

• Чалавек мае душу і цела. Для Бога чалавек мае вялікае значэнне і вартасць.

• Чалавек атрымлівае ад Бога заданне — працаваць над уласнай дасканаласцю і сваёю працаю ўдасканальваць свет.

• Паміж чалавекам і іншымі стварэннямі існуе вялікая розніца.

• Свет быў створаны дасканалым, у ім не было месца для зла. Кожнае стварэнне добрае.

• У Божай справе стварэння існуе парадак і гармонія.

• Бог падрыхтаваў для чалавека рай — месца шчасця і дабрабыту.

Параўноўваючы свет сучасны і свет, які быў напачатку, мы не можам не заўважыць розніцы. Чаму свет так змяніўся? (*Адказы вучняў*).

Праца над уласнай дасканаласцю і над удасканальваннем свету набліжае нас да мэты, якою ёсць вечнае жыццё, прабыванне з Богам — Паўнатою Шчасця. Таму за свае ўчынкі мы нясём вялікую адказнасць — як перад нашым Стварыцелем, так і перад іншымі людзьмі, а таксама перад самімі сабою. Хрысціянін — гэта чалавек, які павінен быць мужным і адказным за сваё жыццё, а таксама ўдзячным Богу і сваім бацькам за гэты цудоўны дар.

**Чалавек адказвае Богу**

*К. раздае вучням каляровыя карткі і алоўкі. Вучні павінны запісаць словы падзякі і праслаўлення Пана Бога за створаны свет і за ўласнае жыццё. Карткі*

*вучні прыклейваюць да плаката з сэрцам. Падчас працы можа гучаць «What a wonderful life» («Які прыгожы сусвет») Л. Амстронг.*

Прыгажосць створанага свету — гэта шлях, па якім чалавек можа прыйсці да Бога.

***Разважанне:***

— Як часта я дзякую Пану Богу за прыгажосць створанага Ім свету?

— Што я магу зрабіць дзеля таго, каб зберагчы гэту прыгажосць?

— Як я магу паўплываць на тое, каб у свеце было менш зла?

— Як я аказваю ўдзячнасць Пану Богу за Яго бязмежную любоў да мяне?

— Як я клапачуся аб развіцці дароў і талентаў, якімі мяне адарыў Стварыцель?

— Як выглядае мае вучоба, праца? Ці можна яе назваць сумленнай і дасканалаю?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. У вячэрняй малітве падзякуй Пану Богу за створаны свет, а таксама папрасі сілы і мудрасці, каб годна працаваць над удасканальваннем свету.
2. Выкарыстоўваючы свае таленты, адлюструй урывак з Кнігі Быцця аб стварэнні свету. Гэта можа быць малюнак, верш, музычны твор, калаж і г.д.

***Заключная малітва:*** *падручнік вучня*

Тэма № 2, X кл

**РЭЛІГІІ СВЕТУ.**

**Дыдактычная мэта:**

Распавядаем вучням аб тым, што чалавек ад моманту свайго існавання імкнецца да Творцы. Праз малітву, рэлігійныя абрады, чалавек шукае дыялогу з Богам, бо толькі Ён можа заспакоіць прагенні сэрца чалавека, а таксама знаёмім вучняў з асноўнымі рэлігіямі свету.

**Выхаваўчая мэта:**

Выхоўваем у вучнях прагненне ўзрастаць у веры, пазнаючы сэнс і мэту ўласнага хрысціянства.

**Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:**

Дэкларацыя пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій,
Дэкларацыя аб рэлігійнай свабодзе, ККК.

***Метады катэхезы:*** прэзентацыя, аналіз тэкстаў.

**Ход заняткаў**

***Малітва:*** Ойча наш

***Чалавек пытае***

У кожнай краіне свету, у вялікіх мегаполісах і ў маленькіх, мала каму вядомых мясцінах, мы можам ўбачыць святыню, якую пабудавалі людзі, каб праз малітву і розныя абрады аддаваць хвалу і пашану Богу. Багацце рэлігійных сімвалаў, абрадаў, малітваў, святаў, мастацкіх твораў на рэлігійную тэматыку, якія мы атрымалі ў спадчыну ад нашых прадзедаў, з’яўляецца яскравым пацвярджэннем таго, што на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва людзі шукалі Бога, праслаўлялі Яго, аддавалі Яму хвалу.

У старажытнасці і сярэднявеччы людзі спрабавалі акрэсліць, што азначае слова “рэлігія”, звяртаючыся да першапачатковага слова, ад якога яно можа паходзіць. Адказы былі розныя: адныя выказвалі думку, што слова “рэлігія” паходзіць ад лацінскага слова "relegere", што азначае "прачытаць наноў"; другія бралі за аснову слова "religere" (злучаць, звязваць) , характарызуючы рэлігію як сувязь чалавека з Богам; св. Аугустын прытрымліваўся думкі, што слова “рэлігія” паходзіць ад слова "reeligare" — што азначае “выбіраць наноў”. Як

бачым, людзі на працягу вякоў стараліся зразумець сутнасць рэлігіі, шукалі крыніцу яе паходжання.

II Ватыканскі Сабор кажа так:

*«Людзі чакаюць ад розных рэлігій адказу на запаветныя таямніцы чалавечай экзістэнцыі, якія сёння, як і ў папярэднія часы, глыбока ўзрушваюць сэрцы людзей: кім ёсць чалавек, які сэнс і мэта нашага жыцця, што такое маральнае дабро і грэх, адкуль і дзеля чаго ўзнікае цярпенне, які шлях вядзе да сапраўднага шчасця, што такое смерць, суд і адплата пасля смерці, і ўрэшце, чым ёсць апошняя і невымоўная таямніца, што ахоплівае нашае існаванне, з якой мы бяром пачатак і да якой імкнемся» (Nostra aetate, 1).*

Сэнс жыцця, шчасце, цярпенне, смерць — гэтыя пытанні заўсёды турбавалі чалавека. Узнікненне рэлігіі — гэта стаpанне чалавека знайсці адказ на гэтыя пытанні.

*Хатнім заданем вучняў было падрыхтаваць невялікую прэзентацыю аб такіх рэлігіях як: хрысціянства, іслам, будызм, іудаізм, індуізм. Вучні прэзентуюць сваю працу. Затым, К. запрашае вучняў прачытаць у сваіх падручніках матэрыял, які адлюстроўвае лічбу вызнаўцаў асноўных рэлігій свету.*

**Лічба вызнаўцаў асноўных рэлігій свету.**



**хрысціянства** — каля 1,8 мільярдаў людзей, больш за 30% ад усяго чалавецтва:

- *каталікі — каля 970 мільёнаў,*
- *праваслаўныя — 150-200 мільёнаў,*
- *старажытныя ўсходнія Касцёлы — 30 мільёнаў,*
- *англікане — 60 мільёнаў,*
- *пратэстанты — 300-450 мільёнаў,*



***іслам** — 0,9 мільярдаў*



***індуізм** — 0,7 мільярдаў*



***будызм** — 0,3 мільярдаў*



***іудаізм*** — *18 мільёнаў*

- ***іншыя рэлігіі*** — *0,3 мільярдаў*
- ***не дэкларуюць прыналежнасць да рэлігіі*** — *0,7 мільярдаў*

**Колькасць вызнаўцаў асноўных рэлігій свету (2009 г.)**

*( ў мільёнах)*




Вельмі вялікая колькасць людзей дэкларуе сваю прыналежнасць да пэўнай рэлігі. Чаму так адбываецца?

***Бог адказвае***

*Адказ на гэтае пытанне нам дае вучэнне Касцёла:*

*«Прагненне Бога запісана ў сэрцы чалавека, таму што чалавек створаны Богам і для Бога; Бог не перастае прыцягваць да сябе чалавека, і толькі ў Богу чалавек знойдзе праўду і шчасце, якіх ён няспынна шукае» (пар. ККК 27).*

— Чаму чалавек шукае Бога?

*«Сусвет: зыходзячы з руху і станаўлення, мэтазгоднасці, ладу і прыгажосці свету, можна пазнаць Бога як першапрычыну і мэту Сусвету. (...) Св. Аўгустын: Спытай прыгажосць зямлі, спытай прыгажосць мора, спытай прыгажосць неба (...) — спытай усё існае. Усё адказвае табе: "Глядзі, мы цудоўныя". Уся гэта прыгажосць — вызнанне. Хто стварыў гэтую прыгажосць, падлеглую зменам, калі не Цудоўны, які не падлягае зменам» (пар. ККК 32).*

*«Чалавек: з яго адкрытасцю на праўду і прыгажосць, з яго маральным пачуццём, з яго свабодай і з голасам яго сумлення, з яго*

*імкненнем да бясконцасці і да шчасця, чалавек задае сабе пытанне наконт існавання Бога. Праз усё гэта ён адрознівае знакі сваёй душы, сваёй духоўнасці. (...) Яго душа не можа мець іншага пачатку, як толькі ў адным Богу» (пар. ККК 33).*

— Як чалавек можа адкрыць Бога?
— Чаму чалавек можа адкрыць Бога?

Падсумаанне працы вучні запісваюць у сшытак.

1. **Чалавек – істота рэлігійная, адкрытая для пазнаваня Бога**, вера з'яўляецца адказам на найглыбейшыя прагненні сэрца.
2. Аб Богу прамаўляе прыгажосць навакольнага свету, права прыроды; **Бог Сам адкрывае Сябе чалавеку.**

Чалавек мае магчымасць пазнаць Бога, таму што Ён першы аб'яўляецца чалавеку. Бога мы не бачым, але Ён пакінуў нам бачныя і зразумелыя знакі сваёй прысутнасці і любові. Кожны чалавек, калі толькі сам гэтага пажадае, можа адшукаць гэтыя знакі, знайсці Бога і праз веру распачаць з Ім дыялог любові. Існаванне ў свеце розных рэлігій — гэта знак таго, што чалавек імкнеца да свайго Стварыцеля, толькі ідзе да Яго сваім шляхам.

**ЧАЛАВЕК АДКАЗВАЕ БОГУ**

К. запрашае вучняў яшчэ раз прыгадаць прэзентацыі, якія рабілі вучні на пачатку катэхезы. К. дапамагае вучням узгадаць і запісаць асоўныя пастулаты рэлігій.

| Назва рэлігіі | Хто заснавальнік? (век паўстання) | Вобраз Бога | Асноўныя прынцыпы веравызнання |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |

Рэлігія вельмі моцна ўплывае на жыццё чалавека, фарміруе яго. Чым глыбей чалавек усведамляе існаванне Бога, Яго Ўсемагутнасць, Яго веліч, Яго любоў да кожнага чалавека, тым бліжэй хоча быць з'яднаны з Богам. Змяняецца светапогляд чалавека, яго адносіны да самога сябе, да іншых людзей, да абавязкаў і працы, якую выконвае. У чалавеку ўзрастае пачуццё адказнасці за кожнае слова, за кожны чын, за кожную думку, за кожнае прагненне. Адкрываючы для сябе жыццё як дар ад Бога чалавек стараецца жыць так, каб быць годным гэтага дару. Ніхто не мае права забараніць чалавеку вызнаваць рэлігію, згодна з пастулатамі якой чалавек хоча жыць.

Нажаль, яшчэ і сёння існуюць краіны, у якіх вернікам забараняецца адкрыта вызнаваць сваю рэлігію, у якіх паміж прадстаўнікамі рэлігій вядуцца войны. А як мы, як хрысціяне павінны адносіцца да прадстаўнікоў іншых рэлігій? На гэтую тэму мы паразмаўляем на наступнай катэхезе.

***Разважанне:***

Я маю магчымасць пазнаць Бога, таму што Ён першы аб'явіў сябе. Ён пакінуў мне бачныя і зразумелыя знакі сваёй прысутнасці і любові.

— Ці заўважаю я сляды прысутнасці Бога ў сваім жыцці?
—Як часта я дзякую Пану Богу за тое, што Ён дае мне знакі сваёй прысутнасці?
—Ці дзякую я Богу за дар веры?
—Як я клапачуся аб яе развіцці?
—Як я адношуся да людзей іншых веравызнанняў?

***Пастанова.***
***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняй малітвы падзякуй Пану Богу за дар веры.

***Заключная малітва:*** *( Пс 19(18), 2-5).*

Тэма № 3, X кл.

**Хрысціянін адносна іншых рэлігій.**

**Дыдактычная мэта:**

распавядаем вучням аб няправільных паставах, якія можа прыняць чалавек у адносінах да іншых рэлігій. Паказваем вучням паставу дыялогу і супрацоўніцтва, якую займае Каталіцкі Касцёл у адносінах да нехрысціянскіх рэлігій.

**Выхаваўчая мэта:**

Выхоўваем у вучнях паставу падзякі Богу за дар веры і прыналежнасць да Каталіцкага Касцёла, а таксама жаданне дыялогу і супрацоўніцтва з прадстаўнікамі іншых рэлігій, у духу талерантнасці, павагі і адкрытасці.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:***

Дэкларацыя пра адносіны Касцёла да нехрысціянскіх рэлігій, ККК, Фрагмент з Паслання Святога Айца Бэнэдыкта XVI на Сусветны дзень міру 1 студзеня 2007 г.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** вызнанне веры

**ЧАЛАВЕК ПЫТАЕ**

На мінулым занятку мы пазнаёміліся з традыцыйнымі рэлігіямі свету. Прыгадайце, каліласка, што гэта за рэлігіі? У чым заключаюцца асновы іх веравызнання?

У сённяшні час чалавек мае неабмежаваныя магчымасці пазнаваць культуру іншых народаў, а разам з тым і новую рэлігію, якая з'яўляецца фундаментам культуры кожнага народу. Усё часцей на вуліцах нашых гарадоў мы сустракаемся з эмігрантамі з Усходніх краінаў, якія ў сваёй большасці з'яўляюцца вызнаўцамі ісламу. Можна ўбачыць як будуецца сінагога — святыня вызнаўцаў юдаізму. На паліцах кніжных магазінаў можам знайсці кнігі, якія распавядаць нам аб індуізме, а ў інтэрнэце — прачытаць мноства інфармацыі аб сінтаізме. У такой сітуацыі чалавек можа не заўважна для сябе заблытацца.

Існуюць некалькі памылковых меркаванняў, якія адмоўна ўплываюць на светапогляд чалавека і яго ўзаемаадносіны з прадстаўнікамі іншых рэлігій.

| ***Неадпаведныя рэлігійныя паставы*** | ***Пастава Каталіцкага Касцёла да іншых рэлігій*** |
|---|---|
| 1. ***Ірэнізм*** *— ў кожнай рэлігіі яе вызнаўцы праслаўляюць Бога, і не важна як яны Яго называюць. Галоўнае, што гэтыя людзі жывуць справядліва, а значыць, могуць быць збаўленыя.*<br>2. ***Сінкрэтызм*** *— не існуе адна сапраўдная рэлігія, кожная з іх мае добрыя і праўдзівыя пастулаты, абяднанне якія дазволіць стварыць адну сапраўдную рэлігію.* | |

| | |
|---|---|
| 3. ***Празалітызм*** *— толькі тая рэлігія, да якой я прыналежу – сапраўдная, а іншых трэба навяртаць.* | |

Якою жа павінна быць пастава хрысціяніна да іншых рэлігій?

Вельмі важным дакументам які датычыць узаемаадносін Касцёла да іншых рэлігій з'яўляецца ДЭКЛАРАЦЫЯ ПРА АДНОСІНЫ КАСЦЁЛА ДА НЕХРЫСЦІЯНСКІХ РЭЛІГІЙ

*«Каталіцкі Касцёл не адмаўляе нічога, што ў гэтых рэлігіях ёсць праўдзівага і святога. Ён са шчырай павагай разглядае той спосаб дзеянняў і жыцця, тыя прадпісанні і вучэнні, якія, хоць і значна адрозніваюцца ад таго, што развівае і чаму навучае Касцёл, усё ж часам адлюстроўваюць промень той Праўды, якая асвячае ўсіх людзей. Сапраўды, Касцёл абвяшчае і заўсёды павінен абвяшчаць Хрыста — "дарогу, праўду і жыццё" (Ян 14, 6), у якім людзі знаходзяць паўнату рэлігійнага жыцця і праз якога Бог прымірыў усё з сабою. Таму Касцёл заклікае сваіх дзяцей, каб праз дыялог і супрацоўніцтва з паслядоўнікамі іншых рэлігій яны разважліва і з любоўю, даючы сведчанне веры і хрысціянскага жыцця, прызнавалі, захоўвалі і падтрымлівалі тыя духоўныя і маральныя даброты, а таксама сацыяльна-культурныя каштоўнасці, якія ў іх знаходзяцца» (Nostra aetate, 2).*

— Да чаго заклікае Касцёл кожнага хрысціяніна? (да размовы і супрацоўніцтва)

*К. запісвае ў табліцы слова "дыялог"*

Касцёл не перакрэслівае каштоўнасці іншых рэлігій, але ў дыялогу падкрэслівае тое, што з'яўляецца агульным з хрысціянствам.

*К. дзеліць вучняў на 3 групы, якія працуюць з тэкстамі вучэння Касцёла.*

Група 1 – ККК 839

— Што агульнага мае хрысціянствам з юдаізмам?

Група 2 – ККК 841

— Што агульнага мае хрысціянства з ісламам?

Група 3 – ККК 843

— Што з'яўляецца асновай дыялогу паміж хрысціянамі і іншымі нехрысціянскімі рэлігіямі?

Як бачым, Касцёл прагне праз сваю місійную дзейнасць у духу любові сведчыць іншым людзям аб адзіным Богу, які аб’явіў нам сябе ў асобе Езуса Хрыста. Вучэнне Касцёла кажа:

*«Хоць людзі не па сваёй віне не ведаюць Евангелля, Бог можа шляхамі, якія вядомы Яму аднаму, весці да веры, без якой “немагчыма падабацца Богу” (Гбр 11, 6), аднак Касцёл мае абавязак і адначасова святое права абвяшчаць Евангелле ўсім людзям» (пар. ККК 848).*

Увесь род людскі стварае адну вялікую сям’ю, якая мае агульны пачатак, бо кожны створаны на вобраз Бога. У цэнтры Божага плану збаўлення чалавека знаходзіцца Езус Хрыстус, якога ад самага пачатку абвяшчае Касцёл і робіць гэта да сённяшняга дня ў духу любові, міру і супрацоўніцтва ў адосінах да іншых рэлігій. Вось некаторыя факты:

*«На важнасць саюзу паміж хрысціянскім светам і мусульманамі ў глабальных пытаннях біяэтыкі ўказаў старшыня Папскай акадэміі «Pro Vita» арцыбіскуп Рыно Фізікелла. Ватыканскі іерарх закрануў дадзеную тэму ў інтэрв’ю італьянскаму штотыднёвіку «Темрі». Арцыбіскуп нагадаў аб сваёй нядаўняй размове з паслом Турцыі ў Апостальскай Сталіцы, падчас якой абодва бакі падкрэслілі неабходнасць «рацыянальнай ацэнкі, у якой хрысціянскае і ісламскае бачанне жыцця маюць агульныя элементы, на падставе якіх магчыма разам бараніць жыццё перад абліччам выклікаў біяэтыкі».*

*«13 ліпеня 2009 г. у Вене (Аўстрыя) адбылося пасяджэнне канферэнцыі прадстаўнікоў галоўных рэлігій (хрысціянства, ісламу, юдаізму, індуізму, будызму). Сярод удзельнікаў сустрэчы былі і прадстаўнікі Касцёлаў Блізкага Усходу, а таксама старшыня ісламскай секцыі пры Папскай Радзе па міжрэлігійным дыялогу. Пасяджэнне стала своеасаблівым працягам сустрэчы ў Мадрыдзе ў ліпені 2008 г., ініцыятарам якой быў кароль Саудаўскай Аравіі».*

*«Недапушчальнымі з’яўляюцца канцэпцыі Бога, якія схіляюць да непрыязнасці да бліжніх і да насілля ў адносінах да іх. Гэта неабходна сказаць выразна: ні ў якім выпадку нельга адобрыць вайну ў імя Бога! Калі якая-небудзь канцэпцыя Бога з’яўляецца глебай злачынства, то гэта знак, што такая канцэпцыя ўжо ператварылася ў ідэалогію» (Бэнэдыкт XVI, Пасланне на Сусветны дзень міру 1 студзеня 2007 г.)*

— Да чаго заклікае Святы Айцец?

**Чалавек адказвае Богу**

На пачатку свайго пантыфікату Папа Бенедыкт XVI сказаў: "Неабходна будаваць масты сяброўства з усімі рэлігіямі".

*“Недапушчальнымі з’яўляюцца канцэпцыі Бога, якія схіляюць да*

*непрыязнасці да бліжніх і да насілля ў адносінах да іх. Гэта неабходна сказаць выразна: ні ў якім выпадку нельга адобрыць вайну ў імя Бога! Калі якая-небудзь канцэпцыя Бога з'яўляецца глебай злачынства, то гэта знак, што такая канцэпцыя ўжо ператварылася ў ідэалогію."*

*(Фрагмент з Паслання Святога Айца Бэнэдыкта XVI на Сусветны дзень міру 1 студзеня 2007 г.)*

— Як словы Святога Айца можна практычна ажыццявіць у нашым асяроддзі, дзе мы жывем, вучымся, працуем? (*свае адказы вучні запісваюць на дошцы)*

***Разважанне:***

— Кім для мяне з'яўляюцца прадстаўнікі іншых рэлігій?

— Як я адношуся да прадстаўнікоў іншых рэлігій?

— Ці стараюся я будаваць з імі масты сяброўства?

— Як часта я дзякую Пану Богу за тое, што з'яўляюся каталікам?

— Якое сведчанне ўласнага хрысціянства я даю ў сваім асяроддзі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. 1. Напішы ліст сябру, з якім падзелішся тым, што табе найбольш падабаецца ў Касцёле.

***Заключная малітва:*** падручнік вучня

Тэма № 4, X кл.

**БОГ — АЎТАР НАТУРАЛЬНАГА ЗАКОНУ**

***Дыдактычная мэта:*** паказваем моладзі, што Бог з'яўляецца Творцам

натуральнага права, якое кожны чалавек пазнае пры дапамозе свайго розуму. Яно датычыць умення адрозніць дабро ад зла. Чалавек сам распазнае яго ў сваёй уласнай натуры, створанай Богам.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у моладзі пачуццё адказнасці за маральнае жыццё, заснаванае на Дэкалогу.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Дз 4, 19; Дрг 30, 11–14; Рым 2, 14–16; Мц 19, 16–22; Ян Павел II *Elementarz etyczny.*

***Метады катэхезы:*** аналіз тэксту, размова.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Пс 112.

**Чалавек пытае**

*К. распачынае з вучнямі размову, задаючы пытанні:*

— Што такое закон?

— Навошта ён існуе?

— Якi закон абавязвае нас?

*(К. робіць падагульненне адказаў).*

Закон існуе для таго, каб дапамагаць чалавеку правільна і гарманічна развівацца, дапамагаць рэгуляваць узаемаадносіны паміж людзьмі, ахоўваць агульначалавечыя вартасці.

Час юнацтва — гэта быццам білет у будучыню, які можна выкарыстаць альбо выкінуць — змарнаваць. Кім я стану і якіх вяршыняў я ў сваім жыцці дасягну, залежыць ад таго, што я выбіраю для свайго жыцця сёння. Як, жывучы ў свеце рэкламы, дзе кожны прапаноўвае «сваю праўду», не стаць марыянеткай, якой кіруюць іншыя? Што дапамагае мне зрабіць правільны выбар і не памыліцца?

**Бог адказвае**

На старонках Святога Пісання мы сустракаемся з маладым чалавекам, які не ведаў, што ён павінен рабіць, і прыйшоў спытаць у Езуса:

«**Да Езуса падышоў адзін чалавек і сказаў: “Настаўнік, што добрага зрабіць мне, каб мець жыццё вечнае?” Ён адказаў яму: “Чаму пытаешся ў мяне пра дабро? Адзін ёсць Добры! Калі хочаш увайсці ў жыццё вечнае, захоўвай запаведзі.” Той кажа Яму: “Якія?” Езус адказаў: “Не забівай, не чужалож; не крадзі, не сведчы фальшыва, шануй бацьку і маці, любі бліжняга твайго, як самога сябе”. Юнак кажа Яму: “Усё гэта я захоўваў, чаго яшчэ нестае мне?” Езус кажа яму: “калі хочаш быць дасканалым, ідзі, прадай маёмасць сваю і раздай бедным, і здабудзеш скарб у нябёсах; і прыходзь ісці за Мною”. Пачуўшы сказанае, юнак адышоў засмучаны, бо меў вялікую маёмасць**» (пар. Мц 19, 16–22).

— Якое пытанне юнак задаў Езусу?

— Які быў адказ Езуса?

Пан Бог, даючы чалавеку запаведзі, дае адначасова аснову маральнага жыцця. Езус дадае да іх восем благаслаўленняў, звяртаючы ўвагу на тое, што хрысціянін павінен не толькі захоўваць закон, але і быць адкрытым на патрэбы іншых людзей, рабіць дабро не пад страхам Божай кары, але з любові да Бога і чалавека**.** Але ці толькі веруючы чалавек, які ведае запаведзі, можа адрозніць дабро ад зла? На гэтую тэму пісаў Ян Павел ІІ у сваёй кнізе "*Буквар па этыцы" (падручнік вучня):*

*«Увесь Божы закон, запісаны калісьці на каменных табліцах, адначасова спрадвеку запісана ў людскіх сэрцах так, што і тыя, хто не ведае Дэкалогу, ведаюць яго істотную сутнасць. Бог абвяшчае маральны закон не толькі словамі Запавету — Старога Запавету з гары Сінай і Хрыстовага Евангелля, — але абвяшчае яго ўнутранаю праўдаю таго разумнага стварэння, якім ёсць чалавек... Гэты маральны фундамент паходзіць ад Бога, запісаны ў Яго стваральнай айцоўскай мудрасці і прадбачлівасці. Калі чалавек знішчае гэты фундамент, ён шкодзіць сабе: разбурае супольны лад людскога жыцця ў кожным вымярэнні».*

— З дапамогаю чаго чалавек пазнае натуральны закон?

— Якім чынам натуральны закон яднае чалавека (нават няверуючага) з Богам?

Таксама і Святое Пісанне як у Старым, так і ў Новым Запавеце кажа пра існаванне натуральнага закон.

*Калі ласка, прачытайце самастойна ўрыўкі Кнігі Другазаконня 30, 11–14 і Паслання да Рымлянаў 2, 14–16 і адкажыце на пытанне: дзе, паводле прачытаных тэкстаў, у кожным чалавеку запісаныя маральныя законы?* (*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

«**Запаведзь, якую сёння даю табе, — гэта не штосьці цяжкае і недасягальнае для цябе. Яна не ў нябёсах, каб можна было сказаць: Хто б узышоў для нас на неба і прынёс яе нам, каб мы слухалі і выконвалі яе? І не за морам яна, каб вы казалі: Хто б пераправіўся праз мора і прынёс яе нам, каб мы змаглі слухаць і выконваць яе? Наадварот, гэта слова вельмі блізкае да цябе: яно ў тваіх вуснах і ў тваім сэрцы, каб ты мог выконваць яго**» (Дрг 30, 11–14).

«**Бо калі язычнікі, не маючы закону, ад прыроды законнае робяць, дык, не маючы закона, яны самі сабе закон: яны паказваюць, што дзеі закону напісаны ў іх сэрцах, пра што сведчыць сумленне іхняе і думкі іхнія, якія то вінавацяць, то апраўдваюць адна адну**» (Рым 2, 14–15).

Натуральны закон, які Стварыцель запісаў у сэрца кожнага чалавека, заключаецца ва ўдзеле ў мудрасці і дабрыні Бога і выяўляе першапачатковы маральны сэнс, які дазваляе чалавеку з дапамогай розуму распазнавць дабро і зло.

Як бачым, з натуральнага закону вынікаюць як прывілеі, так і абавязкі чалавека, і гэта незалежна ад яго веры, гістарычных ці палітычных умоваў, у якіх чалавек жыве. Натуральны маральны закон усеагульны і нязменны, ён стварае падмурак асноўных абавязкаў і правоў асобы, а таксама чалавечай супольнасці і самога грамадзянскага закону.

**Чалавек адказвае Богу**

Гісторыя падае нам такі прыклад. (*падручнік вучня)*

У 1946 г. Міжнародны трыбунал у Нюрнбергу разглядаў у судзе справу гітлераўскіх злачынцаў, адказных за смерць мільёнаў людзей. Суддзі гэтага трыбунала звярнуліся да права, якое тыя парушылі. Аднак, як высветлілася, асуджаныя дзейнічалі згодна з правам гітлераўскай Германіі. Тады злачынцаў асудзілі не на падставе запісанага кодэкса, але на падставе кодэкса натуральнага закону — Божага закону. Ніхто ні тады, ні сёння не аспрэчвае гэтага прысуду, бо, калі існуе праўда, то яна адзіная незалежна ад культур і народаў.

Аўтар натуральнага закону — Бог, таму гэты закон павінен шанавацца і ўлічвацца ўсімі законамі, якія ўстанаўліваюць людзі. Закон, ўстаноўлены чалавекам, які не адпавядае натуральнаму закону, не абавязвае ў сумленні.

***Разважанне:***

Ад майго сённяшняга правільнага жыццёвага выбару залежыць наш заўтрашні дзень, бо кожны з нас, выбіраючы тыя ці іншыя вартасці, фармуе сваё асяроддзе і разам з тым увесь свет.

— Да каго я звяртаюся за парадаю ў сітуацыі выбару?

— Што я раблю, калі адчуваю ўнутраную барацьбу паміж дабром і злом?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас рахунку сумлення ў святле Дэкалогу ацані свае ўчынкі.

2. Паразважай над словамі Святога Пісання, над якімі ты працаваў на катэхезе.

***Заключаная малітва:*** *Пс 119(118), 1-8.*

## Я – ПАН БОГ ТВОЙ, НЕ МАЙ ІНШЫХ БАГОЎ, АПРОЧ МЯНЕ

***Дыдактычная мэта:*** указваем моладзі асноўную запаведзь, згодна з якой толькі Богу Жывому — Богу, які ЁСЦЬ, трэба аказваць выключную пашану.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем пачуццё пашаны і поўнага даверу да Бога.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Зых 20, 2–3; Дрг 6, 4–9; ККК 2096–2102; плакат з тэкстам І-й Божай запаведзі; карткі і алоўкі для працы ў групах, газеты і часопісы для плаката, нажніцы, ватман.

***Метады катэхезы:*** парафраза, праца ў групах.

***Ход заняткаў***

**Малітва:** *Ойча наш.*

**Чалавек пытае**

Кожны чалавек, нават той, які называе сябе атэістам, па сваёй прыродзе з’яўляецца рэлігійным. Цяжка знайсці чалавека, які б увогуле ні ў што не верыў. Прыходзіць момант, калі чалавек пачынае задаваць сабе пытанне пра сэнс жыцця, цярпення, пра сутнасць шчасця, любові, пра важнасць альбо марнасць рэчаў, якія ён набывае. Чалавек хоча быць упэўненным у заўтрашнім дні, хоча быць важным, каханым, патрэбным. Гэтыя пытанні і жаданні падштурхоўваюць чалавека да пошуку адказаў. Здараецца, што ў гэтым пошуку мэтай, крыніцай, цэнтрам становіцца матэрыяльная рэч — ідал, якому чалавек пачынае служыць, прыносячы розныя ахвяры на алтар ім жа самім створанага «бога».

*К. дае вучням заданне зрабіць з газетных выразкаў плакат, які будзе яскравым адлюстраваннем тых ідалаў і бажкоў, што стварыў сабе сучасны чалавек. Пасля выканання працы К. задае вучням пытанне:*

— Хтосьці аднойчы сказаў, што чалавек становіцца вобразам таго бога, якога ўслаўляе. Як выглядае жыццё чалавека, які служыць ідалу? (*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

**Бог адказвае**

Бог, ведаючы зменлівае сэрца чалавека, аб’яўляецца выбранаму ізраэльскаму народу як Бог адзіны:

«**Я — Пан Бог твой, Які вывеў цябе з зямлі егіпецкай, з дому няволі. Не май іншых багоў, апроч Мяне**» (Зых 20, 2–3). *(К. змяшчае на дошцы плакат з гэтым тэкстам).*

«**Слухай, Ізраэль: Пан, Бог наш, — Пан адзіны. Любі Пана Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і усёй душою тваёю, і з усіх сіл тваіх. Няхай гэтыя словы, якія сёння я наказваю табе, будуць у сэрцы тваім. Будзеш навучаць**

**ім дзяцей сваіх і гаварыць пра іх, калі будзеш дома, падчас твайго падарожжа, кладучыся спаць і ўстаючы. Прывяжаш іх, як знак, да рукі сваёй, і яны будуць табе як павязка паміж вачыма тваімі. І напішаш іх на вушаках дому свайго і на брамах сваіх**» (Дрг 6, 4–9).

— Чаго Пан Бог патрабуе ад свайго народа?

*К. дзеліць клас на 3 групы, якія атрымліваюць заданне перафразіраваць тэкст першай запаведзі, пасля прэзэнтацыі працы вучні змяшчаюць карткі з адказамі на дошцы*:

· Жыві ў сяброўстве і еднасці з Богам!

· Толькі Богу Адзінаму служы і давярай!

· Не прывязвайся да рэчаў! *(і г. д.)*

(*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

**Чалавек адказвае Богу**

Вучэнне Касцёла падказвае нам канкрэтныя спосабы праслаўлення і ўшанавання Бога. *(Вучні працуюць у тых самых групах над тэкстам ККК, называючы і запісваючы ў падручнік гэтыя спосабы).*

І група: ККК 2096–2097 (пакланенне).

ІІ група: ККК 2098–2100 (малітва і ахвяра).

ІІІ група: ККК 2101–2102 (прысяга і шлюб).

Першую Божую запаведзь можна лічыць асновай Дэкалогу. Чалавеку часта вельмі цяжка ісці шляхам запаведзяў, яму не хапае ўласных сілаў. Пан Бог кажа аб сваёй любові да чалавека, хоча вывесці яго з дому няволі, граху да жыцця ў Божай ласцы.

***Разважанне:***

Св. Аўгустын сказаў: «Калі Пан Бог на першым месцы, то ўсё астатняе на сваім месцы». Пан Бог хоча быць у маім жыцці на першым месцы.

— Якое месца я Яму прызначыў?

— Як выглядае мая малітва?

— Якімі ўчынкамі я магу славіць Бога?

— У чым выяўляецца мая пашана да Бога?

— Што сёння я магу змяніць у сваім жыцці?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняй малітвы падзякуй Пану Богу за ласку веры.

2. Напішы ліст да чалавека, які перажывае сумненні ў веры.

***Заключная малітва***

Акт веры, надзеі, любові.

Тэма № 6, X кл.

# МОЙ ДАВЕР ДА ПАНА БОГА

***Дыдактычная мэта:*** асаблівым чынам звярнуць увагу моладзі на тое, што варажба, вера ў гараскопы і астралогію, карыстанне паслугамі магіі з'яўляюцца грахамі супраць І-й Божай запаведзі. Чалавек, які прымае ўдзел у такіх практыках, не давярае Пану Богу і ў той жа час ставіць пад сумненне факт сваёй свабоды і тое, што ён сам можа вырашаць свой лёс.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваць у моладзі гатоўнасць несці адказнасць за ўласнае жыццё, а таксама здольнасць адважна прызнавацца ў сваім даверы да Пана Бога.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Мц 6, 24; Гал 5, 19–21; Дрг 18, 10–12; Ер 29, 8; 1 Кар 10, 7; Лев 20, 6; ККК 2110–2126; часопіс *Ave Maria*, № 4 (144) 2007 г.; карткі і алоўкі.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, праца з тэкстам.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Пс 22 (23).

**Чалавек пытае**

Вера, надзея і любоў умацоўваюць сувязь чалавека з Богам. Аднак, калі чалавек перастае клапаціцца аб развіцці сваёй веры, занядбоўвае малітву, у чалавека нараджаецца страх перад будучыняй і жаданне пазбыцца гэтага страху.

*Устаючы раніцай у школу, я звычайна ўключаю радыё, каб паслухаць гараскоп і даведацца, што мяне чакае ў гэты дзень. Многія мае сяброўкі таксама чытаюць гараскопы. На маю думку, у гэтым няма нічога дрэннага. Кожны чалавек хоча ведаць, што яго чакае ў будучыні.* (*падручнік вучня)*

З такой думкай сёння згаджаюцца многія людзі, якія перад тым, каб зрабіць пэўны выбар, напрыклад, выбраць навучальную ўстанову, тэрміны падарожжа ці сябра жыцця, звяртаюцца да гараскопаў, магаў, варажбы. На сённяшніх занятках мы пастараемся знайсці адказ на пытанне: ці супярэчаць такія паводзіны веры ў Бога? Ці можна такія справы назваць «прыватнымі»?

**Бог адказвае**

*К. дзеліць клас на 5 групаў, якія на падставе тэксту ККК працуюць над пытаннем*: што супярэчыць веры ў Бога? *Хтосьці з вучняў запісвае адказы на дошцы*:

I група: ККК 2110–2111 (забабоны).
II група: ККК 2112–2114 (ідалапаклонства).
III група: ККК 2115–2117 (варажба і магія).
IV група: ККК 2118–2122 (бязбожнасць).
V група: ККК 2123–2126 (атэізм).

(*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

Бог аб’явіўся Ізраэлю, свайму выбранаму народу як Бог Адзіны. Першая Божая запаведзь «Не май іншых багоў, апроч Мяне» забараняе служэнне і адданне хвалы ідалу, якога чалавек можа зрабіць важнейшым за Бога, свайго Стварыцеля і Айца.

*К. дзеліць вучняў на 2 групы. На падставе тэкстаў са Святога Пісання вучні павінны скласці кароткія сказы перасцярог ад акультных практыкаў і запісаць іх у падручнік:*

I група: «**Ніхто не можа служыць двум гаспадарам. Бо ці аднаго будзе ненавідзець, а другога любіць; ці аднаго будзе трымацца, а другім пагарджаць. Не можаце служыць Богу і мамоне**» (Мц 6, 24).

«**Ідалапаклонства, чарадзейства, варожасць, спрэчкі, зласлівасць, гнеў, сварлівасць, нязгоды (...) Кажу вам наперад, як і казаў, што тыя, хто робіць, не атрымаюць у спадчыну Валадарства Божага**» (Гал 5, 19–21).

«**Не павінен быць у цябе той, хто праводзіць сына свайго альбо дачку праз агонь, ні вяшчун, ні варажбіт, ні чарнакніжнік, ні чарадзей, ні змуснік, які заклінае духаў, ні чараўнік, які апытвае нябожчыкаў; бо агідны перад Панам кожны, хто робіць гэта, і якраз за гэтыя мярзоты Пан, Бог твой, праганяе іх ад аблічча твайго**» (Дрг 18, 10–12).

II група: «**Бо так кажа Пан Магуццяў, Бог Ізраэля: хай не зводзяць вас прарокі вашыя, якія сярод вас, і варажбіты вашыя; і не слухайце сноў вашых, якія вам сняцца**» (Ер 29, 8).

«**Не будзьце таксама ідалапаклоннікамі, як некаторыя з іх, пра якіх напісана: людзі селі есці і піць, і ўсталі бавіцца**». «**Не будзем спакушаць Хрыста, як некаторыя з іх спакушалі і загінулі ад змеяў**» (1 Кар 10, 7).

«**І калі якая душа павернецца да закліначоў мёртвых і да чарадзеяў, каб аблудна хадзіць па слядах іхніх, дык Я павярну аблічча Маё на тую душу і знішчу яе з народу яе**» (Лев 20, 6).

Усялякія забабоны з’яўляюцца там, дзе няма даверу да Пана Бога, дзе няма шчырай размовы з Ім на малітве.

**Чалавек адказвае Богу**

Ніякая магія і чары не маюць такой моцы, якую мае ў сабе Божае Слова, якое ачышчае і аздараўляе.

*К. падае вучням урывак з артыкула «Чаму мы верым у забабоны?» з часопіса* Ave Maria. *Хтосьці з вучняў чытае* (*падручнік вучня)*:

«Грэх акультызму вельмі цяжкі, і наступствы яго вельмі цяжкія, таму жартаваць тут нельга. Ведаю аднаго маладога чалавека, які захапляўся варажбой, нават спецыяльныя курсы скончыў. Меў, нібы наркаман, залежнасць ад гэтай практыкі. На шчасце, з Божай дапамогай, ужо пяць гадоў як вырваўся з яе. Гаварыў, што часам узнікае непераадольнае жаданне звярнуцца да магіі, і тады ён кленчыць перад крыжам, чытае адрачэнне і вызнае сваю веру. Без малітвы і святых сакрамэнтаў тут няма паратунку».

Захоўваючы запаведзі, пашыраючы ў сваім асяродзі хрысціянскія каштоўнасці, мы даём нашым сябрам сведчанне веры.

***Разважанне:***

Маё адважнае вызнанне веры ў Хрыста, сведчанне ўласнага жыцця — гэта вельмі важная рэч, якая фарміруе маё асяроддзе і разам з тым далучаецца да фармавання ўсяго чалавецтва.

— Як я клапачуся аб развіцці сваёй веры?

— Аб чым я прашу Бога ў малітве?

— Як я адношуся да матэрыяльных рэчаў? Ці не зрабіў я з іх сабе ідала?

— Якія мае адносіны да гараскопаў, гадання і варажбы?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Напішы, як ты ў супольнасці Касцёла паглыбляеш сваю еднасць з Хрыстом.

***Заключная малітва:*** Пане Езу, вызнаю, што Ты адзіны, сапраўдны Бог. Дзякую Табе, што Ты любіш мяне і клапоцішся аб маім жыцці. Прашу Цябе, дай мне ласку глыбокай веры і моцы, каб не ўпадаць у грэх ідалапаклонства. Які жывеш і валадарыш на векі вечныя. Амэн. (*падручнік вучня)*

Тэма № 7, Х кл.

### Дзеянне злога духа ў свеце.

**Дыдактычная мэта:**

Паказваем вучням спосабы і наступствы дзеяння д'ябла ў чалавеку і ў свеце. Паказваем, што Хрыстус сваёю смерцю перамог моц шатана.

**Выхаваўчая мэта:**

Заахвочваем вучняў да глыбейшага з'яднання з Хрыстом праз пост і малітву, да вырачэння д'ябла і ўсіх ягоных справаў. Вучым быць уважлівымі да тэндэнцыяў сучаснай моды, (музыка, вопратка) якая прапагандуе сатанізм.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне.
Карткі для кожнай групы, алоўкі.

***Метады катэхезы***: апавяданне, праца ў групах, незакончаны сказ.

### Ход заняткаў

***Малітва:*** праслаўленне Найсвяцейшай Тройцы.

## *Чалавек пытае*

Асноўнай праблемай сучаснага чалавека з'яўляецца тое, што ён не верыць у існаванне сатаны, успрымае яго як твор чыёйсьці фантазіі. Хтосьці трапна заўважыў, што найвялікшая перамога д'ябла заключаецца менавіта ў гэтым. Успрымаючы рэальную небяспеку як фантазію, чалавек не бачыць патрэбы быць асцярожным і ўважлівым у пытаннях, якія датычаць духоўнай сферы яго жыцця.

Маладыя людзі часта не звяртаюць увагі на тое, якія рэчы трымаюць у доме, што дораць адно аднаму, што носяць на шыі на ланцужнах, якія выявы маюць на бранзалетках ці пярсцёнках. З прычыны такой "няўважлівасці", празмернай бяспекі, альбо звычайнай цікавасці ў нашых дамах паяўляюцца кнігі "Чорнай і белай магіі" (якая па сутнасці сваёй нічым ад сябе не адрозніваецца, бо з'яўляецца злом. Да белай магіі адносіцца лячэнне ў

“бабак”, знахароў. Трапіць у путы злога духа можна праз кантакт з экстрасэнсамі, біоэнэргатэрапеўтамі, гіпнацізёрамі, праз усходнія медытацыі, энергіі, пакт са злым духам, талісманы, амулеты і т.п.); розныя элементы варажбы ці гадання - напр. гараскопы, карты таро; амулеты – напр. вельмі папулярны ў сённяшні дзень пярсцёнак атлантаў; а таксама акультныя сімвалы - паламаны крыж, пацыфіка, пяцівугольная зорка. Маладыя людзі, часам проста нібы жартам, звяртаюцца да гадання і варажбы, выклікаюць душы памерлых, каб даведацца пра свой заўтрашні дзень, запытацца пра будучага сужонка, пра нумар білету на эгзамене і г.д.

Адна дзяўчына распавядала такую гісторыю:
«*Я захаплялася рознымі спосабамі гадання, але не таму, што ва ўсё гэта верыла, а таму, што гэта было забаўляльна і цікава. Часам, я рабіла гэта для сябе, часам для маіх сяброваk. Аднойчы, па тэлебачанні я ўбачыла перадачу, у якой жанчына, раскладаючы карты таро, прадказвала будучыню асобам, якія да яе тэлефанавалі. Праз некалькі дзён, пры дапамозе інтэрнэту, я набыла гэтыя карты. Мне адразу ж захацелася іх* «*выпрабаваць*»*. Пасля гэтага ў кватэры, якую я здымала, пачалі адбывацца дзіўныя рэчы. Хоць я нікога не бачыла, але чула чыесьці крокі, смех, такія гукі, як бы хтосьці капаў на падлогу воскам. Пагоршыўся мой фізічны і псіхічны стан здароўя. Я стала шукаць дапамогі і прыйшла да знаёмага святара, які праз некалькі дзён прыехаў да мяне з экзарцыстам. Падчас экзарцызму Хрыстус вызваліў мяне з моцы д’ябла. Сёння я стараюся кожны дзень распачынаць і заканчваць малітвай, праз сакрамэнт споведзі і Эўхарыстыі яднаюся з Хрыстом, якому штодня бязмежна дзякую за дар свайго вызвалення*».

- Чаму вучыць нас гэтая гісторыя?

Сатана – гэта не сімвал зла ў свеце, а рэчаіснасць, якая мае мэту знішчыць чалавека. Сатана быў прысутны сярод людзей яшчэ ў раі, калі Адам і Ева, паддаючыся яго спакусам, учынілі першародны грэх. Потым яго сляды бачым на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва аж да сённяшняга дня. Але найважнейшай справай не з’яўляецца тое, што сатана існуе, але тое, што Хрыстус яго перамог.

## *Бог адказвае*

Святое Пісанне неаднойчы нам пра гэта распавядае:

*К дзеліць вучняў на 3 групы, якія працуюць над тэкстамі Святога Пісання. Кожная група павінна выпісаць на картках, што гаворыць д’ябал, калі бачыць Езуса, а затым, што Езус яму адказвае.*

Група 1:

[1]Тады Езус быў выведзены Духам у пустыню, каб д’ябал выпрабоўваў Яго.
[2]І, пасціўшы сорак дзён і сорак начэй, [Езус] нарэшце адчуў голад. [3]Тады

падышоў да Яго спакуснік і сказаў Яму: «Калі Ты Сын Божы, скажы, каб гэтыя
камяні сталі хлебам». [4]А Ён сказаў у адказ: «Напісана:
*“Не хлебам адным будзе жыць чалавек,*
*а кожным словам, што выходзіць з вуснаў Божых”*».
[5]Тады ўзяў Яго д’ябал у святы горад і паставіў на крыле святыні, [6]і сказаў
Яму: «Калі Ты Сын Божы, кінься ўніз, бо напісана:
*“Анёлам сваім загадае пра Цябе,*
*і на руках панясуць Цябе,*
*каб Ты часам не спатыкнуўся аб камень нагой сваёй”*».
[7]Езус сказаў яму: «Напісана таксама: *“Не будзеш выпрабоўваць Пана Бога*
*твайго”*».
[8]Д’ябал зноў узяў Яго на вельмі высокую гару і паказаў Яму ўсе валадарствы
свету і славу іх. [9]І сказаў Яму: «Усё гэта дам Табе, калі ўпадзеш і пакланішся
мне». [10]Тады сказаў яму Езус:
«Адыдзі, сатана, бо напісана:
*“Пану Богу твайму пакланяйся*
*і Яму аднаму служы”*».
[11]Тады д’ябал пакінуў Яго, – і вось анёлы падышлі і служылі Яму.
(Мц 4, 1-11)

**Група 2:**

“[23]І быў тады ў сінагозе чалавек, апанаваны нячыстым духам, які закрычаў:
[24]«Што Табе да нас, Езус Назаранін? Ты прыйшоў загубіць нас? Я ведаю Цябе,
хто Ты: Святы Божы». [25]Але Езус забараніў яму, кажучы: «Змоўкні і выйдзі з
яго!» [26]Тады нячысты дух, скалануўшы яго і закрычаўшы моцным голасам,
выйшаў з яго. [27]І спужаліся ўсе так, што пыталіся адзін у аднаго, кажучы: «Што
гэта? Новае вучэнне з моцаю; Ён загадвае нават нячыстым духам, і яны
слухаюцца Яго». (Мк 1, 23-27)

**Група 3:**

[2]А калі [Езус] выйшаў з чоўна, Яму адразу насустрач выйшаў чалавек з
магільных пячор, апанаваны нячыстым духам, [3]які жыў у магільных пячорах.
Ніхто не мог звязаць яго нават ланцугом, [4]бо часта яго звязвалі кайданамі і
ланцугамі, але ён разрываў ланцугі і разбіваў кайданы, і ніхто не мог яго
ўтаймаваць. [5]Увесь дзень і ўсю ноч, будучы ў магільных пячорах і ў гарах, ён
крычаў і біў самога сябе камянямі. [6]Калі ён здалёк убачыў Езуса, падбег і
пакланіўся Яму, [7]і закрычаў моцным голасам, кажучы: «Што Табе да мяне,
Езусе, Сыне Бога Найвышэйшага? Богам заклінаю Цябе, не муч мяне». [8]Бо
[Езус] сказаў яму: «Выйдзі, нячысты дух, з гэтага чалавека». [9]Тады спытаўся ў
яго [Езус]: «Як тваё імя?» Той адказаў: «Маё імя легіён, бо нас шмат». [10]І ён
моцна прасіў Яго не выганяць іх з гэтай краіны.
[11]Пасвіўся там каля гары вялікі статак свіней. [12]І прасілі Яго [нячыстыя духі],
кажучы: «Пашлі нас у свіней, каб мы ўвайшлі ў іх». [13]І Ён дазволіў ім. І,
выйшаўшы, увайшлі гэтыя нячыстыя духі ў свіней, і кінуўся статак каля дзвюх
тысяч з кручы ў мора, і патанулі яны ў моры. (Мк 5, 2-13)

*Вучні змяшчаюць карткі на табліцы, а К. задае пытанне:*

- Як Святое Пісанне прадстаўляе нам Езуса?

*Затым К. запрашае аднаго з вучняў запісаць на табліцы ўрывак з Гбр 2, 14-15*

«**Паколькі дзеці маюць удзел у целе і крыві, таму ў іх падобным чынам прыняў удзел таксама Езус, каб праз смерць нізрынуць таго, хто мае ўладу над смерцю, гэта значыць, д'ябла, каб збавіць тых, хто ўсё жыццё быў зняволены страхам перад смерцю**» (Гбр 2, 14-15).

Езус размаўляе з д'яблам як Той, Хто мае над ім уладу. Больш таго, Ён перадае гэтую ўладу сваім вучням – маладому Касцёлу«**Паклікаўшы Дванаццаць, Езус даў ім сілу і ўладу над усімі злымі духамі» (Лк 9,1а**).

Кожны святар моцаю Хрыста можа выганяць д'ябла. Экзарцызм – гэта просьба Касцёла, якую ён узносіць на моцы сваёй улады ад імя Езуса, каб асоба ці прадмет былі абароненыя ад уздзеяння злога духа і вызваленыя з-пад яго ўлады. У простай форме экзарцызм здзяйсняецца падчас абраду хросту. Урачысты экзарцызм могуць здзяйсняць толькі ўпаўнаважаныя біскупам прэзбітэры.

Прайграўшы Хрысту ў сіле, сатана прыходзіць з рознымі спакусамі да чалавека, створанага на вобраз Божы, каб яго знішчыць. Сатана быў і да сённяшняга дня прысутны ў свеце, змяняюцца толькі прылады яго дзеяння і спосабы барацьбы з Богам. Такімі «прыладамі» з'яўляюцца гараскопы, варажба, гаданне, амулеты, бо, карыстаючыся імі, чалавек паказвае, што не давярае Богу, што Ён не з'яўляецца ў яго жыцці Богам Адзіным. Непрабачэнне, якое нараджае ў сэрцы нянавісць, затоены на споведзі грэх – гэта тыя «дзверы» праз якія сатана ўваходзіць у жыццё чалавека, беручы ва ўладу яго эмацыянальную, інтэлектуальную і фізічную сферу. Часам з розных прычын людзі самі адыходзяць ад Бога, пачынаюць славіць сатану як свайго бога. Яны называюць сябе сатаністамі. Гэта адна з найбольш небяспечных сект, якая, на жаль, дзейнічае таксама і на тэрыторыі нашай краіны.

Часта на дыскатэках можна пачуць музыку, якую прапагандуюць сатаністы — «heavy metal», «hard rock», «black & death metal». Сатаністычныя сімвалы і тэксты выкарыстоўваюць такія групы як: Black Sabath, Judas Priest, AC/DC, Slayer, Ozzy Osbourne, Rammstein. Тэксты іх спеваў перапаўняе агрэсія, яны заклікаюць да помсты, нянавісці, распусты, смерці, самазабойства. Падчас сваіх выступленняў яны выкарыстоўваюць такія сатаністычныя эмблемы і сімвалы як: пентаграма, лічбы 666, галава казы, перавернуты крыж, далонь у выглядзе рагоў. А потым гэтыя сімвалы разам з гэтымі групамі трапляюць як аздабленне на вопратку, якая лічыцца вельмі моднай сярод моладзі. Часам, не свядома, мы самі становімся распаўсюджвальнікамі гэтага страшнага сатанінскага культу.

## Чалавек адказвае Богу

Падчас аднаўлення абяцанняў хросту мы выказваем жададанне аднавіць сваю сувязь з Хрыстом і Касцёлам, вызнаём сваю веру, а таксама выракаемся сатаны і ўсіх яго спраў.

*К. дае вучням заданне, скончыць наступныя сказы:*

***Я веру ў Хрыста - гэта значыць, што*** …………………………

***Я выракаюся сатаны і ўсіх яго спраў – гэта значыць, што …….***

Калі давяраеш Езусу, то разам з Ім можаш супрацьстаяць спакусам сатаны. Праз малітву да Святой Тройцы, праз ружанцовую малітву да Марыіі, да св. Арханёла Міхала ты аддаеш сябе пад Божую апеку. Акрамя малітвы трэба памятаць пра пост, а таксама жыць у радасці і надзеі, стараючыся даваць іншым людзям добрае сведчанне хрысціянскага жыцця.

**Разважанне:**

— Што я магу зрабіць, каб яшчэ больш умацаваць сваю сувязь з Хрыстом?

—Чым для мяне з’яўляюцца гараскопы, магія, варажба, амулеты?

— Як выглядае мая малітва?

— Калі астатні раз я прыступаў да сакрамэнту пакаяння і Эўхарыстыі?

— Што я магу зрабіць для умацавання сваёй парафіяльнай супольнасці?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Прачытай і паразважай над словамі Святога Пісання Мк 1, 23-27, Гбр 2, 14-15.

***Заключная малітва:*** да Арханёла Міхала

Тэма № 8, X кл.

**СЕКТА ЗНІШЧАЕ ЧАЛАВЕКА.**

***Дыдактычная мэта:*** растлумачваем, што прыналежнасць да секты з'яўляецца здрадай Хрысту. Звычайна гэта вядзе да знішчэння асобы і пазбаўлення яе асабістага шчасця.
***Выхаваўчая мэта*:** папярэджваем моладзь, што трэба быць асцярожнымі ў кантактах з людзьмі, якія запрашаюць на "хрысціянскія" сустрэчы па-за касцёлам і парафіяй.
***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**
Святое Пісанне: Мк 13, 5-6, 22-23; Гал 1,6-8; невялікая рамка, зацягнутая чорнай тканінай, папяровая клякса чырвонага колеру з надпісам **"Увага: СЕКТЫ**", люстэрка.
***Метады катэхэзы:*** аповед, аналіз тэксту.

***Ход заняткаў***

***Малітва:***

Пане Езу, Ты даў пачатак Касцёлу, каб ён быў знакам еднасці і супакою. Але людзі сапсавалі гэтую еднасць, жывучы ў сварках і нязгодзе паміж сабою, таму некаторыя адыходзяць ад Касцёла. Мы прагнем штораз лепш пазнаваць нашую каталіцкую веру, каб самім з'яўляцца ў свеце знакам веры, надзеі і любові для ўсіх людзей. Адары нас, Пане, Тваёю ласкай, каб мы маглі зразумець таксама і тых, якія па розных прычынах адышлі ад Хрыста. Амэн.

***Чалавек пытае***

Сярод мноства спакус, якія сатана падсоўвае чалавеку, нечакана можа з'явіцца спакуса абыякавасці і незадаваленнасці ўсім, што датычыць рэлігійнага жыцця. Сцены "свайго касцёла" становяцца за-цеснымі, гаміліі святара – надакучлівымі. Нараджаецца цікавасць да іншых рэлігій, узнікае жаданне мець новых сяброў, якія "ўсё разумеюць", якія дапамогуць сярод шэрай штодзённасці адшукаць сляды Божай прысутнасці.

*«Мой малодшы брат, Павел, быў звычайным маладым чалавекам. Ён вучыўся ў тэхнікуме, вучоба давалася яму лёгка. Брат не любіў выходзіць на вуліцу — чытаў дома розныя кнігі і часопісы, а потым са мной і маці дыскутаваў на розныя тэмы.*

*Калі надышоў час экзаменаў, Павел зрабіўся нейкім закрытым, чужым. Мы ведалі, што ён мае новых дзіўнаватых сяброў, але яго маўклівасць тлумачылі стомаю ад вучобы. Аднак паводзіны Паўла хутка пачалі мяняцца.*

*Брат стаў часта і невядома куды выходзіць з дому, яго адзнакі ў тэхнікуме знізіліся, з пакою былі чутныя дзіўныя гукі індыйскай музыкі, ён папрасіў маці не гатаваць яму больш мяса. Спачатку маці не згаджалася, але Павел увесь час адмаўляўся ад мясной ежы, тады яна пачала гатаваць для яго*

*асобна, супакойваючы сябе, што так нават будзе лепш для ягонага здароўя. Неўзабаве надыйшоў момант, калі Павел адмовіўся хадзіць у касцёл, растлумачваючы нам, што вера — гэта прыватная справа кожнага чалавека. Маці вельмі моцна перажывала, але што яна магла зрабіць?*

*Экзаменаў у тэхнікуме Павел не здаў. Аднойчы ён проста сабраў свае рэчы і сышоў, пакінуўшы нам толькі ліст, дзе пісаў, каб мы не хваляваліся за яго, бо ён знайшоў сэнс жыцця, мае добрых сяброў, з якімі цяпер будзе разам жыць... Ніякага адраса, ніякага тэлефона не пакінуў...*

*Аднойчы, вяртаючыся ад сяброўкі, я сустрэла групу людзей, апранутых у ружовае адзенне і паголеных нагала, якія танцавалі на вуліцы. Сярод іх я з цяжкасцю пазнала Паўла. Калі ён убачыў мяне, то хацеў збегчы, але я хутка падышла да яго, каб паразмаўляць. Размовы не атрымалася, Павел адказваў на пытанні аўтаматычна. Потым іх гуру загадаў Паўлу адысці ад мяне, так мы і разышліся.*

*На наступны дзень я прыйшла разам з маці на гэтае самае месца, але сярод танцораў, вызнаўцаў Крышны, Паўла не было. Калі мы запыталі кагосьці з іх пра Паўла, атрымалі адказ, што такога хлопца яны ўвогуле не ведаюць.*

*Цяпер мы працягваем шукаць Паўла і не губляем надзеі, што калі-небудзь яго знойдзем. Але ці захоча ён вярнуцца да нармальнага жыцця?»*
(*падручнік вучня)*

— Якія секты вы ведаеце?
— Ці сустракаліся вы з прадстаўнікамі сектаў?
— Як выглядала гэта сустрэча?
— Ці ёсць сярод вашых знаёмых тыя, хто трапіў у секту?

**Пан Бог адказвае**

На падставе апавядання выпісваем характэрныя рысы секты:

— гэта невялікая група людзей, дзе ўсе паміж сабой добра знаёмыя.
— лідэр групы добра ведае яе ўдзельнікаў.
— абавязковая безумоўная паслухмяннасць лідэру
— паступовае зняволенне ўдзельніка.
— частка ўдзельнікаў мае праблемы з псіхікай.
— удзельнік разрывае стасункі са сваімі блізкімі роднымі.
— ўдзельнік падаеццца моцнаму знешняму ўплыву праз слуханне адпаведнай музыкі, рытуалы і г.д.
— моцная псіхічная атака, пасля якой цяжка і марудна праходзіць працэс рэабілітацыі.

(*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

Падчас сустрэчы прадстаўнікі сектаў часта кажуць, што іх навука абапіраецца на Святым Пісанні. На самой справе гэта няпраўда, мэта якой —аслабіць увагу тых, каго хочуць прыцягнуць у секту. Перад ілжэнавукай і дзейнасцю фальшывых прарокаў перасцярагаў Езус сваіх вучняў. Св. Павел у лісце да Галатаў таксама робіць заўвагу тым, хто нетрывалы ў веры і падаецца ўздзеянню ілжэвучэння.

*Адзін з вучняў чытае фрагменты са Святога Пісання:*

**«Езус пачаў казаць ім: "Глядзіце, каб ніхто не звёў вас. Многія прыйдуць пад імем Маім, кажучы, што гэта Я, і многіх звядуць. Бо паўстануць фальшывыя месіі і фальшывыя прарокі і будуць чыніць знакі і цуды, каб звесці ў зман, калі ўдасца, выбраных. А вы сцеражыцеся. Я прадказаў вам ўсё »** (Мк 13, 5-6, 22-23)

«**Здзіўляюся, што ад таго, хто паклікаў вас ласкаю Хрыста, вы так хутка адыходзіце да іншага Евангелля. Яно, аднак, не іншае, а толькі ёсць людзі, якія зводзяць вас і хочуць сказіць Евангелле Хрыста**» (Гал 1,6-8)

— Чым жа так небяспечныя секты і ілжэпрарокі?

- Аб чым Езус перасцярагаў Сваіх вучняў?

***Чалавек адказвае Пану Богу***

*К. разам з вучнямі робяць плакат:* **"Увага: СЕКТЫ"** *На загадзя падрыхтаванай чорнай тканіне змяшчаем чырвоную пляму і кладзём на яе люстэрка. Плакат вешаем так, каб вучні бачылі свае адлюстраванні.*

Так заўсёды адбываеццана самым пачатку. Кожны, хто прыходзіць у секту, сустракаецца з добразычлівай атмасферай, не бачыць ніякай небяспекі, але бачыць сябе шчаслівым, знаходзіць новых сяброў, адчувае сябе вельмі "блізка" Бога. Па-за гэтым няма больш нічога важнага: ні бацькоў, ні навукі, ні працы, ні сяброў. Толькі праз некаторы час, калі лідэр групы дамагаецца большых ахвяраў, чалавек пачынае разумець, што занадта далёка зайшоў. Але нават калі б і хацеў адыйсці, то не мае ўнутраных сілаў, каб зрабіць гэта. Часам, ён не мае нават куды ісці, бо ўсе кантакты з роднымі і блізкімі разарваныя. Штосьці жахлівае робіцца з сэрцам і розумам чалавека.

*К. бярэ люстэрка і разбівае яго аб падлогу.*

Няхай зараз кожны з вас возьме па разбітым кавалку люстэрка. У гэтым маленькім кавалачку мы можам часткова ўбачыць сваой твар. А цяпер наклеім гэтыя кавалкі на чырвоную пляму.

Люстэрка ўжо нельга склеіць. У яго кавалках мы бачым цяпер мноства сваіх адлюстраванняў пад рознымі вугламі. Так жа адбываецца і з чалавекам, уцягнутым у секту – ён губляе свой сапраўдны твар, адыходзіць ад Пана Бога, становіцца зняволенным праз памылковую навуку, губляе сапраўдных сяброў, страчвае кантакт з роднымі. Секта выцягвае чалавека з супольнасці, грамадства, каб мець яго толькі для сябе. Касцёл робіць зусім інакш: рыхтуе чалавека ў сваёй супольнасці, каб потым ён ішоў і даваў сведчанне веры ў іншых супольнасцях – у сям'і, у школе, на працы, сярод сяброў. Таму кожны з нас павінен быць асцярожным ў кантактах з людзьмі, якія запрашаюць на так званыя "хрысціянскія" сустрэчы па-за касцёлам і парафіяй.

***Разважанне:***

Найлепшая зброя супраць уплыву і знішчальнага дзеяння сект — гэта ўмацаванне асабістай сувязі з Хрыстом праз малітву, сакрамэнты пакаяння і Эўхарыстыі, а такама паглыбленне ўласных рэлігійных ведаў.

— Што я раблю, каб паглыбіць і ўмацаваць сваю веру?
— Якія артыкулы я апошні раз чытаў у рэлігійным часопісе?
— Каго са сваіх сяброў я запрашу на наступную парафіяльную сустрэчу моладзі?
— У якіх момантах мне не хапае сілы, каб быць верным Богу? Што сёння я магу зрабіць, каб гэта выправіць?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняй малітвы паразважай над словамі Святога Пісання, над якімі працаваў падчас катэхэзы, а таксамапамаліся аб ласцы навяртання для тых, хто знаходзіцца ў секце.
2. Напішы ў сшытку, якія каталіцкія часопісы і газеты ты ведаеш. Прысвяці некалькі хвілін на прачытанне новага артыкула.

***Заключная малітва:***

Ойча, Ты даў нам Езуса Хрыста, нашага Збаўцу і Пана, які ёсць нашай дарогай і праўдай і жыццём. Умацуй нас у праўдзе Твайго Уцелаўлённага Слова. Амэн.

Тэма № 9, X кл.

## УШАНОЎВАЕМ БОЖАЕ ІМЯ

***Дыдактычная мэта:*** указваем моладзі на тое, што ўшаноўваць Божае імя — гэта значыць заклікаць Бога з пашанай, захоўваць абяцанні, дадзенныя Богу і людзям, пазбягаць вульгарнасці.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у вучняў пашану да Божага імя, культуру слова, якая робіць чалавека здольным шанаваць вобраз Бога ў ім самім і ў іншым чалавеку.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Як 3, 9–12; Зых 3, 13–15; Зых 20, 7; ККК 2143–2147, 2150–2152; Ян Павел II. — Жэшаў, 2 чэрвеня 1991 г.; каляровыя палоскі і алоўкі для кожнага вучня, клей.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту.

### *Ход заняткаў*

***Малітва***: *Ойча наш.*

***Чалавек пытае***

Кожны з нас мае імя. Часта бацькі даюць сваім дзецям імёны славутых акцёраў, спевакоў, паэтаў, а таксама імёны знакамітых людзей з гісторыі мінулых часоў. Імёны некаторых людзей мы будзем памятаць заўсёды, напр., імёны нашых бацькоў. Ёсць у нашым жыцці людзі, вельмі дарагія нашаму сэрцу, якіх мы любім, за якіх молімся, пра якіх клапоцімся.

(*К. раздае вучням каляровыя палоскі і алоўкі. На гэтых палосках вучні запісваюць імёны тых людзей, якія па розных прычынах з'яўляюцца для іх важнымі. Пасля К. разам з вучнямі склейвае гэтыя палоскі ў адзін доўгі ланцужок. Жадаючыя могуць расказаць, чаму гэтыя імёны з'яўляюцца для іх важнымі*).

За кожным іменем, запісаным у гэтым ланцужку, стаіць канкрэтны чалавек, які мае ў сабе вялікую вартасць. Своім клопатам, любоўю і пашанаю мы стараемся паказаць, як шмат яны для нас значаць.

Бог таксама аб'явіў нам сваё імя. І калі мы так клапоцімся пра пашану да ўласнага імя і да імёнаў нашых родных і блізкіх, то не можам забывацца пра пашану да Божага імя. *(Запіс тэмы).*

**Бог адказвае**

Майсей пытае Бога пра Яго імя, калі з палаючага куста Бог абвяшчае Майсею яго місію для Ізраэля, выбранага Богам народа. *(Хтосьці з вучняў чытае ўрывак з Кнігі Зыходу 3, 13–15).*

*К. змяшчае на дошцы надпіс*: **Я ЁСЦЬ, ЯКІ ЁСЦЬ**.

— Што азначае імя Божае?

Бог незалежны ад смяротнага і знішчальнага свету, таму чалавек да канца ніколі не зможа зразумець свайго Створцу. Чалавек сам ніколі не мог бы пазнаць сапраўднае Божае імя. Але Бог блізкі да чалавека, хоча яму дапамагчы, хоча, каб чалавек ведаў праўду пра свайго Стварыцеля, бо гэтая праўда неабходная яму для збаўлення.

Божае імя святое. Пан Бог хоча, каб людзі шанавалі Яго імя. Сваю волю Ён выказвае ў II-й запаведзі.

*К. піша на дошцы альбо вешае плакат з тэкстам II-й запаведзі:*
***НЕ ЎЖЫВАЙ ІМЯ ПАНА БОГА ТВАЙГО ДАРЭМНА.***

*Праца ў групах:* Карыстаючыся тэкстамі ККК, вучні шукаюць адказ на пытанні:

I і II групы: У чым выяўляецца пашана да Божага імя?
III і IV групы: Што значыць ужываць Божае імя «дарэмна»?

I група: «„Імя Пана святое“. Таму чалавек не можа злоўжываць Ім. Ён павінен памятаць пра Божае імя ў цішыні адарацыі, напоўненай любоўю. Павінен выкарыстоўваць яго толькі для таго, каб яго благаслаўляць, праслаўляць, усхваляць і пакланяцца яму» (пар. ККК 2143).

II група: «Пашана да Божага імя выяўляе тое, што належыць да таямніцы самога Бога і ўсёй сакральнай рэчаіснасці, пра якую гаворыць гэтае імя. Пачуццё святасці падкрэслівае цноту рэлігійнасці» (пар.ККК 2144).

«Веруючы павінен сведчыць пра імя Пана, адважна вызнаючы сваю веру (...)» (пар.ККК 2145).

III група: «Абяцанні, дадзеныя ў імя Божае, становяцца справаю гонару, вернасці, праўдзівасці і аўтарытэту Бога. Яны павінны выконвацца ў духу

справядлівасці. Не выконваць іх — значыць злоўжываць імем Бога» (пар. ККК 2147).

IV група: «Клятвапарушальнікам з'яўляецца той, хто пад прысягаю дае абяцанне, якое не мае намеру стрымаць, або той, хто даўшы абяцанне, не захоўвае слова. Клятвапарушэнне — сур'ёзная непавага да Пана ўсялякага слова. Даванне клятвы пад прысягаю для здзяйснення дрэннай справы — супярэчыць святасці Божага імя» (ККК 2152).

*Прэзентацыя працы вучняў.* (*Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік)*

Другая запаведзь наказвае шаванаць Божае імя, а таксама асобаў, рэчы і месцы, якія прысвечаны Богу: крыж, святыню, алтар, месцы пахавання памерлых, фігуры і абразы святых. Гэты наказ нагадвае нам, што мы, як хрысціяне, маем абавязак выконваць дадзеныя намі абяцанні. Складзеная і споўненая прысяга — гэта акт праслаўлення Божага імя, бо такім чынам чалавек прызнае Божае існаванне, веліч, магутнасць і вернасць.

Кожны дзень мы маем магчымасць аддаваць хвалу Богу з дапамогаю хрысціянскага прывітання.

**Чалавек адказвае Богу**

Навучаючы праўдам Дэкалогу, Ян Павел II казаў так (*падручнік вучня)*

«Хрысціянамі называемся ўсе мы, хто ахрышчаныя і вераць ў Хрыста. Ужо ў самой гэтай назве ёсць заклік Імя Пана. У II-ой Божай запаведзі гаворыцца: «Не ўжывай імя Пана Бога твайго дарэмна». Таму калі ты з'яўляешся хрысціянінам, хай гэта не будзе дарэмным заклікам імені Пана. Будзь сапраўдным хрысціянінам не толькі з назвы, не будзь хрысціянінам абыякавым (...)». (Жэшаў, 2 чэрвеня 1991 г.)

Ланцуг людскіх імёнаў, які мы зрабілі, — гэта своеасаблівы сімвал дарогі чалавека да Бога. Гэтая дарога заўсёды вядзе нас праз шматлікія сустрэчы з рознымі людзьмі: ад адных мы вучымся, бяром з іх прыклад, стараемся быць падобнымі да іх, сярод іншых даём сведчанне жыцця ўласным словам і ўчынкам. Таму мы не можам адначасова называць сябе хрысціянамі і паводзіць сябе вульгарна, прыніжаючы годнасць іншых людзей. Вульгарныя словы і такія паводзіны аказваюць знішчальны ўплыў на чалавека, робячы яго няздольным да любові, спачування і сяброўства.

***Разважанне:***

Пан Бог хоча, каб я шанаваў Яго імя.

— У якіях сітуацыях я заклікаю Божае імя?

— Як я вітаюся часцей за ўсё? Ці ўжываю я хрысціянскае прывітанне?

— Як я раблю знак святога крыжа?

— Якія словы я ўжываю ў размове з іншымі людзьмі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняй малітвы на падставе ўрыўка з Біблії (Як 3, 9–12) паразважай над тым, як ты выкарыстоўваеш дар мовы.

2. Адкажы пісьмова на пытанне: «Аб чым ты молішся ў малітве *Ойча наш,* калі ты прамаўляеш словы: „Свяціся імя Тваё“»?

***Заключная малітва:*** Пс 100 (99), 1-4.

Тэма № 10, X кл.

## ПАМЯТАЙ ДЗЕНЬ СВЯТЫ СВЯТКАВАЦЬ

***Дыдактычная мэта:*** вучым, што нядзеля — гэта дзень Панскі, а таксама дзень адпачынку, дзень радаснай сустрэчы з уваскрослым Хрыстом, які запрашае нас на Эўхарыстычную гасціну.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у моладзі імкненне радасна і адказна святкаваць святы дзень — супольна ўдзельнічаць у святой Імшы і адпачынку.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Зых 20, 8–11; ККК 2175, 2177; апостальскі ліст Яна Паўла II *Dies Domini.*

***Метады катэхезы:*** аналіз тэксту.

### *Ход заняткаў*

***Малітва***: *Ойча наш.*

**Чалавек пытае**

Кожная рэлігія на працягу года мае святочныя дні, падчас якіх людзі аддаюць Богу хвалу і адпачываюць самі. Нядзеля — гэта святы дзень для ўсіх хрысціянаў, у якім мы святкуем дзень уваскрасеня Хрыста. Для кожнага хрысціяніна нядзеля — гэта дзень малітвы ў супольнасці веруючых (у Касцёле) і ў коле сям’і, дзень адпачынку ад працы, а таксама дзень радасці ад сустрэчы з Богам, роднымі і сябрамі. Нядзельны ўдзел у Эўхарыстыі — гэта не толькі важны абавязак, але і асаблівая прывілея ахрышчаных. Гэта таксама час адпачынку і асабістага развіцця, асабліва духоўнага.

На жаль, не ўсе людзі, якія лічаць сябе хрысціянамі, прымаюць рэгулярны

ўдзел у нядзельнай св. Імшы.

(*падручнік вучня)*:

«Мае бацькі лічаць сябе веруючымі. Тата бывае ў касцёле на Пастэрцы і на Рэзурэкцыі, і яшчэ тады, калі ў нашай сям'і бывае хрост, шлюб або пахаванне. Маці часам ходзіць у касцёл разам са мною, але гэта бывае рэдка.

Аднойчы я прапанавала сваім бацькам хадзіць усёй сям'ёй на нядзельную святую Імшу. Тата мне адказаў, што ніхто з нас не павінен так часта хадзіць у касцёл. Мама ў сваю чаргу сказала, што яна і так святкуе нядзелю, бо не выконвае ў доме цяжкай працы і не прымушае нас яе выконваць. Нічога ў маёй сям'і не змянілася пасля нашай размовы. У касцёл я, як і раней, хаджу адна і ўвесь час малюся за сваіх, „нібы веруючых“, бацькоў».

*К. размаўляе з вучнямі наконт таго, як выглядае сітуацыя святкавання нядзелі ў іх сем'ях.*

Нядзеля — гэта святы дзень для ўсіх хрысціянаў. Мы можам заўважыць, што кожная рэлігія на працягу года мае святочныя дні, падчас якіх людзі аддаюць Богу хвалу і адпачываюць самі.

— Якія дні называюцца святымі і як мы павінны адзначаць іх у нашых сем'ях?

**Бог адказвае**

Наказ святкавання святога дня, дадзены Панам Богам свайму народу, мы знаходзім у Кнізе Зыходу:

«**Памятай пра дзень шабату, каб свяціць яго. Шэсць дзён будзеш працаваць і рабіць усе працы свае, а сёмы дзень, шабат, — для Пана Бога твайго; не рабі ніякай працы ні ты, ні сын твой, ні дачка твая, ні твой нявольнік, ні твая нявольніца, ні жывёла твая, ні чужынец, які знаходзіцца ў брамах тваіх. Бо за шэсць дзён учыніў Пан неба і зямлю, і мора, і ўсё, што ў іх, і на сёмы дзень адпачываў. Таму благаславіў Пан дзень шабату і асвяціў яго**» (Зых 20, 8–11).

— Як называецца дзень, які Бог наказвае святкаваць?
— Якім чынам трэба было шанаваць гэты дзень?
— Чаму чалавек павінен быў святкаваць шабат?

Габрэі святкавалі шабат як памяць пра сёмы дзень Бога пасля стварэння свету. У Праве вельмі сурова гаварылася пра шабат: нельга было запальваць агню, гатаваць страву. З мэтай асвячэння гэтага дня складаліся ахвяры, у сінагогах супольна маліліся і чыталі Святое Пісанне.

Для хрысціянаў святым днём стала нядзеля — дзень уваскрасення Езуса Хрыста. Гэты дзень мы называем яшчэ днём Пана. Святкаванне нядзелі стала

адрозніваць хрысціянаў ад габрэяў. Хрысціяне ў гэты дзень збіраліся на ламанне хлеба і малітву.

— Чаму мы, хрысціяне, святкуем нядзелю, а не шабат — суботу?

*Хтосьці з вучняў чытае тэкст ККК 2175, затым 2177:*

«Культ, які абапіраўся на Законе, рыхтаваў таямніцу Хрыста, а тое, што ў ім здзяйснялася, у пэўным сэнсе было праваобразам, які адносіўся да Хрыста. Той, хто жыў паводле старога Закону, перайшоў да новай надзеі і не захоўвае ўжо шабату, але святкуе дзень Пана, у які наша жыццё было благаслаўлена Хрыстом і Яго смерцю (пар. ККК 2175)

Акрамя нядзелі хрысціяне святкуюць і іншыя дні. Ёсць абавязковыя святы, калі кожны каталік павінен удзельнічаць у святой Імшы. Падкрэсліце іх, калі ласка, у сваіх тэкстах (*падручнік вучня:*.

«Нядзельная цэлебрацыя дня Пана і Эўхарыстыі стаіць у самым цэнтры жыцця Касцёла. „Нядзеля, калі па апостальскай традыцыі цэлебруецца Пасхальная таямніца, павінна адзначацца ва ўсім Касцёле як самы галоўны з прадпісаных святаў“. „Такім чынам павінны святкавацца дні Нараджэння Пана нашага Езуса Хрыста, Аб’яўлення Пана, Унебаўшэсця і Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста; Святой Багародзіцы Марыі, Яе Беззаганнага Зачацця і Унебаўзяцця, св. Юзафа, святых Апосталаў Пятра і Паўла, Усіх Святых“» (пар.ККК 2177).

**Чалавек адказвае Богу**

Слухаючы фрагмент апостальскага ліста Яна Паўла II *Dies Domini*, адкажыце на пытанні:

*«Нядзельны адпачынак дазваляе ўстанавіць адпаведныя прапорцыі паміж штодзённымі клопатамі і турботамі: матэрыяльныя рэчы, пра якія так клапоцімся, саступаюць месца духоўным каштоўнасцям; асобы, з якімі жывем, адкрываюць сваё сапраўднае аблічча, калі мы з імі сустракаемся і вядзём спакойную размову. Нядзеля як дзень, калі чалавек захоўвае мір з Богам, з самім сабой і з бліжнімі, становіцца часам, калі людзі могуць па-новаму паглядзець на цуды прыроды, дазваляючы захапіць сябе гэтай цудоўнай і таямнічай гармоніяй. (...) Калі пасля шасці дзён працы — у многіх выпадках яны фактычна скарочаны да пяці, — чалавек шукае час, каб адпачыць і прысвяціць больш увагі іншым аспектам свайго жыцця, то гэта вынікае з аўтэнтычнай патрэбы, цалкам згоднай з бачаннем евангельскага паслання. Веруючы чалавек павінен задаволіць гэтую патрэбу ў лучнасці з індывідуальнымі і супольнымі формамі перажывання веры, якая выяўляецца ў цэлебрацыі і святкаванні дня Пана. Таму натуральна, што хрысціяне будуць імкнуцца ў канкрэтных*

*абставінах нашай эпохі да таго, каб грамадскае заканадаўства брала пад увагу іх абавязак святкавання нядзелі. У любым выпадку, яны абавязаны сумленнем арганізоўваць свой нядзельны адпачынак так, каб маглі прымаць удзел у Эўхарыстыі, пазбягаючы працы і ўчынкаў, несумяшчальных са святкаваннем дня Пана, які павінен прыносіць радасць і дазваляе мець неабходны адпачынак для душы і цела»* ( *Dies Domini, 67).*

— Як кожны хрысціянін павінен святкаваць нядзелю?
— Каму і навошта патрэбны святы дзень?

Для кожнага хрысціяніна нядзеля — гэта дзень малітвы ў супольнасці веруючых (у Касцёле) і ў коле сям'і, дзень адпачынку ад працы, а таксама дзень радасці ад сустрэчы з Богам, роднымі і сябрамі. Нядзельны ўдзел у Эўхарыстыі — гэта не толькі важны абавязак, але і асаблівая прывілея ахрышчаных. Гэта таксама час адпачынку і асабістага развіцця, асабліва духоўнага.

*Выразаючы з газетаў і часопісаў малюнкі і загалоўкі, вучні робяць плакат: «Святкаваць дзень святы». Можна дамаляваць лініі і сімвалы, але не дапісваць словы. Прэзентацыя працы вучняў.*

***Разважанне:***

У нядзелю Езус запрашае мяне на сустрэчу з Ім, а таксама на адпачынак у коле сваіх блізкіх. Кожная святая Імша — гэта магчымасць сустрэчы з Хрыстом у Эўхарыстыі, якому я магу ахвяраваць свой смутак і радасць, сваю працу і малітву і зачэрпнуць ад Яго сілы для жыцця, згоднага з духам Евангелля.

— Як я дзякую Богу за дар сустрэчы з Ім падчас святой Імшы?
— Як я святкую святы дзень?
— Што мне трэба змяніць у сваім жыцці, каб нядзеля стала для мяне і маёй сям'і днём малітвы і адпачынку?
— Як я паводжу сябе ў касцёле падчас святой Імшы?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Знайсці ў календары і запісаць даты, калі адзначаюцца абавязковыя святы, згодна ККК 2177.

***Заключная малітва:***

Хачу быць з Табою, Пане, у дзень, які з'яўляецца Тваім, каб верна слухаць Тваё спрадвечнае слова. Хачу быць з Табою, каб мае думкі, змучаныя штодзённымі турботамі, адпачывалі сярод спеву і малітваў. Там мае крокі атрымаюць новыя сілы, а сэрца напоўніцца радасцю. (*падручнік вучня)*

Тэма № 11, X кл.

## Я Ў КАСЦЁЛЕ

***Дыдактычная мэта:*** пазнаёміць моладзь з праўдаю веры, што Хрыстус заснаваў свой Касцёл для таго, каб нас асвячаць. Па Яго волі, дзякуючы сакрамэнтальнаму служэнню Касцёла, мы можам дасягнуць збаўлення.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваць у моладзі пачуццё адказнасці за Хрыстовы Касцёл.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Мц 18, 20; Лк 10, 16; Мц 25, 40; 1 Кар 12, 12–21. 26–27; Канстытуцыя *Sacrosanctum Concilium* (гл.1 п.7); Свечкі для кожнага вучня; аркуш паперы, выразаны ў форме чалавека; каляровыя карткі і алоўкі для кожнага вучня; магнітафон.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах.

### *Ход заняткаў*

***Малітва.***

*К. раздае кожнаму вучню свечку (сам трымае запаленую):*

Я трымаю запаленую свечку, святло якой сімвалізуе Хрыста — Святло свету, якое асвячае нам дарогу да нябеснага Айца. Чалавека таксама можна параўнаць са свечкаю, бо, калі ён мае ў сабе агонь Хрыста, то згарае для Яго, даючы вакол сябе святло добрага прыкладу і цяпло ахвярнай любові. (*К. просіць вучняў запаліць свае свечкі ад яго):* Падыдзіце вельмі блізка адзін да аднаго, так, каб было адно вялікае полымя. Кожны дае крыху ад сябе, паўстае супольнасць — вялікі агонь любові, здольны агарнуць нават увесь свет і ўсіх людзей. Праз сакрамэнт хросту мы таксама сталі ўдзельнікамі адной вялікай супольнасці, якую заснаваў Хрыстус, — супольнасці Касцёла, містычнага Цела Хрыста.

Спеў: Хоць нас і многа, мы адно цела ў Хрысце.

*Пасля спеву вучні сядаюць у кола, а свае свечкі ставяць у цэнтр.*

Тэма нашага сённяшняга занятка: Я ў Касцёле.

**Чалавек пытае**

Касцёл жыве, дзейнічае і развіваецца праз кожнага хрысціяніна, які ў еднасці з Хрыстом на сваім месцы працы, вучобы ці ў сям'і дае сведчанне сваёй веры. «Вы — святло свету», «соль зямлі», «закваска на цеста» — гэта азначае, што кожны хрысціянін пакліканы не толькі для ўласнага збаўлення, але і для таго, каб разам з Хрыстом працаваць над збаўленнем усіх людзей.

Аднак не ўсе ахрышчаныя бачаць сябе ў Касцёле. Прачытайце, што кажа вашая равесніца, вучаніца сярэдняй школы (*падручнік вучня):*

«*Хрысціянства — гэта асабістая сустрэча з Богам. Я не разумею, навошта камусьці патрэбны Касцёл. Напэўна, толькі святарам. Я не веру ў тое, што Езус наказвае мне хадзіць у касцёл, дзе я павінна слухаць спевы бабуляў і бачыць там сваіх аднакласнікаў, якія не моляцца, а ўвесь час азіраюцца, каб потым пра ўсіх пляткарыць. Я не магу зразумець гэтага. Лепш быць сам-насам з Богам, каб ніхто не перашкаджаў...* ».

— Каго аўтарка ліста заўважае ў касцёле?

— Як яна адносіцца да малітвы людзей, якіх бачыць у касцёле?

— Якія могуць быць прычыны таго, што яна хоча маліцца без супольнасці?

**Бог адказвае**

Касцёл складаецца з двух рэчаіснасцяў — Божай і людской. Аўтарка ліста заўважыла толькі людскую рэчаіснасць, слабую, грэшную. Зараз мы паспрабуем убачыць іншую рэчаіснасць — Божую. Як прысутнасць Езуса Хрыста рэалізуецца ў Касцёле — супольнасці, да якой я належу?

*Праца ў групах: адна група атрымлівае цытаты, якія павінна знайсці ў Св. Пісанні, другая — Канстытуцыю* ***Sacrosanctum Concilium*** *(гл.1 п.7). На аснове тэкстаў вучні павінны вызначыць спосабы прысутнасці Хрыста ў Касцёле і запісаць іх у сваіх падручніках:*

«**Бо, дзе двое ці трое сабраліся ў імя Маё, там Я ёсць сярод іх**» (Мц 18, 20).

«**Хто слухае вас, Мяне слухае, і хто вас адкідае, Мяне адкідае. А хто адкідае Мяне, адкідае таго, хто паслаў Мяне**» (Лк 10, 16).

«**Валадар скажа ім у адказ: Сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі**» (Мц 25, 40).

Дакументы II Ватыканскага Сабору. Канстытуцыя *Sacrosanctum Concilium* (гл.1 п.7):

«Для здзяйснення такой вялікай справы Хрыстус заўжды прысутнічае ў сваім Касцёле, асабліва ў літургічных дзеяннях. Ён прысутнічае ў ахвяры св. Імшы і ў асобе цэлебранта, „бо той, хто калісьці ахвяраваў сябе на крыжы, цяпер ахвяруе сябе праз служэнне святароў“, асабліва ў эўхарыстычных постацях. Сваёй сілай Ён так прысутнічае ў сакрамэнтах, што калі нехта ўдзяляе хрост, то хрысціць сам Хрыстус. Ён прысутнічае ў сваім слове, бо калі ў Касцёле чытаюць Святое Пісанне, гаворыць Ён сам. Нарэшце, прысутнічае тады, калі Касцёл моліцца і спявае псальмы...» (*Sacrosanctum Concilium,* 7).

*( у літургіі, у Эўхарыстыі, у асобе святара, у сакрамэнтах, у Слове, у супольнай малітве, у церпячых і патрабуючых)*

Касцёл не стаіць паміж Езусам і намі, ён ёсць Езусам, цела якога складаецца з нас. Дзякуючы гэтай еднасці, мы можам вярнуць сабе Божае жыццё — пазбавіцца сваёй «марнасці», набыць неабходныя для нас ласкі і імкнуцца да святасці.

**Чалавек адказвае Богу**

*К. вешае на дошцы вялікі аркуш паперы з контурамі чалавека, раздае вучням каляровыя карткі, на якіх кожны павінен напісаць сваё імя. Затым кожны падыходзіць да дошкі і наклейвае сваю картку ўнутры намаляванай постаці. Калі заданне будзе выканана, К. чытае ўрывак са Святога Пісання (1 Кар 12, 12–21. 26–27).*

— Хто з’яўляецца галавою Касцёла?

— З чым параўноўваецца Касцёл у фрагменце, які вы пачулі?

— Да каго адносяцца словы, якія мы толькі што пачулі?

— Што будзе з арганізмам, калі кожная частка цела «захоча жыць самастойна»?

*К. просіць, каб вучні зноў падышлі да дошкі і паспрабавалі адарваць картку са сваім іменем.*

Кожны грэх хрысціяніна памяншае святасць Касцёла, бо калі адна частка цела пачынае хварэць, то ад гэтага церпіць увесь арганізм, усё цела. Калі хто-небудзь з вас бачыць зло, якое ёсць у супольнасці Касцёла, ён не павінен адыходзіць абражаным. Трэба задумацца, як гэтае зло направіць спачатку ў сабе, а потым у іншых. Інакш у Касцёле, як на Целе Хрыстовым, з'яўляюцца раны.

***Разважанне:***

*Каля пастаўленых вучнямі свечак, К. кладзе картку са словамі Бэнэдыкта XVI і прапануе некалькі хвілін паразважаць над гэтымі словамі:*

«Касцёл не трэба будаваць, трэба ім жыць».

— Для мяне Касцёл — гэта «яны» ці «мы»?

— На якім месцы ў Касцёле я бачу сябе?

— Як мой грэх закранае іншых людзей?

— Я каталік «па метрыцы хросту» ці гэта мая жыццёвая пазіцыя?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Складзі ўласнымі словамі малітву за Касцёл і пастарайся маліцца ёю штодня.
2. Напішы ліст тым, хто кажа: "Хрыстус – так! Касцёл – не!"

***Заключная малітва:*** (*падручнік вучня)*

Тэма № 12, X кл.

## ШАНУЙ БАЦЬКУ СВАЙГО І МАЦІ СВАЮ

***Дыдактычная мэта:*** нагадваем, што чацвёртая Божая запаведзь вучыць пашане да бацькоў і выхавальнікаў.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у моладзі любоў і пашану да сваіх бацькоў і выхавальнікаў.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Сір 3, 1; Ян Павел II. – Кельцы, 3 VI 1991; Карткі і маркеры для кожнай групы.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, словы-ключы.

## Ход заняткаў

***Малітва:*** *Ойча наш.*

**Чалавек пытае**

*К. запрашае вучняў рагледзець малюнкі і фотаздымкі з адлюстраваннем розных сітуацый сямейнага жыцця, а потым дапоўніць напісаныя на дошцы сказы:*

Сям'я, на маю думку, гэта...

Хрысціянская сям'я, на маю думку, гэта...

*К. запісвае адказы вучняў на дошцы, падкрэсліваючы неабходнасць прысутнасці ў жыцці хрысціянскай сям'і веры, сакрамэнтаў, жыцця паводле Божых запаведзяў.*

Калі ласка, узгадайце, як гучыць Божая запаведзь, у якой гаворыцца пра нашае заданне адносна сваіх бацькоў? (*Вучні адказваюць, К. запісвае на дошцы IV-ю Божую запаведзь:* **Шануй бацьку свайго і маці сваю**).

**Бог адказвае**

Захаванне гэтай запаведзі мае вельмі важнае значэнне ў фармаванні хрысціянскага разумення Бога, таму што Бог для аб'яўлення сваёй таямніцы выкарыстаў паняцце Айца. Чалавек, які па той ці іншай прычыне не любіць і не шануе свайго зямнога бацькі, не здолее заўважыць любові, якою яго адорвае Бог. Канфлікт з бацькамі заўсёды накладае адбітак на малітву, на веру, а часта нават вядзе да поўнага разрыву з Богам.

Аднак гэтая Божая запаведзь не толькі дзецям нагадвае пра іх абавязкі, яна скіраваная таксама і да бацькоў.

*К. дзеліць клас на 2 групы, кожнай дае тэксты. I-я група павінна выпісаць на картках, якія абавязкі маюць дзеці ў адносінах да сваіх бацькоў. II-я група выпісвае, якія абавязкі маюць бацькі ў адносінах да сваіх дзяцей.. Затым гэтыя ключавыя словы вучні павінны скласці ў адпаведную геаметрычную фігуру ці форму, можна дамалёўваць лініі.*

«**Дзеці, слухайцеся ў Пану сваіх бацькоў, бо гэта справядліва. „Шануй бацьку твайго і маці“ — гэта першая запаведзь у абяцанні, каб добра было табе і каб доўга жыў ты на зямлі. І вы, бацькі, не раздражняйце дзяцей вашых, але выхоўвайце іх праз навучанне і настаўленне Пана**» (Эф 6, 1–4).

«Словы IV-й запаведзі скіраваныя да дзяцей, да сыноў і дачок: „Шануй бацьку свайго і маці“. Гэтак жа яны маюць дачыненне і да бацькоў: „Памятай, каб сапраўды заслугоўваў гэтай пашаны“. Будзь годным называцца бацькам! Будзь годная называцца маці! (...)

Каб дзеці маглі шанаваць сваіх бацькоў, іх трэба прыняць як дар ад Бога. Так, кожнае дзіця — гэта дар ад Бога. Часам гэты дар цяжка прыняць, але гэты дар заўсёды вельмі каштоўны. (...)

У выхаванні дзіцяці важна не толькі для яго ахвяравацца, важна рабіць гэта мудра, так, каб выхаваць дзіця ў сапраўднай любові. Выхаваць у сапраўднай любові — гэта таксама і патрабаваць, але толькі з любоўю. Можна патрабаваць, толькі адначасова патрабуючы ад самога сябе». (Ян Павел II. – Кельцы, 3 VI 1991) (*падручнік вучня)*

*Прэзэнтацыя працы вучняў.* (*Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік)*

Кожны з нас з'яўляецца дзіцём. Кожны з нас мае бацькоў — жывых, памерлых, любячых, абыякавых. Той, хто нягледзячы ні на што атуляе павагаю сваіх бацькоў, адорваючы іх сапраўднаю любоўю, лёгка адкрые, кім ёсць Бог і як трэба адносіцца да Яго. Магчыма, не кожны з нашых бацькоў рэалізуе Божы ідэал добрай маці і добрага бацькі, але яны далі нам жыццё, яны нас выхавалі. Яны жылі ў іншы час — у час руйнавання святыняў, у час людзей, глухіх да Божага слова, у час бязлітаснага атэізму, калі людзі не маглі так як вы цяпер, вучыцца праўдам веры, малітве. Таму мы павінны прабачыць ім, калі штосьці ў іх паводзінах і словах крыўдзіць нас, калі яны нас не разумеюць.

Магчыма, хтосьці саромеецца сваіх бацькоў з-за іх простага паходжання, неадукаванасці або з-за тых ці іншых слабасцяў. Пашана да бацькоў, кім бы яны не з'яўляліся, была, ёсць і будзе паказчыкам велічы чалавека. Ад гэтай запаведзі мы ніколі не можам быць вызваленыя. Нават калі нашыя бацькі адыдуць з гэтага свету, наш клопат і пашана ўвасобяцца ў малітвах за іх, у клопаце пра іх магілы і ва ўшанаванні гадавіны іх смерці.

Катэхізіс гаворыць нам пра іншых людзей, якім мы таксама павінны быць удзячныя. (*Хтосьці з вучняў чытае, пар.*):

«Асаблівую ўдзячнасць хрысціян заслугоўваюць тыя, ад каго яны атрымалі дар веры, ласку Хросту і жыццё ў Касцёле. Гэта могуць быць бацькі або іншыя члены сям'і, бабуля і дзядуля, пастыры, катэхэты, іншыя настаўнікі або сябры...»

**Чалавек адазвае Богу….**

У IV-й запаведзі Бог наказвае нам шанаваць сваіх бацькоў, настаўнікаў і выхавальнікаў.

***Разважанне:***

— Як я выконваю гэтую Божую запаведзь?

— Як я адношуся да сваіх бацькоў, калі заўважаю іх недахопы?

— Як часта я малюся за сваіх бацькоў і выхавацеляў?

— Як часта я дзякую ім за усё тое, што яны для мяне робяць?

***Пастанова.***

*К. скіроўвае вучняў да паставы прабачэння бацькам і выхавальнікам за іх недахопы і слабасці.*

***Хатняе заданне:***

1. Штодня падчас вячэрняй малітвы маліся за сваіх бацькоў.
2. Так, як можаш, выкажы сваю падзяку бацькам за дар жыцця, за іх клопат і любоў.
3. Напішы, як ты ўяўляеш свае адносіны з бацькамі, калі сам будзеш дарослым і незалежным ад іх чалавекам.

***Заключная малітва***

*Пане Божа, Ты даў нам запаведзь,*
*каб мы шанавалі бацьку і маці.*
*Усім сэрцам я люблю сваіх бацькоў.*
*Ведаю, як я ім абавязаны, і таму прашу Цябе:*
*май іх у Тваёй апецы, адары іх здароўем*
*і вядзі іх па жыцці дарогаю Тваіх запаведзяў.*
*Дай ім шчаслівую старасць, а калі прыйдзе час,*
*прымі іх у сваё Валадарства.*
*Амэн.*

Тэма № 13, X кл.

## ЖЫЦЦЁ — БОЖЫ ДАР.

***Дыдактычная мэта:*** указваем моладзі на тое, што V-я Божая запаведзь стаіць на варце чалавечага жыцця. Грахом супраць гэтай запаведзі з'яўляюцца: забойства, аборт, ужыванне кантрацэптыўных сродкаў, эўтаназія, самазабойства, непатрэбная рызыка жыццём, залежнасці, якія шкодзяць здароўю.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у моладзі любоў да жыцця як да самага каштоўнага Божага дару.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Зых 20, 13; ККК 2268–2270, 2275–2281; Ян Павел II. *Evangelium vitae*, 52, 77.

***Метады катэхезы:*** пустое крэсла, праца ў групах, аналіз тэксту.

***Ход заняткаў***

**Малітва:** *спеў*

**Чалавек пытае**

*К. распачынае размову з вучнямі з пытання:*

— Якую каштоўнасць мае жыццё чалавека?

Якую каштоўнасць мае жыццё чалавека? Часам гэта толькі цана адной дозы наркотыкаў ці адной бутэлькі алкаголю. Здараецца і так, што гэтая цана — жыццё маці, ахвяраванае, каб выратаваць дзіця, што прыходзіць у свет.

*К. выкарыстоўвае метад пустога крэсла. У чатырох месцах класа раскладваюцца карткі з рознымі адказамі на пытанне пра вартасць чалавечага жыцця.*

Прачытайце гэтыя карткі і станьце каля той, з думкай якой вы згаджаецеся. Той, хто не згаджаецца з напісанымі поглядамі і мае сваю думку, становіцца каля пустой карткі.

Аня: «Я думаю, што жыццё чалавека мае вялікую каштоўнасць, таму што Бог — Даўца жыцця, а чалавек створаны на Яго вобраз і падабенства. Паколькі Бог дае жыццё, то толькі Ён можа вырашаць, калі яно спыніцца».

Ігар: «Я вельмі цаню жыццё, якое маю, але думаю, што кожны мае права рабіць са сваім жыццём тое, што хоча. Калі чалавек не хоча далей жыць — ці таму, што мае невылечную хваробу, ці па іншай прычыне, то гэта яго асабістае права і тут ніхто не павінен забіраць у яго гэтае права».

Таня: «Я думаю, што з кожнага правіла ёсць выключэнне. Пан Бог гаворыць: „Не забівай“, але асабіста я не змагла б нарадзіць дзіця, калі б гэта пагражала майму жыццю. Думаю, што таксама і дзяўчына, якая стала ахвярай

гвалту, мае права зрабіць аборт».

Я МАЮ ІНШУЮ ДУМКУ

*Вучні збіраюцца ў групы і дыскутуюць над думкай, запісанай на картцы, шукаючы аргументаў. Праз 10 хвілін групы выбіраюць сваіх прадстаўнікоў, якія выходзяць на сярэдзіну класа са сваімі крэсламі, групы размяшчаюцца за сваімі прадстаўнікамі. У цэнтр ставіцца пустое крэсла і падаецца інфармацыя, што зараз толькі прадстаўнікі груп і тыя, хто сядае ў пустое крэсла, могуць выказваць свае аргументы. З кожнай групы праз адну хвіліну можа выходзіць адна асоба, сядаць у пустое крэсла і прадстаўляць свой погляд, выкарыстоўваючы аргументы прадстаўніка сваёй групы. Пасля гэты чалавек зноў вяртаецца ў сваю групу, а пустое крэсла займае іншая асоба, якая хоча прадставіць сваю думку.*

*На заканчэнне гэтага этапу катэхэзы К. змяшчае на дошцы плакат з тэкстам пятай Божай запаведзі і падсумоўвае выказванні вучняў.*

**Бог адказвае**

*К. дзеліць клас на 4 групы і раздае ім тэксты ККК, у якіх вучні шукаюць адказ на пытанне::*

I група: ККК 2268–2269
- Што гаворыцца ў Катэхізісе Каталіцкага Касцёла пра грэх забойства?

II група: ККК 2270–2275
- Што гаворыцца ў Катэхізісе Каталіцкага Касцёла пра грэх аборта?

III група: ККК 2276–2279

- Што гаворыцца ў Катэхізісе Каталіцкага Касцёла пра грэх эўтаназіі?

IV група: ККК 2280–2281
- Што гаворыцца ў Катэхізісе Каталіцкага Касцёла пра грэх самазабойства?

*Прэзентацыя працы вучняў*

Пра тое, што жыццё чалавека — гэта найвялікшая вартасць, піша Ян Павел II у энцыкліцы, якую назваў «Евангелле жыцця (*падручнік вучня):*

«Божай запаведзі ніколі нельга аддзяляць ад Божай любові: яна заўсёды ёсць дарам, які павінен служыць развіццю чалавека і яго радасці. (…) Таксама Евангелле жыцця — гэта вялікі дар Бога і разам з тым адказнае заданне для чалавека. Яно выклікае захапленне і ўдзячнасць вольнай асобы і дамагаецца ад яе, каб прыняла яго, захоўвала і цаніла з жывым пачуццём адказнасці: даючы чалавеку жыццё, Бог жадае, каб чалавек гэтае жыццё любіў, шанаваў і развіваў.

Такім чынам, дар становіцца запаведдзю, а сама запаведзь — дарам» (*Evangelium vitae*, 52).

«Мы пакліканы, каб любіць і шанаваць жыццё кожнага чалавека і цярпліва і смела імкнуцца да таго, каб у нашу эпоху, у якой становіцца ўсё больш прыкметаў смерці, урэшце запанавала новая культура жыцця, плён культуры праўды і любові» (*Evangelium vitae,* 77).

**Чалавек адказвае Богу**

*Вучні, працуючы ў тых самых групах, павінны напісаць як мага больш аргументаў у абарону жыцця — для таго, хто стаіць на парозе...*

I група: забойства.

II група: аборту.

III група: эўтаназіі.

IV група: самазабойства

5 група: ужыванне алкаголю і наркотыкаў

*Прэзентацыя працы.* (*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

***Разважанне:***

«Не забівай» — гэта заклік да асцярожнасці, да чуласці, да клопату пра іншых і пра сябе. Не крыўдзі іншых і сябе — гэта надзвычай просты прынцып, які гарантуе чалавеку спакой і належнае ўнутранае развіццё.

— Як часта я дзякую Пану Богу за дар свайго жыцця?

— Як я берагу і развіваю гэты дар?

— Як я адношуся да ўжывання алкаголю і курэння?

— Што я раблю для таго, каб не трапіць у залежнасць ад гэтых рэчаў?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Зрабіць з газетных выразкаў невялікі плакат на тэму абароны зачатага жыцця.

**Заключная малітва:** Пс 8, 2а.4-5.

Тэма № 14, X кл.

# *In vitro. Лячэнне бясплоднасці ці схаваная форма аборту?*

***Дыдактычная мэта:*** распавядаем вучням пра тое, чым з'яўляюцца штучныя метады запладнення. Знаёмім вучняў з пазіцыяй Касцёла адносна пытання in vitro.
***Выхаваўчая мэта:*** вучым шанаваць жыццё чалавека, якое з'яўляецца Божым дарам.
***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Быц 21, 1-7.
Камунікат Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, ад 28.06.2010 г. па праблеме in vitro
***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту, сонейка.

***Ход заняткаў***

***Малітва:***

**Чалавек пытае**

На экранах беларускага тэлебачання можна было ўбачыць такую рэкламу. Гучыць спеў «Ave Maria» кампазітара Качыні, на экране — вобраз Марыі, якая трымае на руках Дзіцятка Езус. Далей падаюцца тэлефоны і адрасы. Рэкламадаўцам, які выкарыстаў гэтыя вобразы, быў медычны цэнтр, у якім адбываецца працэдура штучнага апладнення — «in vitro».

— Што ты ведаеш пра метад «in vitro»?
— Як ён адбываецца?

Сёння многія сужэнскія пары маюць праблему з зачаццем дзіцяці. Пад выглядам дапамогі сужэнцам прапануецца метад «in vitro», які прымаецца і падтрымліваецца ўрадамі многіх дзяржаў, у тым ліку і нашай краіны. Многія католікі на пытанне, што яны думаюць пра штучнае апладненне «in vitro», адказваюць, што яны не бачаць у гэтым нічога дрэннага, бо тыя, хто натуральным чынам не могуць мець дзяцей, атрымліваюць іх дзякуючы гэтаму метаду. На жаль, такі падыход вынікае з-за няведання маральных прынцыпаў Касцёла, а таксама з-за адсутнасці праўдзівых ведаў аб тым, чым сапраўды з'яўляецца метад «in vitro».

**Бог адказвае**

Кожнае жыццё паходзіць ад Бога, і толькі Ён з'яўляецца яго Валадаром. Толькі Ён як Стварыцель вырашае аб узнікненні і заканчэнні чалавечага жыцця.

На старонках Святога Пісання мы неаднойчы пра гэта чытаем:

**«І Пан наведаў Сару, як Ён сказаў, і выканаў для Сары тое, што абяцаў. І зачала яна, і нарадзіла Абрагаму сына ў старасці ягонай, у час прадказаны яму Богам. І назваў Абрагам сына свайго, якога Сара нарадзіла яму, імем Ісаак. І зрабіў абразанне Абрагам Ісааку, сыну свайму, калі меў ён восем дзён, як загадаў яму Бог. Калі Абрагаму было сто гадоў, нарадзіўся ў яго Ісаак, сын ягоны. І сказала Сара: Прычыну для смеху зрабіў з мяне Бог, бо кожны, хто пачуе, будзе смяяцца з мяне. І сказала: Хто сказаў бы Абрагаму, што Сара будзе карміць дзяцей грудзьмі? Бо нарадзіла я сына ў яго старасці» (Быц 21, 1-7).**

— Якую жыццёвую драму перажывалі Абрагам з Сараю?

— Што яны рабілі, апынуўшыся ў такой сітуацыі?

— Кім у гэтай гісторыі аб'яўляе сябе Бог?

Дзіця для сужэнцаў з'яўляецца дарам ад Бога Стварыцеля, а не рэччу, якая любым коштам у іх павіна быць. Божую волю трэба прыняць, нават, калі не хочаш з гэтым пагадзіцца. Пан Бог заклікае нас шанаваць жыццё кожнага чалавека, беручы пад увагу таксама момант і спосаб яго зачацця.

Паводле вучэння Каталіцкага Касцёла штучнае апладненне «in vitro» з'яўляецца маральна недапушчальным і заганным. Гэтай праблеме быў прысвечаны Камунікат Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, ад 28.06.2010 г., у якім чытаем:

*«Што такое метад «in vitro» (ЭКА)? Гэта метад падтрымання плоднасці, які заключаецца ў апладненні па-за арганізмам жанчыны. Гэтае апладненне здзяйсняецца лабараторным чынам. Можна запытацца, што ў гэтым дрэннага? «In vitro» (ЭКА), названае метадам лячэння бясплоднасці, з'яўляецца памылковай і фальшывай назвай, якая ўводзіць простага чалавека ў зман. У метадзе «in vitro» (ЭКА) не шукаюцца прычыны бясплоднасці, каб яе вылячыць. Акрамя таго метад «in vitro» (ЭКА) не можа быць прыняты як маральна добры, бо ў гэтым працэсе дзіця разумеецца не як дар Пана Бога, але як эфект заказу. А вучэнне Касцёла кажа, што плоднасць цесна звязана з інтымным збліжэннем дваіх людзей — мужчыны і жанчыны, адкрытых на Божую волю. І нарэшце, апладненне «in vitro» (ЭКА) з'яўляецца схаванай формай аборту і селекцыяй дзяцей, якія з пункту гледжання лекараў не маюць будучыні.*

*Для гэтага бярэцца некалькі зародкаў, з якіх выбіраюцца толькі некаторыя. Астатнія адкідаюцца, г.зн. забіваюцца.*

*Такім чынам, з гэтага вельмі выразна бачна, што бацькі, якія згаджаюцца на «in vitro» (ЭКА), прагнучы патомства, адначасова згаджаюцца на забойства тых, якія не пройдуць селекцыю. На такія аргументы Каталіцкі Касцёл станоўча кажа «не» апладненню «in vitro» (ЭКА). Яно з'яўляецца маральна недапушчальным, і кожны, хто нейкім чынам удзельнічае ў гэтым, здзяйсняе цяжкі грэх».*

*К. дае вучням заданне, яшчэ раз прачытаць гэты тэкст і падкрэсліць адказы на пытанні. Кожны адказ вучі павінны падкрэсліць іншым колерам.*

— Чым з'яўляецца метад «in vitro»?

— Як разумеецца дзіця у працэсе штучнага апладнення?

—Чым у метадзе «in vitro» з'яўляецца селекцыя зародкаў?

— Які адказ дае Касцёл на пытанне аб «in vitro»?

*Вучні прэзентуюць сваю працу.*

## Чалавек адказвае Богу

*К. дзеліць клас на некалькі груп. Вучні атрымоўваюць карткі на якіх пішуць, што б яны параілі сужэнствам, якія не могуць мець дзяцей. Карткі вучні складаюць метадам «сонейка». К. чытае вучням заканчэнне ліста, які напісалі біскупы па праблеме in vitro, даючы парады тым, хто не можа мець дзяцей.*

*«Ці ж ёсць нейкае іншае выйсце? Што Касцёл можа прапанаваць сужэнствам, якія хочуць мець дзяцей, але не могуць з прычыны бясплоднасці? Канешне, ёсць іншыя вырашэнні, адрозныя ад метаду in vitro (ЭКА), якія Касцёл прызнае маральна добрымі. Да іх належыць, напрыклад, напратэхналогія.*

*Напратэхналогія — гэта лячэнне бясплоднасці, цалкам згоднае з вучэннем Каталіцкага Касцёла. Прынцыповым тут з'яўляецца распазнаванне і лячэнне парушэнняў пракрэацыі без выкарыстання штучных метадаў. Гэты метад дасягае поспехаў, ушаноўваючы годнасць і сужэнцаў, і лекараў, а яе эфектыўнасць перавышае метад «in vitro» (ЭКА). Як падкрэсліў папа Бэнэдыкт XVI, "ніякія дасягненні тэхнікі не заменяць акту ўзаемнай любові дваіх сужэнцаў".*

*А што з сужэнствамі, для якіх напратэхналогія аказваецца безвыніковым метадам лячэння? Можа, адносна вас Пан Бог мае спецыяльны план. На свеце ёсць мільёны дзяцей, якіх пакінулі іх біялагічныя бацькі, дзеці, якія прагнуць*

*сямейнага цяпла. Можа, менавіта ўсынаўленне ёсць адказам на гарачае жаданне мець дзяцей. Такое бацькоўства будзе высакародным крокам у бок тых безабаронных і патрабуючых нашай любові і адначасова спосабам рэалізацыі бацькоўства і мацярынства».*

— Што Касцёл прапануе сужэнствам, якія не могуць мець дзяцей?

***Разважанне:***

— Якую вартасць для мяне маё жыццё іншага чалавека?
— Чым для мяне з'яўляюцца метады штучнага апладнення?
— Які момант я лічу пачаткам жыцця чалавека?
— Як часта я дзякую Богу за дар жыцця? За сваіх бацькоў?
— Як я выражаю сваю любоў да бацькоў?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняй малітвы памаліся аб патрэбных ласках для сужэнстваў, якія знаходзяцца ў роспачы з-за таго, што не могуць мець дзяцей.
2. Магчыма, у тваім асяроддзі таксама ёсць асобы, якія не ведаюць аб тым, чым з'яўляюцца метады штучнага апладнення. Падзяліся з імі ведамі, якія атрымаў на катэхезе.

***Заключная малітва*** падручнік вучня

Тэма № 15, X кл.

## МАЕ АДНОСІНЫ ДА МАТЭРЫЯЛЬНЫХ ДАБРОТАЎ

***Дыдактычная мэта:*** нагадваць, што сёмая Божая запаведзь паказвае адпаведнае месца, якое павінны займаць у жыцці матэрыяльныя даброты. Яны служаць для ажыццяўлення вышэйшых мэтаў у жыцці чалавека.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваць у моладзі правільнае стаўленне да матэрыяльных даброт.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Зых 20, 15; Мц 6, 19–21; Лк 16, 14; Лк 12, 16–21; для кожнага вучня: тэкст ККК 2409, картка А4.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Праслаўленне Найсвяцейшай Тройцы.

**Чалавек пытае**

Кожны з нас мае асабістыя рэчы, якія належыць толькі нам. Мы таксама карыстаемся агульнымі рэчамі. Якія гэта рэчы? *(Адказы вучняў).* Не ўсе людзі аднолькава адносяцца да рэчаў: хтосьці мае пэўную ўнутраную свабоду ў адносінах да іх, можа падзяліцца, даць пакарыстацца іншаму, падарыць. Як яшчэ чалавек можа адносіцца да рэчаў? *(Адказы вучняў).* Бачачы адносіны чалавека да матэрыяльных дабротаў, мы можам меркаваць пра тое, якое месца ў сваім жыцці гэты чалавек ім прызначыў. Усе гэтыя прыклады мы можам штодня назіраць у сваім жыцці. Ваша равесніца так піша пра гэта (*падручнік вучня)*

:

«Людзі вакол мяне захопленыя непераадольным жаданнем мець як мага больш. Кожны думае толькі пра тое, каб як мага больш для сябе ўзяць. Куды знікла бескарыслівасць? Я лічу, што матэрыяльныя рэчы — гэта вялікая спакуса, якая прымушае нас апускацца ніжэй за чалавечую годнасць. Для мяне ўсе гэтыя рэчы — зло, што крадзе час і сілы, якія мой тата і мая маці губляюць на тое, каб зарабіць грошы для іх набыцця. А мне не патрэбныя рэчы, я хачу, каб мы часцей былі разам…»

— Чым матэрыяльныя рэчы з’яўляюцца для аўтаркі ліста?

— Ці сапраўды рэчы — гэта зло і спакуса?

На сённяшніх занятках мы будзем шукаць адказ на пытанне: Як правільна выкарыстоўваць матэрыяльныя даброты, і якое месца яны павінны займаць у нашым жыцці.

**Бог адказвае**

На Сінаі Бог даў людзям VII-ю запаведзь, якую Езус дапоўніў падчас казання на гары:

«**Не крадзі**!» (Зых 20, 15).

«**Не збірайце сабе скарбаў на зямлі, дзе моль і ржа нішчаць і дзе злодзеі ўзломліваюць і крадуць. Збірайце сабе скарбы ў небе, дзе ні моль, ні ржа не знішчаюць і дзе злодзеі не ўзломліваюць і не крадуць. Бо дзе скарб твой, там будзе і сэрца тваё**» (Мц 6, 19–21).

— Якія скарбы заахвочвае нас збіраць Езус?

Матэрыяльныя рэчы не з’яўляюцца злом. Дзякуючы ім умовы нашага жыцця паляпшаюцца. Праблема ў тым, як мы гэтыя рэчы выкарыстоўваем. Ці яны будуць нам служыць, ці мы ім? Калі чалавек паставіць іх на першае месца, то яны перастануць быць сродкамі для існавання ці сродкамі дапамогі іншым людзям. Грошы і рэчы стануць мэтай самі для сябе: мець — як мага больш.

Пан Езус вучыць нас, якімі павінны быць нашыя адносіны да матэрыяльных дабротаў.

*Праца ў групах:*

I група:

«**Ніякі слуга не можа служыць двум гаспадарам, бо ці аднаго будзе ненавідзець, а другога любіць, ці аднаго будзе моцна трымацца, а другім пагарджаць. Не можаце служыць Богу і мамоне**» (Лк 16, 14).

— Каму належыць першае месца ў жыцці чалавека?

— Што можа быць «мамонай» для сучаснага чалавека?

II група:

«**У аднаго багатага чалавека добра ўрадзіла поле. І ён разважаў сам-насам: "Што мне рабіць? Няма куды мне сабраць ураджай мой". І сказаў: "Вось што зраблю: паламаю засекі мае і збудую большыя, і збяру туды ўсё збожжа маё і ўсё дабро маё. І скажу душы маёй: Душа, шмат дабра ў цябе ляжыць на многія гады. Адпачывай, еш, пі і весяліся". Але Бог сказаў яму: "Неразумны! Гэтай жа ноччу забяруць душу тваю ў цябе. Каму ж дастанецца тое, што ты нарыхтаваў? Так бывае з тым, хто збірае скарбы сабе, а не перад Богам багацее**» (Лк 12, 16–21).

— Перад чым перасцерагае нас Езус?

Праз мудрае выкарыстанне матэрыяльных дабротаў хрысціянін выказвае Богу хвалу і падзяку за ўсё, што ад Яго атрымлівае. Матэрыяльныя даброты павінны служыць чалавеку для ажыццяўлення вышэйшых мэтаў. Набыццё ўласнасці не можа адбывацца за кошт крыўды, несправядлівасці, крадзяжу маёмасці іншага чалавека. Пра гэта кажа вучэнне Касцёла.

*У тэксце ККК вучні падкрэсліваюць, якія яшчэ дзеянні супярэчаць VII-й запаведзі:*

*«Любы спосаб браць і незаконна ўтрымліваць у сябе тое, што належыць іншаму, нават калі гэта не з'яўляецца парушэннем грамадзянскага права, супярэчыць сёмай запаведзі. Да парушэнняў такога роду адносяцца наступныя дзеянні: свядома не аддаваць пазычаныя ці згубленыя рэчы, падманваць у гандлі; плаціць зусім нізкую заработную плату; павышаць цэны, спекулюючы на няведанні або няшчасцях іншых»* (пар. ККК 2409)

*Прэзентацыя працы вучняў*

Чалавек, які парушыў VII-ю запаведзь, абавязаны направіць учыненную крыўду, нават тады, калі яна не была выкрытая.

**Чалавек адказвае Богу**

Абавязкам кожнага з нас з'яўляецца пашана прыватнай і супольнай уласнасці, а таксама фармаванне ў сабе правільных адносінаў да матэрыяльных

рэчаў, жаданне дзяліцца імі з тымі, хто знаходзіцца ў патрэбе.

*К. раздае кожнаму вучню ліст А4 і кажа скласці яго напалову, затым яшчэ раз напалову. Атрымаецца 4 квадраты. У першым вучні пішуць «маё»: запісваюць рэчы, якія належаць толькі ім. У другім квадраце — «тваё»: запісваюць рэчы, якія з'яўляюцца прыватнасцю іншага чалавека. У трэцім квадраце — «нашае»: запісваюць рэчы агульнай маёмасці. У чацвёртым — «што я хачу мець».*

*Калі ўсе вучні скончаць працу, К. задае пытанні, адказы на якія кожны вучань запісвае ў адпаведны квадрат. К. папярэджвае, што гэтыя карткі ніхто не ўбачыць, акрамя іх саміх:*

***Разважанне:***

— Як я адношуся да рэчаў, якія маю?

— Якім чынам я іх набываю?

— Як я карыстаюся пазычанымі рэчамі?

— У якім стане я вяртаю іх гаспадару?

— Як я выкарыстоўваю агульныя рэчы?

— Якім чынам я хачу набыць гэтыя рэчы?

— Наколькі яны неабходныя мне?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас рахунку сумлення адкажы на пытанне, як ты выконваеш VII-ю Божую запаведзь?
2. Напішы, чаму хрысціянін не можа абыякава адносіцца да крадзяжу.

***Заключная малітва*** (*падручнік вучня)*

Тэма № 16, Х кл.

## "НЕ ЧУЖАЛОЎ" – ЗАКЛІК ДА ЗАХАВАННЯ ЧЫСТАСЦІ.

***Дыдактычная мэта:*** указваем на вартасць захавання чыстасці да шлюбу з мэтаю ахвяравання сужэнцу паўнаты любові. Чыстасць да шлюбу дае большую гарантыю таго, што вернасць сужэнцаў будзе захавана да канца жыцця. Тлумачым, што сям'я з'яўляецца фундаментам чалавечага шчасця і будучыні свету.

***Выхаваўчая мэта:*** заахвочваем моладзь свядома і адказна падрыхтоўвацца да жыцця ў сужэнстве і да сямейнага жыцця.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: 1 Кар 6, 9–10; 1 Кар 3, 16–17; 1 Тэс 4, 3–4. Магнітафонны запіс пазначанага тэксту.

***Метады катэхезы:*** трыбунал.

### *Ход заняткаў*

***Малітва:*** *Пс 139, 1–8.13–16*

Сёння казаць ці пісаць пра чыстасць да сужэнства — гэта асудзіць сябе на высмейванне. Сэксуальная сфера чалавечага жыцця перастала быць табу. Сёння хваля сэксу захоплівае чалавека на кожным кроку: у часопісах, фільмах, песнях, па радыё і тэлебачанні, у інтэрнэце. Гаворачы пра сэксуальнасць чалавека, звычайна маюць на ўвазе толькі яго цела, нават не беручы пад увагу шкоду, якую можна гэтым прынесці духоўнаму жыццю чалавека. На сённяшніх занятках мы пазнаёмімся з паставай Касцёла ў адносінах да пытання сексуальнасці і дашлюбнай чыстасці. Мы будзем мець магчымасць пачуць дзве супрацьлеглыя думкі, прысутнічаючы на судзе, дзе з боку абвінавачвання выступаюць прадстаўнікі погляду сексуальнай свабоды, якія не згаджаюцца з шостай Божай запаведдзю.

*К. запрашае раней падрыхтаваных вучняў заняць свае месцы ў класе, дзе пастаўленыя крэслы і сталы нагадваюць судовую залу. На сталах павінны быць карткі з надпісам функцый, якія будуць выконваць на судзе выбраныя асобы. Лепш, каб тэксты герояў не чыталіся з картак, а былі падрыхтаваныя і адпаведна абыграныя раней. К. просіць увагі ўсіх прысутных і запрашае далучыцца да дыскусіі пасля праслухоўвання працэсу.*

Прысутныя:
Суддзя — С
Пракурор — П
Бок абвінавачвання — Аб
Абарона — Ан
Сведкі — Св
Прыстаў — П
П: Прашу ўстаць! Суд ідзе!

С: Распачынаецца судовы працэс супраць вучэння Касцёла адносна дашлюбнай чыстасці. Голас аддаецца боку абвінавачвання.

Аб: *(устае)* Шаноўны спадар суддзя! Я звяртаюся з абвінавачваннем супраць Каталіцкага Касцёла, які абвяшчае шэраг нормаў і маральных наказаў, якія з’яўляюцца прычынай розных канфліктаў, абмяжоўваюць чалавечую свабоду, адмаўляюць чалавеку ў прыемнасці, асабліва гэта датычыць пытання дашлюбнай чысціні. Таму я прашу выдаць прысуд, моцай якога Касцёл змяніў бы сваё вучэнне адносна гэтага вельмі істотнага пытання чалавечага шчасця і свабоды. Пытанне дашлюбнай чыстасці — гэта прыватная справа чалавека.

С: Дзякуй. Што на гэта скажа бок абароны?

Ан: *(устае)* Шаноўны спадар суддзя! Касцёл з самага пачатку свайго існавання клапоціцца пра збаўленне чалавека, каб пасля зямной пілігрымкі ён мог сустрэцца са сваім Створцам у небе. Адносіны да ўласнай сексуальнасці, выкарыстанне гэтага дару можа або дапамагчы, або стаць перашкодай на гэтым

шляху. Святы апостал Павел у Пасланні да Карынцянаў так кажа пра гэта: ***«Хіба не ведаеце, што несправядлівыя не атрымаюць у спадчыну Валадарства Божага? Не ўводзьце сябе ў зман: ні распуснікі, ні ідэлапаклоннікі, ні чужаложнікі, ні пестуны, ні мужаложнікі, ні злодзеі, ні хціўцы, ні п'яніцы, ні паклёпнікі, ні рабаўнікі не атрымаюць у спадчыну Валадарства Божага»*** (1 Кар 6, 9–10 ) (*Праз судовага прыстава перадае тэкст Паслання суддзі*). Цела чалавека, ягоная сексуальнасць — гэта дар, які нельга выкарыстоўваць як тавар для абмену, як сродак зняць стрэс, пазбегнуць адзіноты, для забавы. Св. Павел называе цела чалавека *«святыняю Бога жывога»* (1 Кар 3, 16–17), таму чалавек не можа брудзіць яго грэхам нячыстасці. ***«Ці не ведаеце, што вы святыня Божая і што Божы Дух жыве ў вас? Калі хто зруйнуе святыню Божую, таго зруйнуе Бог, таму што святыня Бога святая, а ёй з'яўляецеся вы»***. (*Праз судовага прыстава перадае тэкст суддзі*). Пытанне сужэнства і дашлюбнай чыстасці не з'яўляецца прыватнай справай чалавека, бо яно закранае іншых людзей. Выклікаю перашага сведку.

Св І: Я — урач. Аднойчы да мяне на абследванне маці прывяла сваю непаўналетнюю дачку, якая была цяжарная. Маці не была супраць нараджэння дзіцяці і тлумачыла мне, што цяжарнасць яе дачкі — гэта прыватная справа дзяцей, якія ў хуткім часе збіраюцца ажаніцца. Шлюб сапраўды адбыўся — і грамадзянскі, і касцёльны. Потым гэтая дзяўчына кідае вучобу, праз некаторы час нараджаецца дзіця, а затым — развод, праз два гады зноў шлюб, у дадзеным выпадку — толькі грамадзянскі. Справа нечаканай цяжарнасці, шлюбу і разводу вельмі моцна адбілася на здароўі бацькі гэтай дзяўчыны, хворага на сэрца. Першы муж гэтай дзяўчыны распачаў судовую справу, на якой дабіваецца, каб дзіця выхоўвалася ў яго сям'і.

Ан: Ці ёсць сэнс у такой сітуацыі гаварыць пра сужэнства і дашлюбную чыстасць як пра прыватную справу чалавека?

Аб: Так склаліся абставіны, але Касцёл сваім вучэннем не можа ўсіх цягнуць да нормаў Сярэднявечча, калі абавязкова захоўвалася дашлюбная чыстасць. Сённяшні век — гэта век сексуальнай свабоды. Дарэчы, сам Бог даў чалавеку дар сексуальнасці, дык чаму чалавек павінен заглушаць у сабе гэтае жаданне? Запрашаю сведкаў.

Св: *(пара: хлопец і дзяўчына)* Мы студэнты першага курса універсітэта. Пазнаёміліся год таму, амаль столькі ж жывём разам, як сужэнства. Мы вельмі кахаем адно аднаго, вельмі шчаслівыя разам. Многія нашыя сябры таксама жывуць разам, не маючы шлюбу. Галоўнае ва ўзаемаадносінах — гэта каханне.

Ан: Той аргумент, што «ўсе так робяць, трэба крочыць у нагу з часам», не можа быць аргументам, які датычыць маральных каштоўнасцяў. Чыстасць — гэта каштоўнасць, якую нельга змясціць у межы пэўнага часу. Чыстасць — гэта дарога да святасці, а не да распусты. Гэта пацвяржаюць словы Святога Пісання:

***«Бо воля Божая — гэта асвячэнне вашае, каб вы сцерагліся ад распусты, каб кожны з вас умеў утрымліваць сваё цела ў святасці і пашане»*** (1 Тэс 4, 3–4) (*Праз судовага прыстава перадае тэкст суддзі*).

Сфера сексуальнасці — гэта справа душы, злучаная з псіхікай і целам чалавека. У такой глыбокай і складанай сферы, якой з'яўляюцца адносіны паміж людзьмі, падзеі па прынцыпу «прычына — вынік» не адбываюцца адразу. Сённяшнія памылкі могуць дэструктыўна ўплываць на адносіны паміж мужчынам і жанчынай нават праз гады. Вось сведчанне аднаго чалавека, які некалькі месяцаў таму ажаніўся з каханай асобай, але не можа быць па-сапраўднаму шчаслівы (*магнітафонны запіс*):

«Я вельмі люблю сваю жонку і ведаю, што яна мяне таксама моцна любіць. У мінулым я меў сексуальныя адносіны з іншымі дзяўчатамі, успрымаючы гэта як гульню. Я нават не думаў, што гэтыя адносіны так паўплываюць на мае адносіны да ўласнай жонкі. Справа ў тым, што я міжволі параўноўваю яе з дзяўчатамі з майго мінулага. Я стараюся гнаць ад сябе гэтыя думкі, але нічога не магу з сабою зрабіць. Нават у самыя найпрыгажэйшыя хвіліны, калі мы разам, у мяне перад вачыма паўстаюць дзяўчаты з майго мінулага. Гэта вельмі балюча... Я адчуваю сябе здраднікам…»

Аб: Касцёл сам мае комлекс адносна справаў сексуальнасці і прымушае іншых яго адчуваць. Калі б Касцёл менш клапаціўся аб захаванні састарэлых правілаў і нормаў, удзяляючы большую ўвагу дабрабыту маладых людзей, то ўбачыў бы, што дашлюбнае жыццё дапамагае выпрабаваць любоў. Лічба няўдалых сужэнстваў не была б такой вялікай.

Ан: Пазнаванне і выпрабоўванне перад шлюбам павінна быць, але яно павінна датычыць не сексуальнай сферы, а характару і глыбіні пачуццяў. Сексуальнае жыццё, якое распачынаюць маладыя людзі для выпрабавання свайго кахання, сведчыць толькі пра адно: паміж імі няма сапраўднага кахання! Сапраўднае каханне чакае! Яго аснова — гэта ўзаемнае дабро, пашана і адказнасць. Толькі ў сужэнстве хлопец і дзяўчына канчаткова выражаюць сваю згоду прыняць на сябе абавязкі сужэнцаў і адказнасць за сябе і за будучых дзяцей. Сужэнства не створыць кахання там, дзе яго няма, але там, дзе ёсць сапраўднае каханне, сужэнства стане месцам развіцця, узрастання, асвячэння гэтага высокага пачуцця. Шаноўны спадар суддзя! Я хачу падкрэсліць, што Касцёл не з'яўляецца ворагам сексуальнага жыцця, а толькі ставіць умовы для яго распачацця — гэтаю ўмоваю з'яўляецца сужэнства. Толькі сужэнства дае права на рэалізацыю кахання праз сексуальнае жыццё.

*У гэты момант К. заахвочвае моладзь уключыцца ў дыскусію і выказаць свае думкі і погляды на тэму дашлюбнай чыстасці. Падсумаваннем на заканчэнне будуць словы Яна Паўла II (падручнік вучня):*

*«Дасягнуць чысціні сэрца — гэта заданне для кожнага чалавека. Мы павінны няспынна супрацьстаяць сілам зла: тым, што дзейнічаюць у самім чалавеку, і тым, што дзейнічаюць звонку і хочуць адарваць чалавека ад Бога. У сэрцы чалавека ідзе няспынная барацьба за праўду і шчасце. Каб перамагчы ў ёй, чалавек павінен звярнуцца да Хрыста, бо перамагчы здолее толькі Яго моцай,*

*моцай Яго Крыжа і Уваскрасення. „Божа, ствары ўва мне чыстае сэрца“ (Пс 51, 12), — заклікае Псальміст, усведамляючы сваю слабасць і ведаючы, што недастаткова толькі ўласных сілаў, каб быць беззаганным перад Богам» (Ян Павел II, Сандомеж 12 чэрвеня 1999г.).*

***Развважанне:***
Чыстасць — гэта дарога, якой Пан Бог вядзе мяне да святасці.

— Чым дар чыстасці і сексуальнасці з’яўляецца для мяне?

— Як я паводжу сябе ў адносінах да супрацьлеглага полу?

— Якою я бачу сваю сям’ю?

— Над якімі сваімі рысамі як будучага мужа (будучай жонкі) я павінен(-на) сёння працаваць?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Складзі ўласнымі словамі малітву за чалавека, з якім у будучыні ты створыш сям’ю, пастарайся штодня ёю маліцца.

2. Напішы, што на тваю думку з’яўляецца фундаментам сям’і.

***Заключная малітва:*** (*падручнік вучня)*

Тэма № 17, Х кл.

## Гомасэксуалізм – грэх, які знішчае годнасць чалавека.

***Дыдактычная мэта:*** *Знаёмім вучняў з паняццем "сексуальнасць", распавядаем вучням аб пазіцыі Касцёла да праблемы сексуальных узаемаадносін паміж асобаў аднаго полу.*

***Выхаваўчая мэта:*** *Заахвочваем вучняў да годнага перажывання ўласнай сексуальнасці, а таксама да павагі, спачування і тактычнасці да асобаў, якія трываюць у гомасексуальных сувязях.*

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Рым 1, 18-32; 1 Кар 6, 9–10; Быц 19, 1-13. ККК 2359, 2358, 2360.

***Метады катэхезы:*** апавяданне, аналіз біблійнага тэксту, сцэнка

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** *Пане Божа, Ты стварыў чалавека на свой вобраз і падабенства. Ты прагнеш, каб жанчына і мужчына злучыліся ў сужэнстве ў адзінае цела, каб дзяліліся вернаю любоўю і моцаю Тваёй любові стварылі шчаслівую сям'ю. Просім у Цябе, Божа, святла Тваёй праўды і моцы Тваёй любові, каб мы маглі глыбей зразумець, у чым сутнасць сталай сужэнскай любові, і каб мы шчыра хацелі вучыцца гэтай любові.*

***Чалавек пытае***

Усё часцей у сродках масавай інфармацыі мы можам пачуць шэраг розных дыскусій на тэму сэксуальных адносін паміж асобамі аднаго полу. Чуем, што гэтыя асобы патрабюць для сябе талерантнасці і аднолькавых правоў, бо хочуць мець сакрамэнтальнае сужэнства, хочуць усынавіць дзіця, хочуць прапагандаваць творы сваёй гомасэксуальнай культуры ў такіх мейсцах як тэатр ці музей.

*К. запрашае вучняў да размовы, дыскусіі, задаючы пытанне:*

— як вы расцэньваеце сэксуальныя ўзаемаадносіны паміж асобамі аднаго полу?

— што, на вашу думку, з'яўляецца прычынай існавання сэксуальных ўзаемаадносін паміж асобамі аднаго полу?

— што б вы сказалі такім асобам на іх патрабаванне мець права да ўсынаўленне дзяцей?

Дысусія на тэму гомасэксуальных адносінаў — гэта ў першую чаргу дыскусія аб сэнсе сэксуальнасці чалавека, якая з'яўляецца дарам і заданнем ад Стварыцеля. Каталіцкі Касцёл у сваім вучэнні выступае ў абароне гэтага вялікага дару. Кожны дар чалавек павінен выкарыстоўваць згодна з Божым планам, каб атрымаць добры плён.

Касцёл вучыць:

«*Сэксуальнасць прадвызначана для сужэнскай любові мужчыны і жанчыны. У сужэнстве цялесная інтымнасць сужэнцаў становіцца знакам і задаткам духоўных зносінаў. Паміж ахрышчанымі сужэнскі саюз асвячаецца сакрнамэнтам*» (пар. ККК 2360).

— Які сэнс сэксуальнасці чалавека надаў Бог, ствараючы мужчыну і жанчыну?

— Хто паводле Божага плану з’яўляецца сужэнствам?

— З якою мэтаю заключаецца сакрамэнт сужэнства?

Чаму многія людзі не хочуць прыняць гэтай праўды? У кнізе Быцця мы знаходзім адказ на гэтае пытанне. Трэці раздзел гэтай кнігі распавядае нам аб першародным граху, які зраніў чалавека ва ўсіх сферах яго жыцця — духоўнай, псіхічнай і фізычнай. Гэта рана вельмі моцна адбілася на сэксуальнай сферы — бо гэта справа душы, злучаная з псіхікай і целам чалавека. Кніга Быцця паказвае нам жыхароў Садомы, сярод якіх шырока распаўсюдзіліся грахі сэксуальнага характару.

***Бог адказвае***

**«І прыйшлі тыя два анёлы ў Садому ўвечары, калі Лот сядзеў каля брамы Садомы. Лот убачыў і ўстаў, каб сустрэць іх, і пакланіўся тварам да зямлі і сказаў: “Спадары мае, увайдзіце ў дом слугі вашага і начуйце, і ўмыйце ногі вашыя, і ўстанеце раніцай і пойдзеце ў дарогу сваю”. Але яны сказалі: “Не, мы начуем на вуліцы”. Але ён моцна ўпрошваў іх; і яны пайшлі да яго і ўвайшлі ў дом ягоны. Ён зрабіў ім пачостку і спёк прэсны хлеб; і яны елі. Яшчэ не леглі яны спаць, як гарадскія жыхары, садомцы, ад маладога да старога, увесь люд з усіх канцоў горада, абступілі дом і выклікалі Лота і казалі яму: “Дзе людзі, якія прыйшлі да цябе нанач? выведзі іх да нас; мы спазнаем іх”. Лот выйшаў да іх да ўваходу і замкнуў за сабою дзверы, і сказаў: “Браты мае, не рабеце ліхога; вось, у мяне дзве дачкі, якія не спазналі мужчыны; лепей я выведу іх да вас, рабеце з імі, што вам заўгодна; толькі людзям гэтым не рабіце нічога, бо яны прыйшлі пад дах дома майго”. Але яны сказалі: “Ідзі сюды”. І сказалі: “Вось, прыхадзень, а хоча судзіць? Цяпер мы горш учынім з табою, чым з імі”. І яны падступіліся да чалавека гэтага, да Лота, і падышлі, каб выламаць дзверы. Тады мужы тыя працягнулі рукі свае, і ўвялі Лота да сябе ў дом, і дзверы замкнулі; а людзей, якія былі каля ўваходу ў дом, уразілі слепатою, ад малога да вялікага, так што яны нацярпеліся, шукаючы выхаду. Сказалі мужы тыя Лоту: “Хто ў цябе ёсьць яшчэ тут? Ці зяць, ці твае сыны, ці твае дочкі, і хто б ні быў у цябе ў горадзе, усіх выведзі з гэтага месца, бо мы знішчым гэтае месца; бо вялікі лямант на жыхароў яго Пану, і Пан паслаў нас знішчыць яго” »** ( Быц 19, 1-13).

*Вучні працуюць над тэкстамі са Святога Пісання, якія знаходзяцца ў падручніках. Вучні павінны падкрэсліць у гэтых тэкстах, што Святое Пісанне кажа аб грэху гомасэксуалізма.*

**««Хіба не ведаеце, што несправядлівыя не атрымаюць у спадчыну**

**Валадарства Божага? Не ўводзьце сябе ў зман: ні распуснікі, ні ідалапаклоннікі, ні чужаложнікі, ні пестуны, ні мужаложнікі, ні злодзеі, ні хціўцы, ні п'яніцы, ні паклёпнікі, ні рабаўнікі не атрымаюць у спадчыну Валадарства Божага»** (1 Кар 6, 9–10 ).

**«Бо адкрываецца гнеў Божы з неба на ўсякую бязбожнасць і няпраўду людзей, якія ўціскаюць ісціну няпраўдаю; бо, што можна ведаць пра Бога, ёсць яўнае ім, таму што Бог явіў ім; бо нябачнае ў Ім, вечная сіла Ягоная і боскасць, ад стварэньня свету праз сузіраньне тварэньняў бачныя, так што яны ня маюць выбачэньня. Але як што яны, спазнаўшы Бога, не праславілі Яго як Бога, і не падзякавалі, а змарнаваліся ў развагах розуму свайго, і запамрочылася неразумнае іхняе сэрца: называючы сябе мудрымі, здурнелі, і славу нятленнага Бога змянілі на падабенства вобраза прахлага чалавека, і птушак, і чатырногаў, і гадаў, - дык і аддаў іх Бог у пахацінствах сэрцаў іхніх нячыстасці, так што яны апаганьвалі самі свае целы; яны падмянілі ісціну Божую на ману і пакланяліся і служылі стварэньню замест Творцы, які дабраславёны навекі, амін. Таму аддаў іх Бог ганебным пажадам: жанчыны іхнія замянілі прыроднае паяднаньне на супрацьпрыроднае; гэтак сама і мужчыны, занядбаўшы прыроднае паяднаньне з жаночым полам, распальваліся пахацінствам сваім адзін да аднаго, мужчыны на мужчынах чынілі сорам і атрымлівалі самі ў сабе расплату за сваю аблуду. І як што яны не стараліся мець Бога ў розуме, дык аддаў іх Бог розуму перавернутаму - чыніць непатрэбшчыну. Яны ведаюць праведны вырак Божы, што тыя, якія чыняць такое, вартыя смерці; аднак жа не толькі гэта робяць, але і сабе падобных падахвочваюць» (пар. Рым 1, 18-28.32).**

*Вучні прэзентуюць сваю працу. Пасля прэзентацыі К. яшчэ раз звяртае ўвагу вучняў на апошні тэкст* (Рым 1, 18-28.32), *у якім св. Павел акрэслівае прычыну, па якой ў грамадстве ўзнікаюць грахі сексуальнай нячыстасці. К. дае вучням заданне яшчэ раз уважліва прачытаць тэкст і знайсці гэтую прычыну, аб якой кажа св. Павел. Адказы вучняў.*

Св. Павел акрэслівае гомасэксуальныя адносіны, як духоўную слепату, якая з'явілася ў выніку адыходу людзей ад свайго Творцы.

*Калі ёсць час, К. можа ў гэтым месцы зрабіць з вучнямі невялікую пастаноўку. К. запарашае аднаго з вучняў, завязвае яму вочы і кажа прайсці ад адой сцяны класа да другой. А потым К. дае вучню у рукі нейкія прадметы, якія з завязанымі вачамі ён павінен назваць і ахарактарызаваць, дзеля чаго яны служаць.*

Святы Павел акрэслівае гомасэксуальныя адносіны, як духоўную слепату, якая з'явілася ў выніку адыходу людзей ад свайго Стварыцеля. Разрываючы еднасць з Богам, чалавек губляе мэту і сэнс свайго жыцця, сам для сябе, або сам з сябе стварае «бога», якому пачынае служыць, марнуючы сваё жыццё і тыя

дары, якія атрымаў ад Стварыцеля. І жывучы ў такой духоўнай слепаце чалавек называе самаволю — свабодай, сэксуальнае жаданне — любоўю, сумеснае жыццё пад адным дахам — сям’ёй. У такой сітуацыі няма іншага выйсця, як толькі звярнуцца да мудрай традыцыі Касцёла, які пакажа шлях да Хрыста, Лекара, які ў сакрамэнце пакаяння лечыць нашыя раны, а ў сакрамэнце сужэнства благаслаўляе мужчыну і жанчыну для жыцця ў любові, якая дае пачатак новаму жыццю.

Сакрамэнт сужэнства — гэта знак сувязі Хрыста і Касцёла. У гэтым сакрамэнце сужэнцы атрымліваюць ласку ўзаемнай любові, якою Хрыстус палюбіў Касцёл. Сэксуальныя ўземаадносіны асобаў аднаго полу не толькі перакрэсліваюць гэтую багатую сімволіку сувязі Хрыста і Касцёла, але таксама сваім захаваннем супярэчаць той рэчаіснасці, якую заклаў Стварыцель у натуру кожнага чалавека.

Той аргумент, што « трэба крочыць у нагу з часам», што « сёння аднаполыя сужэнствы павінны мець права на сваё існаванне», не можа быць аргументам, які датычыць такой бясцэннай каштоўнасці, якой з’яўляецца сям’я. Сям’я — гэта каштоўнасць, якую нельга змясціць у межах пэўнага часу, змяняць і дастасоўваць яе да розных акалічнасцяў. Сям’я – гэта каштоўнасць якая выходзіць паза межы часу, бо ў ёй нараджаецца і выхоўваецца чалавек. І толькі ў сям’і, пабудаванай на цвёрдым маральным фундаменце, крыніцай якога з’яўляецца Божыя Загады, чалавек мае магчымасць развівацца правільна і гарманічна, згодна з воляй Божай.

***Чалавек адказвае Богу***

На сённяшняй катэхезе вы даведаліся аб пазіцыі Каталіцкага Касцёла да праблемы сексуальных узаемаадносін асобаў аднаго полу. А як мы, як хрысціяне, павінны адносіцца да людзей, якія жывуць у гэтым граху?

Мы можам ацаніць учынак чалавека, але не маем права ацэньваць асобу чалавека. Гомасексуаліст, як і кожны хрысціянін, пакліканы да жыцця ў чыстасці. Стараючыся жыць паводле навукі Хрыста, навязваючы з Ім няспынны кантакт у малітве і ў сакрамэнтах, гомасэксуаліст можа зыйсці з дарогі грэху.

***Разважанне:***

— Чым дар сэксуальнасці з’яўляецца для мяне?
— Як я паводжу сябе ў адносінах да супрацьлеглага полу?
— Якою я бачу сваю сям’ю?
—Як я адношуся да людзей, дакранутых грахом гомасэксуалізму?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Памаліся за асобаў, дакранутых грахом гомасэксуалізму.
2. Напішы ліст да асобы, якая трывае ў сэксуальных адносінах з асобай аднаго полу.

*Заключная малітва падручнік вучня*

Тэма № 18, X кл.

## ЖЫЦЬ У ПРАЎДЗЕ

***Дыдактычная мэта:*** асаблівым чынам звяртаем увагу моладзі на тое, што праўда мае вялізнае значэнне ў жыцці. Не прызнаючы таго, што праўда існуе, нельга пазнаць і зразумець свет, жыць добрасумленна, верыць у Бога.
***Выхаваўчая мэта*:** выхоўваем у моладзі імкненне жыць у праўдзе.
***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**
Святое Пісанн: Ян 14, 6; Ян 8,31-32; ККК 2475
***Метады катэхэзы:*** праца ў групах, незавершаны сказ.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** да св. Францішка.

***Чалавек пытае***

Кожны чалавек пакліканы быць шчырым і праўдзівым у дзеяннях і словах. Кожны мае абавязак шукаць праўду і трымацца яе, упарадкоўваючы ўсё сваё жыццё згодна з патрабаванямі праўды.

— Чаму людзі падманваюць?

*К. просіць аднаго з вучняў падыйсці да дошкі і накрэсліць табліцуў тры калонкі. У першай вучні запісваюць свае адказы на пытанне, у другой – часовыя вынікі, якіх можна дасягнуць падманам, трэцяя пакуль застаецца пустая.*

| **Людзі падманваюць, бо…** | **Праз гэта дасягаюць пэўных вынікаў** | **Іншы спосаб дзеяння** |
|---|---|---|
| баяцца пакарання | ніхто не даведаецца аб дрэнным учынку | папрасіць прабачэння |
| хочуць атрымаць больш грошай | набываюць новую рэч | звярнуць увагу не на рэчы, а на чалавека |

| | | |
|---|---|---|
| хочуць здабыць прыхільнасць іншай асобы | заводзяць новае сяброўства | быць самім сабой, а не чыёй-небудзь копіяй |

Як бачым, часта ў жыцці даводзіцца сутыкацца з няпраўдай і фальшу. Гэтым можна дасягнуць пэўных вынікаў, звычайна – часовых, бо праўда з цягам часу выходзіць наверх. **“Жыць у праўдзе”** – так гучыць тэма нашых сённяшніх заняткаў, падчас якіх мы будзем разважаць пра сутнасць сёмай Божай запаведзі. Прыгадайце, калі ласка, як яна гучыць?

**Пан Бог адказвае**

*Адзін з вучняў падыходзіць да дошкі і каляровай крэйдай запісвае:*

**Не сведчы фальшыва супраць бліжняга твайго.**

*К. дзеліць клас на 3 групы, якія атрымліваюць фрагмент са Святога Пісання і адказваюць на пытанні на падставе атрыманых тэкстаў:*

<u>Група I:</u>

«**Езус сказаў юдэям, якія паверылі ў Яго: “Калі вы застанецеся ў слове Маім, то сапраўды будзеце вучнямі Маімі і спазнаеце праўду, а праўда вызваліць вас**» (Ян 8,31-32)

— Аб якіх каштоўнасцях кажа Езус?
— Ад чаго праўда вызваляе чалавека?

<u>Група II:</u>

«**Езус сказаў яму: “Я — дарога, і праўда, і жыццё. Ніхто не прыходзіць да Айца інакш, як толькі праз Мяне**» (Ян 14, 6)

— Як Хрыстус называе Сябе?
— Што азначаюць словы : “Я - Дарога, Праўда і Жыццё?”

<u>Група III</u>:

*«***Вучні Хрыста „апрануліся ў новага чалавека, створанага паводле Бога ў справядлівасці, святасці і праўдзе***“ (Эф 4, 24). Адкінуўшы хлусню, яны*

*павінны „адкласці ўсялякую злосць і ўсякі подступ, і крывадушнасць, і зайздрасць, і ўсякае абгаворванне“(1 П 2, 1)» (пар. ККК 2475).* (*падручнік вучня)*

— Чаго не можа быць у жыцці вучня Хрыста?

*Пасля прэзэнтацыі працы вучняў, К. робіць падсумаванне адказаў:*

***Чалавек адказвае Пану Богу***

Праўда мае характар фундаменту ў адносінах паміж людзьмі. Яна дае пачуццё бяспекі. Часам можна пачуць такое меркаванне: "Кожны мае сваю праўду" — але такія паводзіны знішчылі б любое грамадства. Людзі сталі б вязнямі сваіх жаданняў, інстынктаў. Падман і іншыя грахі супраць праўды вельмі раняць і крыўдзяць чалавека. У свеце існуе адна Праўда – Езус, які прыйшоў даць сведчанне праўды сваім жыццём на зямлі.

Сапраўдны вучань Хрыста – гэта той, хто жыве ў праўдзе.

*К. запісвае на дошцы сказ* : **" Жыць у праўдзе – гэта значыць…"** *Вучні павінны завяршыць яго.* (*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

***Разважанне:***

Вернасць праўдзе складае фундамент даверу і ўсялякіх міжчалавечых адносінаў, і перадусім фундамент сапраўднай любові.

— Чаму трэба старацца жыць у праўдзе?

— Хто для мяне з'яўляецца прыкладам жыцця ў праўдзе?

— Якімі сродкамі я дасягаю пастаўленнай мэты?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Памаліся за тых людзей, якія сталі ахвярамі паклёпу, абгаворвання, ілжы.
2. Людзі падманваюць, бо праз гэта хочуць дасягнуць пэўных вынікаў. У сшытку напішы іншы спосаб дзеяння, згодны з праўдаю і вучэннем Хрыста.

***Заключная малітва:*** перапрашэнне сваімі словамі за ўчынкі няпраўды, паклёп, няшчырасць. (*альбо з падручніка вучня)*

Тэма № 19, X кл.

## БЛАГАСЛАЎЛЕННІ – ДАРОГА ДА ШЧАСЦЯ

***Дыдактычная мэта:***

знаёмім вучняў з навукай Езуса аб благаслаўленнях.

***Выхаваўчая мэта*:**

заахвочваем вучняў жыць паводле благаслаўленняў, дадзеных Езусам падчас Нагорнага казання.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

Святое Пісанне: Мц 5, 3-11.

***Метады катэхэзы:*** аповед.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** да Духа Святога.

***Чалавек пытае***

*Катэхет раздае вучням пустыя карткі і просіць падпісаць іх свайму сябру і пажадаць што-небудзь з нагоды пэўнага свята. Жадаючыя чытаюць падпісанныя карткі ўголас. К. працягвае*:

— Што найчасцей мы жадаем адзін аднаму?

— Які сэнс мы ўкладаем у слова “шчасце”?

Мы вельмі часта жадаем адзін аднаму шчасця, па-сапраўднаму не ведаючы, што гэта такое, бо атаясамліваем шчасце з багаццем, прыгажосцю, славай.

***Пан Бог адказвае***

На старонках Святога Пісання Езус паказвае нам шлях да сапраўднага шчасця. Чытаем пра гэта ў Евангеллі паводле Мацвея. Езус прамаўляе да кожнага з нас: “Жадаю табе, каб ты быў благаславёны, гэта значыць — шчаслівы!” Езус сам паказвае, як гэтага шчасця дасягнуць:

**«Шчаслівыя ўбогія духам, бо іх ёсць Валадарства Нябеснае. Шчаслівыя засмучаныя, бо яны суцешаны будуць. Шчаслівыя лагодныя, бо яны зямлю атрымаюць у спадчыну. Шчаслівыя галодныя і прагнучыя справядлівасці, бо яны насычаныя будуць. Шчаслівыя міласэрныя, бо яны міласэрнасць спазнаюць. Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога**

**ўбачаць. Шчаслівыя міратворцы, бо яны сынамі Божымі названыя будуць. Шчаслівыя, каго пераследуюць за справядлівасць, бо іх ёсць Валадарства Нябеснае. Шчаслівыя вы, калі будуць вас зневажаць і пераследаваць і ўсяляк зласловіць несправядліва з-за Мяне**» (Мц 5, 3-11)

Сучасны свет прапаноўвае нам іншыя дарогі да шчасця.

*К. змяшчае на дошцы табліцу з тэкстам благаславенняў, а вучні запісваюць побач, што на гэта кажа свет.* (*падручнік вучня*) *Напрыклад:*

| **Езус** | **Свет** |
|---|---|
| Шчаслівыя ўбогія духам, бо іх ёсць Валадарства Нябеснае. | Шчаслівыя багатыя, бо яны маюць усё, чаго прагнуць. |
| Шчаслівыя засмучаныя, бо яны суцешаны будуць. | Шчаслівыя тыя, хто радуецца, карыстаючыся ўсімі дабротамі свету. |
| Шчаслівыя лагодныя, бо яны зямлю атрымаюць у спадчыну. | Шчаслівыя тыя, пра каго пішуць ўсе газеты і часопісы, пра каго няспынна кажуць па тэлебачанні. |
| Шчаслівыя галодныя і прагнучыя справядлівасці, бо яны насычаныя будуць. | Шчаслівыя тыя, хто жыве ў абсалютнай свабодзе, без высілкаў і абмежаванняў. |
| Шчаслівыя міласэрныя, бо яны міласэрнасць спазнаюць. | Шчаслівыя тыя, хто жыве для сябе, бо яны не губляюць дарма час і сродкі. |
| Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць. | Шчаслівыя тыя, хто бярэ ад жыцця ўсё, асабліва ў сэксуальнай сферы, бо іх жыццё яркае і эмацыянальнае. |
| Шчаслівыя міратворцы, бо яны сынамі Божымі названыя будуць. | Шчаслівыя тыя, хто свабодна дэманструе сваю сілу і незалежнасць, бо іх баяцца, на іх хочуць быць падобнымі. |
| Шчаслівыя, каго пераследуюць за справядлівасць, бо іх ёсць Валадарства Нябеснае. | Шчаслівыятыя, хто сёння кіруе натоўпамі, бо ў іх руках улада. |

Бачым, які вялікі кантраст існуе паміж тым, чаго хоча Езус, і тым, да чаго імкнуцца людзі ў сучасным свеце.

Слова «благаслаўлённыя» значыць: «шчаслівыя, годныя хвалы». Рэвалюцыя Езуса грунтуецца на тым, што рэчы, якія свет называе няшчасцем, у вачах Езуса знаходзяць найвышэйшую пахвалу. Убогасць духа, смутак, цішыня, цярпенне, голад і прагенне справядлівасці, міласэрнасць, чысціня сэрца, захаванне супакою, цярпенне пераследу — усё гэта свет адкідае. Але ўсё гэта набліжае нас да Бога і вядзе да вечнага шчасця.

***Чалавек адказвае Пану Богу***

*«Ідзіце, паглядзіце на гэтыя фотаздымкі. Так выглядаў чалавек васьмі благаслаўленняў, які штодня нёс у сабе радасць Евангелля, добрай Навіны, радасць збаўлення, ахвяраваннага нам Хрыстом. Ён выглядаў так, як кожны з Вас, як сапраўдны малады чалавек, студэнт, ваш равеснік»* – гэтымі словамі кардынал Караль Вайтыла ў сакавіку 1977 года адкрываў выставу, прысвечанную жыццю П'ера Фрасаці.

П'ер Фрасаці нарадзіўся 6 красавіка 1901 года ў Турыне. Яго бацька быў італьянскім паслом ў Германіі. Сам П'ер вывучаў шахцёрскую справу на політэхнічным факультэце Турынскага універсітэту. Сваім жыццём гэты малады чалавек даваў сведчанне глыбокай і жывой веры, дапамагаў бедным і ўбогім людзям, наведваў іх, падтрымліваў духоўна і матэрыяльна. Адна жанчына так распавядае пра сваю сутрэчу з П'ерам. (*падручнік вучня)*

"Аднойчы з вокнаў сваёй крамы я ўбачыла маладога чалавека з мноствам пакункаў у руках. Ён разносіў гэтыя рэчы, заходзячы ў дамы на нашай вуліцы. Відаць, не знайшоўшы гаспадароў у адным доме, гэты малады чалавек скіраваўся да маёй крамы. Калі ён увайшоў, я запыталася: " Вы – такі прыгожы малады чалавек, прыстойна апрануты, і самі разносіце рэчы. Вы не баіцеся таго, што людзі могуць пра вас сказаць? Можа лепш пакіньце гэтыя пакункі ў мяне, людзі прыйдуць і самі іх забяруць". А ён адказаў: "Мне вельмі премна самаму наведваць гэтых людзей. Я магу падзяліцца з імі адвагай, даць ім надзею на змены ў іх жыцці і перадусім пераканаць іх, каб даверылі Богу свае клопаты і цярпенні, і каб прымалі ўдзел у Святой Імшы".

— Хто такі, на ваш погляд, чалавек васьмі благаслаўленняў?

***Разважанне:***

Хрыстус у Евангеллі ўказвае шлях, які вядзе да вечнага шчасця: благаслаўленні.

— Якую ролю выконваюць благаславенні ў маім жыцці?
— Якім чалавекам я імкнуся быць?
— Што я адкажу Езусу на запрашэнне ісці дарогай васьмі благаслаўленняў?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Напішы, якое з васьмі благаслаўленняў найбольш цябе кранула. Дзе і якім спосабам ты можаш яго рэалізаваць.
2. Намалюй у сшытку адно з благаславенняў.

***Заключная малітва:***

Божа дай мне духа чыстасці, каб я мог Цябе бачыць;
духа пакоры, каб мог Цябе пачуць;
духа любові, каб мог служыць Табе;

духа веры, каб я мог быць з Табою.

Тэма № 20, X кл.

## *ШЧАСЛІВЫЯ ГАЛОДНЫЯ І ПРАГНУЧЫЯ СПРАВЯДЛІВАСЦІ, БО ЯНЫ НАСЫЧАНЫЯ БУДУЦЬ*

***Дыдактычная мэта:***

знаёмім моладзь з той праўдай веры, што толькі Бог — справядлівы. Вучым будаваць адносіны з людзімі паводле Божай справядлівасці, якая заўсёды злучана з праўдай і любоўю. Кожны чалавек мае права на тое, каб да яго адносіліся справядліва.

***Выхаваўчая мэта*:**

заахвочваем моладзь мужна вызнаваць сваю веру і адважна абараняць справядлівасць.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

Святое Пісанне: Мц 7,1-5; Мц 5, 21-25; Мц 5, 38-42; Мц 5, 43-48; Мц 22, 34-40; карткі з каляровай паперы і алоўкі.

***Метады катэхэзы:*** аповед, праца ў групах.

### Ход заняткаў

***Малітва:*** Ойча наш...

Сярод васьмі благаслаўленняў, якія дае нам Пан Езус як восем своеасаблівых шляхоў да Божага Валадарства, ёсць таксама шлях справядлівасці.

**Чалавек пытае**

Вельмі важна, каб кожны з нас быў адказны за свае ўчынкі, словы, за працу, якую выконвае. (*падручнік вучня)*

“Сяргей быў прадпрымальнікам і працаваў у фірме, якая займалася будоўляй. Каб павялічыць свае даходы, Сяргей ашукваў людзей: краў будаўнічыя матэрыялы ў адных і прадаваў іх іншым людзям. Па дакументацыі ўсё было ў парадку. Асабліва вялікую небяспеку ўяўляў сабой апошні дом,

узведзены несумленным прадпрымальнікам. Нават ён сам пачаў турбавацца, што замоцна “перастараўся”. Можна ўявіць сабе яго твар, калі Сяргей даведаўся, што менавіта гэты дом дырэкцыя фірмы дорыць яму ў сувязі з выхадам на пенсію, каб ён разам з жонкай і дзецьмі мог спакойна сустрэць сваю старасць…”

— Чаму вучыць нас гэтая гісторыя?

Паспрабуем зараз акрэсліць, якое значэнне мае тэрмін “справядлівасць”.

*Катэхет піша на дошцы гэтае слова па вертыкалі, а вучні ўпісваюць па гарызанталі іншыя словы, якія яго расшыфроўваюць. Напрыклад:*

Паважаць адно аднага

.

Не асуджаць іншых людзей

Прасіць прабачэння

.

**С**упакой

Не гневацца

.

**П**авага

б**Р**ат

м**А**літва

пра**В**а

св**Я**тасць

Маліцца за ворагаў

.

**Д**абрыня

**Л**юбоў

Працаваць над уласнай недасканаласцю

мІласэрнаць

Вера

Быць пакорным

прАўда

Сэрца

еднасЦь

Выконваць запаведзі

роўнасцЬ

Любіць Бога і бліжняга

**Пан Бог адказвае**

К. дзеліць вучняў на групы, якія ў дадзенных ім тэкстах шукаюць адказ на пытанне:

— Якія шляхі да справядлівасці Езус паказвае вучням?

*Адказы вучні запісваюць на асобных картках, якія змяшчаюць каля слова* **"справядлівасць"**. (*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

Група I:

«**Не судзіце, каб і вас не судзілі. Бо якім судом вы судзіце, такім і вас асудзяць, і якою мераю мерыце, такою і вам адмераць. Чаму бачыш шчэпку ў воку брата свайго, а бервяна ў сваім воку не заўважаеш? Або, як скажаш брату свайму: "Дазволь мне вынуць шчэпку з вока твайго", — калі ў тваім воку бервяно? Крывадушны, спачатку выкіні бервяно з вока свайго, і тады ўбачыш, як выняць шчэпку з вока брата твайго**» (Мц 7,1-5)

Група II:

«**Вы чулі, што было сказана продкам: Не забівай; а хто заб'е, падпадае пад суд. А Я кажу вам, што кожны, хто гневаецца на брата свайго,**

**падпадае пад суд. Хто ж скажа брату свайму «рака», падпадае пад Высокую раду, а хто скажа «неразумны», падпадае пад геену вогненную.**

**Таму, калі ты прынясеш дар свой да ахвярніка і ўспомніш там, што брат твой мае нешта супраць цябе, пакінь там дар свой перад ахвярнікам, і ідзі спачатку памірыся з братам сваім, і тады прыйдзі і прынясі дар свой.**

**Мірыся з праціўнікам тваім хутка, пакуль ты яшчэ з ім у дарозе, каб праціўнік не аддаў цябе судздзі, а судздзя не аддаў цябе слузе, і не ўкінулі цябе ў вязніцу»** (Мц 5, 21-25)

<u>Група III :</u>

«**Вы чулі, што сказана: вока за вока і зуб за зуб. А Я вам кажу не праціўіцца злому. Калі хто ўдарыць цябе па правай шчацэ тваёй, падстаў яму і другую. І калі хто захоча судзіцца з табою і ўзяць у цябе кашулю, аддай яму і плашч. І калі хто цябе змусіць ісці з ім адну мілю, ідзі з ім дзве. Таму, хто просіць у цябе, дай і не адварочвайся ад таго, хто хоча пазычыць у цябе**» (Мц 5, 38-42)

<u>Група IV:</u>

«**Вы чулі, што сказана: Любі бліжняга свайго і ненавідзь ворага свайго. А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых і маліцеся за тых, хто пераследуе вас, каб сталіся вы сынамі Айца вашага, Які ў нябёсах. Бо Ён загадвае сонцу свайму ўзыходзіць над дрэннымі і добрымі і пасылае дождж на справядлівых і несправядлівых. Бо, калі вы будзеце любіць тых, хто любіць вас, якую маеце узнагароду? Ці ж не тое самае робяць і мытнікі? І калі вітаеце толькі братоў вашых, што асаблівага робіце? Ці ж не тое самае робяць і язычнікі? Таму будзьце дасканалыя, як дасканалы Айцец ваш Нябесны**» (Мц 5, 43-48)

<u>Група V:</u>

«**Калі фарысеі пачулі, што Ён прымусіў замоўкнуць садукеяў, яны сабраліся разам. І адзін з іх, законнік, выпрабоўваючы Яго, спытаўся: Настаўнік, якая запаведзь найбольшая ў Законе?**

**Езус сказаў яму: "Любі Пана Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёй душой тваёй, і ўсім розумам тваім. Гэта найбольшая і першая запаведзь: Другая ж — падобная да яе: Любі бліжняга твайго, як самога сябе. На гэтых дзвюх запаведзях грунтуецца ўвесь Закон і Прарокі**» (Мц 22, 34-40)

**Чалавек адказвае Пану Богу**

Прагнучыя справядлівасці – гэта тыя людзі, якія разумеюць і бачаць яе недахоп у свеце: на працы, у сям'і, у школе, сярод сяброў. Чалавек справядлівы стараецца перамагчы грэх, захаваць сваё сэрца чыстым. Езус у гэтым благаслаўленні заклікае нас да дасканаласці. Нам як сваім вучням Ён паказвае шляхі да справядлівасці — прабачэнне, захаванне запаведзяў, адказнасць за ўчынкі, стрыманнасць у словах і паводзінах, разуменне ўласнай недасканаласці. Быць справядлівым — гэта значыць адносіцца да іншага так, як хацелася б, каб адносіліся да цябе самога. Найлепшай дапамогай у рэалізацыі прынцыпу справядлівасці ў жыцці з'яўляюцца запаведзі любові да Бога і бліжняга.

***Разважанне:***

Езус запрашае мяне ісці шляхам справядлівасці, якой так не хапае ў сучасным свеце.

— Што значыць для мяне быць справядлівым?

— Што я раблю, каб мае жыццёвыя шляхі былі шляхамі рэалізацыі прынцыпу Божай справядлівасці?

— У чым сутнасць справядлівасці, да якой я імкнуся?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Напішы, што для цябе значыць, быць чалавекам справядлівым.

***Заключная малітва:*** (Пс 11(10), 4. 5. 7)

Тэма № 21, X кл.

## ШЧАСЛІВЫЯ ЎБОГІЯ ДУХАМ, БО ІХ ЁСЦЬ ВАЛАДАРСТВА НЯБЕСНАЕ

***Дыдактычная мэта:***

Дапамагаем моладзі зразумець, што для хрысціяніна матэрыяльныя даброты з'яўляюцца не мэтаю, а сродкам для дасягнення вышэйшых мэтаў.

***Выхаваўчая мэта :***

Заахвочваем вучняў прымаць уласнае ўбоства, духоўнае і матэрыяльнае, верачы, што праз гэта мы станем вобразам Хрыста, а таксама да пашаны ўбогіх людзей і да бескарыслівага дзялення з імі сваім дабром.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

Святое Пісанне: Мц 5,3 Ян Павел II, Элк.

***Метады катэхэзы:*** праца ў групах.

***Ход заняткаў***

***Малітва:***

Пан — мой Пастыр; ні ў чым не буду мець нястачы,
Ён дазваляе спачываць мне на зялёных пашах.
Да водаў спакойных вядзе мяне,
Ён душу маю пажыўляе.
Накіроўвае мяне на сцежкі справядлівасці
Дзеля імя свайго.
Калі нават пайду далінай смяротнага ценю,
Не буду баяцца зла, бо Ты са мною.
Тваё жазло і твой посах мяне суцяшаюць.
Ты стол для мяне накрываеш
На вачах маіх ворагаў;
Намашчваеш галаву маю алеем,
Келіх мой перапоўнены.
Сапраўды, дабрыняі міласэрнасць Твая будуць са мною
Ва ўсе дні жыцця майго,
І пасялюся я ў доме Пана
На доўгія дні.
(пар Пс. 22)

**Чалавек пытае**

Падчас мінулых заняткаў мы пачулі пра благаслаўенні, якія скіраваў да кожнага з нас Езус. Сёння мы больш падрабязна пазнаёмімся з сутнасцю першага благаслаўлення. Але перад тым, як мы распачнём размову, я заахвочваю вас выказаць сваё меркаване наконт вельмі распаўсюджанага сёння сцверджання: для шчасця чалавеку патрэбна багацце.

*Катэхет запісвае на дошцы гэтае сцверджанне і дзеліць дошку на дзве паловы. Кожны з вучняў падыходзіць і ставіць + пад тым адказам, з якім згаджаецца:*

Для шчасця чалавеку патрэбна багацце.

| Згодны | Не згодны |
|---|---|
| | + |

*Жадаючыя могуць аргументаваць свой выбар.*

**Пан Бог адказвае**

Сучасны свет закрывае вочы на ўбогасць і беднасць, заахвочвае да назапашвання багаццяў і прадстаўляе розныя магчымасці для набывання і выкарыстання набытага. Але менавіта ўбогіх Езус называе шчаслівымі.

*К. змяшчае на дошцы плакат, адзін з вучняў спачатку голасна чытае напісаны на ім тэкст*:

**«Шчаслівыя ўбогія духам, бо іх ёсць Валадарства Нябеснае»**
(Мц 5,3)
— Як вы лічыце, чаму Езус называе ўбогіх благаславёнымі?

На старонках Святога Пісання Езус паказвае сябе Тым, хто прыходзіць да найслабейшых, найменшых, адкінутых, апошніх. Езус з’яўляецца яскравым прыкладам убогага ў духу: хоць быў Богам, але прыйшоў у свет і жыў у беднасці, быў паслухмяны Айцу і Яго волі.

Пра гэтае благаслаўленне Святы Айцец Ян Павел ІІ казаў падчас сваёй пілігрымкі ў Элку (*падручнік вучня)*:

«Той з’яўляецца убогім духам, хто гатовы сваім багаццем шчодра дзяліцца з тымі, хто гэтага патрабуе. Бачна, што такі чалавек не прывязаны да сваёй маёмасці. Бачна, што ён добра разумее асноўную мэту матэрыяльнага дабрабыту: ён павінен быць выкарыстаны дзеля служэння іншым людзям, асабліва тым, хто знаходзіцца ў патрэбе. Касцёл пагаджаецца з прыватнай маёмасцю, калі яна выкарыстоўваецца для такой мэты. «Шчаслівыя ўбогія духам» — гэта заклік Хрыста, які сёння павінен пачуць кожны хрысціянін, кожны вернік. У наш час вельмі патрэбны ўбогія духам людзі, адкрытыя на прыняцце праўды і ласкі, на спаўненне Божых справаў. Людзі вялікага сэрца, непадуладныя бляску скарбаў гэтага свету, яны не дазваляюць, каб матэрыяльнае багацце зняволіла іх сэрца. Такія людзі сапраўды моцныя, бо напоўненыя скарбамі Божай ласкі. Яны жывуць са свядомасцю, што Бог адорвае іх няспынна і бясконца».

Праца ў групах. Знайдзіце ў прамове Яна Паўла ІІ адказ на пытанне і падкрэсліце:

Група I:
— Каго Святы Айцец называе «чалавек ўбогі духам»?

Група II:
— Каго Езус заклікае быць убогім духам?

Група III:
— Што для чалавека ўбогага духам з’яўляецца найвялікшай каштоўнасцю?

*Прэзентацыя працы вучняў.* (*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

Убогі духам — гэта чалавек, багаццем якога з'яўляецца Бог. Ён усведамляе, што ўвесь яго набытак з'яўляецца Божым дарам, таму ўдзячны Богу за гэтыя дары і хоча дзяліцца з іншымі тым, што сам мае. Той, хто ўмее даваць, не падуладны хцівасці, зайздрасці, нянавісці. Сэрца такога чалавека напоўнена радасцю, зычлівасцю, удзячнасцю, гэта значыць пачуццямі, якія складаюць шчасце чалавека.

Быць убогім у духу — гэта значыць спадзявацца не на сябе, не на свае веды, мудрасць, дасведчанасць, але стаць у праўдзе перад Богам і з даверам аддаваць Божаму Провіду сябе, сваё жыццё, планы. Езус гаворыць, што ўзнагародаю для такога чалавека будзе атрыманне ў спадчыну Божага Валадарста.

**Чалавек адказвае Пану Богу**

Сёння, напэўна, няма такога чалавека, які б ніколі не чуў пра дзейнасць благаслаўлёнай Маці Тэрэзы з Калькуты, якая ўсё сваё жыццё прысвяціла служэнню Хрысту, якога бачыла ў кожным убогім чалавеку, у кожным хворым і церпячым. Гэтую рэчаіснасць праз свае словы і ахвярную працу Маці Тэрэза старалася данесці да нас: «Заклікаю кожнага з вас —бедных і багатых, маладых і старых: аддайце вашыя рукі, каб служылі Хрысту ў абліччы Яго ўбогіх, і вашыя сэрцы, каб Яго ў іх убачылі і палюбілі. Убогія могуць быць блізка ці далёка, могуць быць у патрэбе матэрыяльнай ці духоўнай, могуць прагнуць любові і сяброўства, не ведаючы багацця Божай любові; бяздомныя могуць шукаць дому, пабудаванага з любові вашых сэрцаў. Любоў пачынаецца з дому. Можа Хрыстус галодны, хворы ці бяздомны ў тваім уласным сэрцы, у тваёй сям'і, сярод тваіх суседзяў, у краіне, дзе ты жывеш, у свеце?»

*Кожная з групаў працуе над пытаннем:*

— Дзе і як можна ў штодзённым жыцці рэалізаваць заклік Святога Айца і Маці Тэрэзы, словамі якіх прамаўляе да нас Хрыстус?

Прэзентацыя працы вучняў.

*Кат-т робіць кароткае падсумаванне, падкрэсліваючы, што сапраўды, не трэба мець вялікіх скарбаў, каб імі дзяліцца. Часам дастаткова невялікай праявы дабрыні, скіраванай да іншага чалавека.*

***Разважанне:***

Езус заклікае мяне палюбіць убогасць, бо ведае, што сэрца, поўнае жаданняў, вечна галоднае і ненасытнае, ніколі не зведае шчасця.

— Якім чынам я дзякую Пану Богу за дары, якія ад Яго маю?

— Якое мейсца ў маім жыцці займаюць матэрыяльныя рэчы?

— Дзеля чаго яны мне служаць?

— Што я магу сёння зрабіць для ўбогіх людзей з майго асяроддзя?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Напішы, каму са свайго асяроддзя ты можаш дапамагчы. Пастарайся гэта зрабіць.

***Заключная малітва:*** *падручнік вучня*

Тэма № 22, X кл.

## ШЧАСЛІВЫЯ МІЛАСЭРНЫЯ, БО ЯНЫ МІЛАСЭРНАСЦЬ СПАЗНАЮЦЬ

***Дыдактычная мэта:***

асаблівым чынам звяртаем увагу моладзі на тое, што міласэрнасць цесна звязаная з прабачэннем, у тым ліку і ўменнем прабачыць сабе.

***Выхаваўчая мэта*:**

вучым уменню прабачаць сабе і іншым.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

Святое Пісанне: Мц 5,7; Пс 145, 8-10; Лк 6,36; Лк 10,30-37, старыя газеты і часопісы.

***Метады катэхэзы:*** праца ў групах.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Пан міласэрны і ласкавы, доўгацярплівы і шматміласцівы. Пан добры да ўсіх, і міласэрнасць Яго над усімі стварэннямі Ягонымі. Няхай славяць Цябе, Пане, усе Твае стварэнні, і ўсе святыя Твае благаслаўляюць Цябе. (пар Пс 145, 8-10)

Псальміст славіць Бога за Яго дабрыню, міласэрнасць і ласкавасць. Якім чынам чалавек можа адказаць на Божую міласэрнасць? Няўдзячнасцю, абыякавасцю, альбо, наадварот, глыбокай верай, пашанай, падзякай, пакорай.

Падчас сённяшніх заняткаў Езус скіроўвае да нас заклік праз штодзённыя ўчынкі міласэрнасці сведчыць пра нашага нябеснага Айца: “Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны” (пар Лк 6,36) Міласэрных людзей Езус называе шчаслівымі: “Шчаслівыя міласэрныя, бо яны міласэрнасць спазнаюць” (пар Мц 5,7)

**Чалавек пытае**

Сярод нас жыве мноства людзей, якія патрабуюць дапамогі, увагі, добрага слова. Якімі могуць быць нашыя адносіны да гэтых людзей?

*Катэхет раздае вучням газеты і часопісы, а яны выразаюць адтуль малюнкі, дзе адлюстраваны пэўныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Вучні працуюць у парах і пасля прадстаўляюць вынікі сваёй працы, каротка апісваючы выбраны тып узаемаадносінаў. Падчас гэтай размовы можна будзе выдзеліць тры асноўныя тыпы адносінаў між людзьмі: абыякавасць, нянавісць, міласэрнасць. Адзін з вучняў запісвае іх на дошцы. Выбранныя малюнкі вучні змяшчаюць каля гэтых словаў. (К. можа выкарыстаць выказванні з падручніка вучня)*

— З якімі тыпамі ўзаемаадносінаў вы найчасцей сустракаецеся ў сваім жыцці?

— Якія пачуцці яны ў вас выклікаюць?

***Пан Бог адказвае***

У Евангеллі ад Лукі мы сустракаемся з гэтымі трыма тыпамі адносінаў між людзьмі.

*Адзін з вучняў чытае фрагмент з Евангелля ўголас. Пасля вучні чытаюць яго яшчэ раз самастойна і запісваюць у сшытак тып адносінаў і імя асобы з прыпавесці, чые паводзіны адпавядаюць гэтаму тыпу.*

**«На гэта Езус сказаў: “Адзін чалавек ішоў з Ерузалема ў Ерыхон і трапіў у рукі разбойнікаў, якія знялі з яго адзенне, паранілі яго і пайшлі, пакінуўшы ледзь жывога. Выпадкова нейкі святар ішоў тою дарогаю і, убачыўшы яго, прайшоў міма. Таксама і левіт, будучы на тым месцы, падышоў, паглядзеў і прайшоў міма. А нейкі самаранін, праязджаючы, знайшоў яго і, убачыўшы, злітаваўся. Падышоў, перавязаў яму раны, паліваючы алеем і віном. І, пасадзіўшы яго на сваю жывёліну, прывёз у заезд і паклапаціўся аб ім. А на другі дзень, ад'язджаючы, дастаў два дынары, даў карчмару і сказаў яму: Паклапаціся аб ім. А калі патраціш больш, я аддам табе, калі вярнуся. Як здаецца табе, хто з гэтых трох, на тваю думку, быў бліжнім таму, хто трапіў у рукі разбойнікаў”? Ён сказаў:**

**“Той, хто паступіў з ім міласэрна”. Тады Езус сказаў яму: “Ідзі і ты рабі таксама**”» (пар Лк 10, 30-37)

— Нянавісць – разбойнікі.
— Абыякавасць – святар і левіт.
— Міласэрнасць – самаранін.
(*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

К *запрашае вучняў яшчэ раз прачытаць прыповесць і знайсці сябе ў паводзінах гэтых людзей.*

**Чалавек адказвае Пану Богу**

У адносінах да іншага чалавека мы часам паводзім сябе так жа. Кожны з запісаных намі тыпаў адносінаў між людзьмі выклікае пасля сябе пэўныя наступствы. Гэтая прыпавесць паказвае нам, што такое абыякавасць, нянавісць і міласэрнасць.

*Вучні працуюць у трох групах. Кожная з іх запісвае, што мы набываем і што страчваем, калі паводзім сябе згодна з тым ці іншым тыпам узаемаадносінаў. Напрыклад:*

***Абыякавасць***

| *набываем альбо захоўваем*: | *губляем:* |
| --- | --- |
| — вольны час для сябе, калі<br>— можна паглядзець тэлевізар, пасядзець за камп’ютарам<br>— уласныя сілы | — магчымасць прынесці каму-небудзь радасць<br>— магчымасць дзеяння Божай ласкі ў сваім жыцці і ў жыцці іншага чалавека |

***Міласэрнасць***

| *губляем:* | *набываем:* |
| --- | --- |
| — уласныя сродкі і высілкі | — скарб для Божага Валадарства |

— выгодны выгляд у вачах многіх людзей — духоўнае ўзрастанне

— вольны час — пазбаўляенне ад эгаізму, разуменне патрэбаў іншых людзей

(*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

Нянавісць можа быць вельмі магутнай сілай, але гэта сіла знішчае. Яна пазбаўляе чалавека як матэрыяльных, так і духоўных каштоўнасцяў. Сэрца чалавека становіцца жорсткім, не здольным прабачаць.

Абыякавасць умацоўвае эгаістычныя жаданні чалавека, робячы яго нячулым да патрэбаў іншых людзей.

Шчаслівымі Езус называе міласэрных людзей, якія ахвяруюць сябе для іншых, прыходзяць з дапамогай, умеюць прабачыць учыненнае ім зло. Яны не дамагаюцца помсты, але моляцца за сваіх крыўдзіцеляў.

Міласэрнасць – гэта рыса Бога. Той, хто ў сваім жыцці будзе старацца наследваць Айца, сам спазнае Яго міласэрнасць. “Шчаслівыя міласэрныя, бо яны міласэрнасць спазнаюць” — гаворыць Езус.

***Развважанне:***

З ласкі святога хросту мы сталі Божымі дзецьмі, каб наследваць Хрыста ў Яго любові і ўчынках міласэрнасці.

— Якім чынам я дзякую Пану Богу за Яго міласэрнасць?

— Як я аказваю міласэрнасць у сваім асяроддзі?

— Ці заўважаю я патрэбы іншых людзей?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Складзі малітву, якая дапаможа табе быць міласэрным у адносінах да іншых людзей.
2. Выпішы з прыпавесці пра міласэрнага самараніна ўсе ўчынкі, якія ён зрабіў у адносінах да чалавека, які патрабаваў дапамогі.

***Заключная малітва:*** **Малітва св. сястры Фаусціны.** *(падручнік вучня)*

Тэма № 23, X кл.

# ШЧАСЛІВЫЯ, КАГО ПЕРАСЛЕДУЮЦЬ ЗА СПРАВЯДЛІВАСЦЬ, БО ІХ ЁСЦЬ ВАЛАДАРСТВА НЯБЕСНАЕ

***Дыдактычная мэта:***

звяртаем увагу моладзі на тое, што на працягу сайго зямнога жыцця Езус быў пераследаваны за справядлівасць.

***Выхаваўчая мэта*:**

Заахвочваем моладзь адважна абараняць і вызнаваць сваю прыналежнасць да Хрыста, незалежна ад абставін.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

Святое Пісанне: Мц 5, 10-12; Мц 20,18-19; Мц 22, 15-18; Мц 26,3-4; Ян 18, 33-37; Мк 15, 29-32, карткі для вучняў, плакат з напісаннымі на ім словамі благаслаўлення.

***Метады катэхэзы:*** праца ў парах, самастойная праца са Святым Пісаннем.

## *Ход заняткаў*

***Малітва:*** "Які за нас цярпеў ад ранаў, Езу Хрыстэ, змілуйся над намі" 3разы.

Падчас сённяшніх заняткаў мы працягнем знаёмства з васмю Хрыстовымі благаславеннямі, якія дапамагаюць нам на шляху да святасці.

### *Чалавек пытае*

Сучасны свет вельмі неахвотна прымае такія каштоўнасці як Божая справядлівасць, любоў, прабачэнне, жыццё, згоднае з прынцыпамі веры. Неаднойчы і ты сустрэнешся з сітуацыяй, калі табе трэба будзе стаць у абарону тых каштоўнасцяў, якія з'яўляюцца для цябе найважнейшымі.

*Катэхет запрашае вучняў папрацаваць у парах. Спачатку яны павінны паразважаць, а затым запісаць на картцы прыклад каштоўнасці, дзеля якой варта цярпець альбо нават аддаць жыццё. Пасля вучні прадстаўляюць вынікі сваёй працы.*

Абараняючы каштоўнасці, якія мы толькі што вызначылі, мы непазбежна сутыкнёмся з цярпеннем, якое могуць прынесці нам тыя, хто ва ўласным жыцці не мае такіх як ты каштоўнасцяў. Аднак, тых, хто церпіць пераслед, тых, каго зневажаюць і адкідаюць, Езус называе шчаслівымі.

### *Пан Бог адказвае*

*К. вывешвае на дошцы плакат з фрагментам Евангелля:*

**«Шчаслівыя, каго пераследуюць за справядлівасць, бо іх ёсць Валадарства Нябеснае. Шчаслівыя вы, калі будуць вас зневажаць і пераследаваць і ўсяляк зласловіць несправядліва з-за Мяне Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая ўзнагарода вашая ў нябёсах».**

(пар Мц 5, 10-12)

— Што абяцае Езус тым, хто церпіць з-за Яго?

Езус першы прайшоў дарогай благаслаўленняў, якія абвясціў усім людзям у казанні на гары. Убогі духам, лагодны, пакорны, міласэрны, пераследаваны – такім мы бачым Езуса на старонках Бібліі. Працуючы самастойна са Святым Пісаннем, знайдзіце, калі ласка, у ім тыя эпізоды, якія паказваюць Езуса несправядліва асуджаннага, пераследаванага за праўду.

*Напрыклад:*

«**Вось мы ўзыходзім у Ерузалем, і Сын Чалавечы будзе выдадзены першасвятарам і кніжнікам. І яны асудзяць Яго на смерць, і аддадуць Яго язычнікам на здзек і бічаванне і ўкрыжаванне, і на трэці дзень Ён уваскрэсне**» (пар Мц 20,18-19)

«**Фарысеі пайшлі і раіліся, як бы злавіць Езуса на словах. І пасылаюць да Яго вучняў сваіх разам з прыхільнікамі Ірада, кабі сказалі: Настаўнік, мы ведаем, што Ты праўдзівы, і шляху Божаму праўдзіва навучаеш і не зважаеш ні на кога, бо не глядзіш на асобу чалавека. Таму скажы нам: Як Табе здаецца, ці належыць даваць падатак цэзару, ці не? Але Езус, ведаючы зласлівасць іхнюю, сказаў: Што выпрабоўваеце Мяне, крывадушныя**?» (пар Мц 22, 15-18)

«**Тады сабраліся першасвятары і кніжнікі і старэйшыны народу ў двор першасвятара, якога звалі Каяфа, і дамовіліся ўзяць Езуса хітрасцю і забіць**» (пар Мц 26,3-4)

«**Тады Пілат зноў увайшоў у прэторыю, і спытаўся ў Езуса: Ты Кароль юдэйскі? Езус адказаў яму: Ці ад сябе ты кажаш гэта, ці іншыя сказалі табе пра Мяне? Пілат адказаў: Ці ж я юдэй? Твой народ і першасвятары выдалі Цябе мне: што Ты зрабіў? Езус адказаў: Валадарства Маё не з гэтага свету: калі б з гэтага свету было Маё Валадарства, то слугі Мае заступіліся б за Мяне, каб Я не быў выдадзены юдэям. Але цяпер Маё Валадарства не адгэтуль. Пілат сказаў Яму: Значыцца, Ты Кароль? Езус адказаў: Ты кажаш, што Я Кароль. Я для таго нарадзіўся і для таго прыйшоў на свет, каб засведчыць аб праўдзе.Кожны, хто ад праўды, слухае голас Мой**» (пар Ян 18, 33-37)

«**Тады Пілат узяў Езуса і загадаў бічаваць Яго. І воіны, сплёўшы вянок цярновы, усклалі Яму на галаву, і апранулі Яго ў пурпуру і казалі: Радуйся, Кароль юдэйскі! І білі яго па шчаках**» (пар Ян 19, 1-3)

«**Тыя, хто праходзіў міма, зневажалі Яго, ківаючы галовамі сваімі і кажучы: Гэй! Ты, што руйнуеш святыню і за тры дні будуеш, уратуй сябе самога, сыйшоўшы з крыжа. Падобна і першасвятары з кніжнікамі, насміхаючыся, казалі адзін аднаму: Іншых ратаваў, а сябе не можа ўратаваць! Хрыстус, Кароль Ізраэля, няхай сыдзе цяпер з крыжа, каб мы ўбачылі і паверылі**» (пар Мк 15, 29-32)

*(адзін з тэкстаў Святога Пісання вучні запісваюць у свой падручнік)*

Гэтыя ўрыўкі паказваюць нам Езуса пераследаваннага, ахвяру чалавечай несправядлівасці. Езус не абяцае лёгкага жыцця тым, хто хоча наследваць Яго, але такіх людзей нямала. Ад першых вучняў Езуса да сённяшняга дня ўся гісторыя Касцёла – гэта жывое сведчанне веры многіх людзей, якія змагаліся за праўду і справядлівасць, якія не баяліся аддаць сваё жыццё за Хрыста! Напэўна многіх з іх вы ведаеце.

*Вучні называюць імёны такіх людзей.*

— Чаму мы можам навучыцца ад гэтых людзей?

***Чалавек адказвае Пану Богу***

Кожны хрысціянін мае абавязак вызнаваць перад людзьмі сваю веру, сведчыць пра Хрыста сваім жыццём. Пра гэта нагадваў Ян Павел II падчас Сусветнага Дня Моладзі (*падручнік вучня)*:

“Дарагія маладыя сябры! Таксама і сёння верыць ў Хрыста, ісці за Ім слядамі Пятра, Тамаша – першых Апосталаў і сведкаў, стаць побач з Ім – гэта патрабуе амаль новага мучаніцтва. Напэўна, Бог не пажадае, каб вы пралівалі кроў, але каб былі вернымі Хрысту – абавязкова! Гэтую вернасці трэба будаваць штодня. Цяпер я маю на ўвазе цяжкасці, якія ўзнікаюць у сувязі з захаваннем чыстасці да сужэнства. Цяпер я маю на ўвазе маладых сужэнцаў і выпрабаванні, якія павінна вытрымаць іх вернасць. Цяпер я маю на ўвазе адносіны паміж сябрамі, у якія можа закрасца спакуса недаверу, нелаяльнасці”.

— Чаго сёння патрабуе ад нас Хрыстус?

*К. запрашае вучняў падзяліцца сваім жыццёвым вопытам, калі яны станавіліся ў абарону сваёй веры, сваіх ідэалаў і каштоўнасцяў. Якой была рэакцыя на гэта іншых людзей? Як яны самі сябе ў такія моманты адчувалі? Які плён прынеслі такія паводзіны ў іх уласнае жыццё і ў жыццё іншых людзей?*

***Разважанне:***

У змаганні за праўду і справядлівасць мы не самотныя. Хрыстус усіх церпячых і пераследаваных ўмацоўвае ласкай мужнасці, даючы ім ва ўзнагароду Валадарства Нябеснае.

— Якія каштоўнасці з'яўляюцца галоўнымі ў маім жыцці?
— Як я рэагую на прыніжэнні з боку іншых людзей, якія датычаць хрысціянскіх каштоўнасцяў, якімі я жыву?

— Дзе я чэрпаю сілы і ад каго вучуся адвагі, абараняючы Божую справядлівасць?

***Пастанова.***
***Хатняе заданне:***

1. Складзі і запішы малітву за таго, хто цябе крыўдзіць з прычыны хрысціянскіх каштоўнасцяў, якімі ты жывеш.
2. Падчас вячэрняй малітвы памаліся за гэтага чалавека словамі гэтай малітвы.

***Заключная малітва: падручнік вучня.***

Тэма № 24, X кл.

**ШЧАСЛІВЫЯ ЧЫСТЫЯ СЭРЦАМ,**
**БО ЯНЫ БОГА ЎБАЧАЦЬ**

***Дыдактычная мэта:***

указваем моладзі на тое, што мець чыстае сэрца – гэта значыць пазбягаць гвалту ў адносінах да іншых людзей: у думках, словах і ўчынках, не асуджаць іх. Мець чыстае сэрца – гэта значыць добра падрыхтавацца да перажывання сапраўднай любові ў цэлібаце або сужэнстве.

***Выхаваўчая мэта*:**

выхоўваем у моладзі імкненне захоўваць свае сэрцы чыстымі.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

Святое Пісанне: Мц 5, 8; Ян Павел ІІ, Сандомеж 12.06.99

Bp. Jan Pietraszko, «Rozważania», Wyd. Znak, Kraków 1964, ss. 177-181

магнітафон, плакат з намаляваным сэрцам, некалькі картак з каляровай паперы.

***Метады катэхэзы:*** «падарожжа ва ўяўленні», праца ў групах.

### *Ход заняткаў*

***Малітва:*** Вітай Марыя…

На працягу ўжо некалькіх заняткаў мы разважаем з вамі над сутнасцю васьмі благаславенняў. Сёння Езус зноў запрашае нас на гару Благаславенняў, каб мы змаглі пачуць і паразважаць над яшчэ адной дарогай, якая набліжае нас да святасці.

***Чалавек пытае***

А зараз я запрашаю вас у падарожжа ва ўяўленні.

*Катэхет уключае спакойную музыку, кажа вучням, каб яны выгодна размясціліся і закрылі вочы.*

Уяві сабе, што ты знаходзішся на гары Благаслаўленняў. Перад табою прыгожая панарама Галілеі. Вакол цябе зяляніна лугоў, пакрытых яркімі кветкамі. У далечыні ты бачыш сіняву Галілейскага возера. Ты сядзіш на траве, удыхаеш пах зёлак, адчуваеш лёгкі павеў ветру і цеплыню сонейка. Тваю ўвагу прыцягвае постаць Езуса, які стаіць на пагорку, крыху вышэй за астатніх людзей. Ты прыслухоўваешся да Яго словаў — гэта словы васьмі благаслаўленняў. Адчуваеш, што гэтыя словы напоўненны моцаю, і разам з тым – цеплынёй і лагодай. У гэты момант Езус прамаўляе: «**Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць.**» (пар Мц 5, 8)

— Якія думкі ўзнікаюць ў цябе ў сувязі з пачутым?

— Хто з’яўляецца чалавекам чыстага сэрца?

— Чым напоўнена тваё сэрца?

— Што забруджаве тваё сэрца?

*Праз хвіліну К выключае музыку і заахвочвае вучняў да працаваць далей. Жадаючыя адказваюць на першыя два пытанні.*

**Пан Бог адказвае**

*К змяшчае на дошцы «сэрца», на якім напісаны тэкст благаслаўлення. Вучні малююць яго ў сшытку:*




*К. дзеліць вучняў на 4 груп, якія будуць працаваць над тэкстамі аўтарства Яна Паўла II і біскупа Яна Пятрашкі.* (*падручнік вучня)*

***(Біскуп Ян Пятрашка ( 1911-1988), вядомы душпастыр моладзі)***
*Групы выконваюць наступныя заданні:*

Група I (*падкрэсліваюць адказ на пытанне ў тэксце)* (*падручнік вучня)*
— На чым грунтуецца чысціня сэрца?

Група II: *(выпісваюць адказы на картках)*
— Што дае чалавеку чысціня сэрца?

Група III:
— Што дапамагае дасягнуць чысціні сэрца?

Група 4 :
— Што забруджвае сэрца чалавека?

«Чысціня сэрца грунтуецца на свабодзе ад любога граху, а не толькі на захаванні фізічнай чыстасці.

Гэтая свабода асаблівая: не тая, якая будуецца на перакананні ва ўласнай нявіннасці, якая звысока глядзіць на іншага чалавека; не тая, якую дэманстраваў фарысей у святыні, кажучы «я захоўваю ўсе запаведзі». У святыні прысутнічаў яшчэ адзін чалавек. Ён кленчыў пры дзвярах і са скрухай і пакорай вызнаваў свае правіны. Менавіта пра яго Езус сказаў, што ён выйшаў са святыні апраўданы, без віны. Яго свабода ад граху пакорная, заснаванная на свядомасці, што ўсё з'яўляецца Божым дарам, што Бог дакранаецца да грэшнага сэрца і моцай сваёй міласэрнасці здымае з яго віну. Гэтая свабода поўная падзякі і адначасова насычаная жаданнем умацавацца ў вытрымцы. Добрую волю і жаданне вытрымкі можна параўнаць да пружыны. Колькі б разоў чалавек не падаў, яна не дазваляе яму заставацца ва ўпадку, прымушае ўстаць, навярнуцца. (...)

Пытанне чысціні сэрца застаецца адкрытым, заўсёды актуальным, бо чыстае сэрца дае чалавеку магчымасць убачыць Бога, пазнаць Яго і прыняць»

Bp. Jan Pietraszko, «Rozważania» (Wyd. Znak, Kraków 1964, ss. 177-181)

«Мець чыстае сэрца – гэта значыць быць новым чалавекам, вернутым праз збаўчую любоў Хрыста да жыцця ў еднасці з Богам і ўсімі стварэннямі. Толькі чыстае сэрца можа ў поўні любіць Бога! Толькі чыстае сэрца можа здзейсніць вялікую справу любові, якой з'яўляецца сужэнства! Толькі чыстае сэрца можа ў поўні служыць бліжняму.

Дасягнуць чысціні сэрца – гэта заданне для кожнага чалавека. Мы павінны няспынна супрацьстаяць сілам зла: тым, што дзейнічаюць у самім чалавеку, і тым, што дзейнічаюць звонку і хочуць адарваць чалавека ад Бога. У сэрцы чалавека ідзе няспынная барацьба за праўду і шчасце. Каб перамагчы ў ёй, чалавек павінен звярнуцца да Хрыста, бо перамагчы здолее толькі Яго моцай, моцай Яго Крыжа і Уваскрасення. "Божа, ствары ў-ва мне чыстае сэрца" (Пс 51,12) – заклікае Псальміст, усведамляючы сваю слабасць, і ведаючы, што, каб быць беззаганным перад Богам, недастаткова толькі ўласных сілаў».

Ян Павел II, Сандомеж 12.06.99

*Прэзентацыя працы групаў. Свае карткі вучні змяшчаюць каля плакату са словамі благаславення.*

## **<u>Чысціня сэрца</u>**

— гэта Божы дар
— у кожным чалавеку бачыць Бога
— дазваляе ва ўсёй паўнаце любіць Бога, пазнаць і прыняць Яго
— дапамагае служыць іншаму чалавеку
— дазваляе стаць новым чалавека
— дапамагае ў падрыхтоўцы да сужэнства і жыцця ў цэлібаце

**Чалавек чысты сэрцам**

***Дапамога:*** ***Перашкоды:***

| | |
|---|---|
| ........................................... | ................................................. |
| ........................................... | ................................................. |
| ........................................... | ................................................. |
| ........................................... | ................................................. |
| ........................................... | ................................................. |
| ........................................... | ................................................. |
| ........................................... | ................................................. |
| ........................................... | ................................................. |

(*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

***Дапамога:*** жыццё ў Праўдзе , сакрамэнты , паглыбленне веры, малітва аб чысціні сэрца, вернасць**,** пост, уменне бачыць Бога ў кожным стварэнні.

***Перашкоды:*** «свабодная» любоў, якую прапагандуюць сродкі масавай інфармацыі**,** парнаграфія**,** абясцэньванне жыццёвых каштоўнасцяў, эгаізм

***Чалавек адказвае Пану Богу***

Быць чалавекам чыстага сэрца. Менавіта такое заданне сёння ставіць перад намі Хрыстус. Чалавек чыстага сэрца не кіруецца ў сваім жыцці злосцю, агрэсіяй, нянавісцю, якія часам узнікаюць у яго сэрцы, бо здольны бачыць у іншым чалавеку Бога. На гэтым шляху кожнага з нас могуць напаткаць шматлікія перашкоды. Але не будзем забывацца, што нас падтрымлівае Хрыстус ласкаю прабачэння ў сакрамэнце пакаяння, а ў сакрамэнце Эўхарыстыі Ён умацоўвае нас сваёю прысутнасцю. Той, хто мае чыстае сэрца, мае чыстыя вочы, чыстыя вусны і чыстыя рукі.
*К. дае вучням заданне завяршыць наступныя сказы (падручнік вучня).*

***Чыстасць вачэй — гэта …***

***Чыстасць вуснаў — гэта …***

***Чыстасць рук — гэта …***

***Разважанне:***

Сэрца – гэта цэнтр, асяродак нашага духоўнага жыцця, каштоўнасцяў, якія мы носім у сабе. Хрыстус, умацоўваючы нас сваім Словам і Целам, дапамагае ачышчаць нашыя сэрцы, каб позіркі, думкі, жаданні былі чыстымі, напоўненнымі павагай і зычлівасцю.

— Як я адкажу Езусу на Яго заклік да чыстасці сэрца?
— Што я раблю каб захаваць сваё сэрца ў чысціні?
— Як часта я прыступаю да сакрамэнтаў пакаяння і Эўхарыстыі?
— Якіх я выбіраю сяброў?
— Якія тэлевізійныя перадачы я гляджу, якія кнігі, часопісы і газеты чытаю?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Пастарайся штодня маліцца аб чысціні сэрца.
2. Паразважай, над чым табе трэба папрацаваць, каб стаць “чалавекам чыстага сэрца”.

***Заключная малітва:*** спеў “О, мой Езу, ціхі і пакорны, сэрца мне зрабі да свайго падобным”.

Тэма № 25, X кл.

# ШЧАСЛІВЫЯ МІРАТВОРЦЫ, БО ЯНЫ СЫНАМІ БОЖЫМІ НАЗВАНЫЯ БУДУЦЬ

***Дыдактычная мэта:***

растлумачваем, што супакой – гэта Божы дар. Каб жыць у супакоі, трэба выхоўваць у сабе здольнасць прымаць іншага чалавека такім, якім ён ёсць.

***Выхаваўчая мэта*:**

выхоўваем у моладзі здольнасць перамяняць сваё сэрца, кіруючыся пры гэтым справядлівасцю і прабачэннем.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

Святое Пісанне: Мц 5,9; Ян 14,27; 1 Тэс 5, 13 – 18; Ян Павел II, Торунь, 7 чэрвеня 1999 г., Dietrich Bonhoeffer, плакат, на якім напісанныя словы благаславення, нажніцы, старыя часопісы, клей, 3 аркушы паперы для плакатаў.

***Метады катэхэзы:*** незавершаны сказ, праца ў групах.

## *Ход заняткаў*

***Малітва:*** спеў “Езус, імя святое”.

Людзі ва ўсім свеце прагнуць спакою. Міжнародныя арганізацыі прыкладаюць вялікія намаганні, каб у свеце запанаваў спакой. Касцёл заклікае да спакою, выконваючы заданне, якое даў Хрыстус. Аднак, штодня мы чуем , што ў нейкай краіне праліваецца кроў, людзі знішчаюць і забіваюць адно аднаго.

***Чалавек пытае***

Мы таксама з’яўляемся сведкамі “войнаў”, якія адбываюцца ў нашых дамах, сярод суседзяў, у класе, паміж сябрамі.

— Што з’яўляецца прычынай войнаў і канфліктаў паміж людзьмі?
— Чаму чалавеку патрэбны супакой?
— Якія знешнія прыкметы супакою?

***Пан Бог адказвае***

Людзі ва ўсе часы прагнулі супакою. Усіх, хто прыносіць супакой, Езус называе шчаслівымі, благаслаўлёнными.

*Катэхет змяшчае на дошцы плакат са словамі благаслаўлення:*

**«Шчаслівыя міратворцы, бо яны сынамі Божымі названыя будуць»**. (Мц 5,9)

— Што з'яўляецца ўзнагародай для чалавека спакою?
«**Спакой пакідаю вам, спакой Мой даю вам. Не так, як дае свет, Я вам даю. Няхай не трывожыцца сэрца вашае і не баіцца**» (Ян 14,27)

Спакой Езуса адрозніваецца ад спакою, які дае свет. Чаму? У святым Пісанні слова “спакой” мае вельмі шырокае значэнне: ……..дабрабыт і гармонія, шчасце, добрыя адносіны паміж людзьмі, у сем’ях, між народамі, а таксама паміж Богам і чалавекам. Супрацьпастаўленнем спакою з’яўляецца не толькі вайна, але і ўсё, што прыносіць шкоду асобе і адносінам паміж людзьмі. Гісторыя чалавецтва ведае многа прыкладаў, калі трыумф несправядлівасці і пагарды да чалавека меў назву «спакою». Спакой Божы цесна звязаны са справядлівасцю і праўдай. Езус абвяшчае благаслаўлёнымі тых, хто прагне пашырэння Божага супакою ў свеце. Сэрца чалавека, які захоўвае вернасць Богу і Яго волі, Дух Святы напаўняе спакоем. Чалавек, які мае ў сэрцы Божы спакой, становіцца крыніцай спакою ў свеце.

К. дзеліць вучняў на 3 групы і кожнай з іх дае фрагмент тэксту, на падставе якога вучні павінны завяршыць наступны сказ:

***Чалавек Хрыстовага супакою – гэта той, хто…***

Група I:
**«Жывіце ў згодзе паміж сабою. Молім вас, браты, настаўляйце бясчынцаў, суцяшайце маладушных, падтрымлівайце слабых, будзьце велікадушнымі да ўсіх. Глядзіце, каб ніхто не плаціў злом за зло; але заўсёды шукайце дабра адзін аднаму і ўсім. Заўсёды радуйцеся, няспынна малецеся. За ўсё дзякуйце, бо такая адносна вас Божая воля ў Езусе Хрысце»** (пар. 1 Тэс 5, 13–18).

Група II :
«Дарагія браты і сёстры! Без духоўнай адновы, без перамогі над злом і грахом у сэрцы і асабліва без любові, чалавек не здабудзе ўнутранага супакою. Вам патрэбныя чысціня сэрца і глыбокая пакора, каб гэта зразумець. Спакой нараджаецца ў сэрцы чалавека, і ў грамадскім жыцці паходзіць з маральнага ладу жыцця, этычных законаў, захавання Божых запаведзяў»
Ян Павел II, Торунь, 7 чэрвеня 1999 г.
Група III:
«Хто ідзе за Хрыстом, выракаецца насілля і бунту, бо яны ніколі не служаць справе Хрыста. Вучні Хрыста захоўваюць спакой. Яны лепш будуць самі цярпець, чым прыносіць каму-небудзь цярпенне, будуць захоўваць адзінства

там, дзе іншыя яго парушаюць. Людзі супрацьпастаўляюць спакой насіллю і гатовыя з-за гэтага цярпець. Яны нясуць крыж разам са Сваім Панам, бо праз крыж у свет прыйшоў спакой. Яны так шчыра ўдзельнічаюць у справе Божай, што і самі будуць названыя сынамі Божымі» Dietrich Bonhoeffer

*Прэзэнтацыя працы вучняў.* (*свае адказы вучні запісваюць у падручнік)*

**Чалавек адказвае Пану Богу**

Чалавечае грамадства адчувае недахоп і патрабуе людзей спакою. Касцёл, да якога мы належым праз хрост, няспынна жыве Евангеллем супакою, абвяшчае яго ўсім народам, паказвае шлях да еднасці і згоды. Гэты шлях – сакрамэнт пакуты, які прыносіць ласку Божай міласэрнасці, лечыць параненныя грахом людзкія сэрцы. Крыніца супакою – гэта Эўхарыстыя, ахвяра паяднання паміж Богам і чалавекам. Хрыстус, які прыходзіць да чалавека ў Эўхарыстыі, прыносіць ласку супакою ў ягонае сэрца.

*К. раздае вучням газеты і часопісы, нажніцы і аркушы паперы і дзеліць іх на 3 групы. Кожная група робіць з прапанаваных матэрыялаў плакат* **“Будуем супакой…”**

Група I: …у нашай групе
Група II: …у сваёй сям’і
Група III: …у нашай краіне

*Вучні прадстаўляюць вынікі сваёй працы.*

***Разважанне:***

Кожны з нас як хрысціянін мае заданне змагацца з уласным эгаізмам, пыхаю, слабасцямі, якія знішчаюць у сэрцы спакой, і павінен далучыцца да будавання спакою ва ўсім свеце.

— Што я раблю каб будаваць спакой ў сваім класе, школе, сям’і?
— Як я магу стаць чалавекам спакою?
— Што мне трэба змяніць у сваіх паводзінах, каб не рабіць крыўды і не ўжываць насілля ў адносінах да людзей?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Падчас вячэрняй малітвы памаліся аб спакоі ва ўсім свеце.

***Заключная малітва:*** Св. Францішка аб духу любові.

Тэма № 26, Х кл.

## ЛЮБІЦЬ СВАЮ АЙЧЫНУ.

***Дыдактычная мэта:***

знаёмім моладзь з правамі і абавязкамі, якія яны маюць ў адносінах да сваёй Айчыны. Растлумачваем паняткі патрыятызму і нацыяналізму. Указваем моладзі на тое, што наша Айчына – у небе, а зямное жыццё ў межах пэўнай краіны і ў пэўным грамадстве – гэта шлях да Нябеснай Айчыны.

***Выхаваўчая мэта*:**

выхоўваем у моладзі імкненне пазнаваць сапраўдную гісторыю свайго народа, а таксама заахвочваем да малітвы за кіраўнікоў дзяржавы і за ўсіх жыхароў нашай краіны.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

«Gaudium et spes 74»; Ян Павел II «Памяць і самасвядомасць», аўдыёзапіс песні І. Мулявіна «Малітва».

***Метады катэхэзы:*** праца ў групах.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** спеў: “Малюся за Цябе, Беларусь”.

— Аб чым мы просім у гэты  спеве?

Сёння мы будзем разважаць над пытаннем патрыятызму. З’яўляючыся грамадзянамі ўласнай краіны, мы не павінны забывацца пра тое, што маем не толькі правы, але і абавязкі ў адносінах да яе.

***Чалавек пытае***

Катэхет уключае аўдыёзапіс песні “Малітва”, якую выконвае славуты беларускі спявак І. Мулявін . Гэта пакладзеныя на музыку вершы Я.Коласа.

— Пра што спявае музыка ў гэтым творы?
— Што аўтар просіць у Бога для сваёй Радзімы?
— Як можна назваць  чалавека, які так любіць сваю Айчыну?
— Чым яшчэ характарызуюцца паводзіны патрыёта?

**Пан Бог адказвае**

Навука Касцёла заклікае ўсіх хрысціянаў жыць паводле Божага закону сярод свайго народу, любіць сваю Айчыну і клапаціцца пра яе дабрабыт. Касцёл не атаясамлівае сябе з палітычнымі партыямі, уладамі ці дзяржаўнымі сістэмамі. Аднак, абвяшчаючы Добрую Навіну аб збаўленні, Касцёл абараняе свабоду чалавека, яго правы, клапоціцца пра спакой і згоду паміж народамі,

уключаецца ў будаванне і пашырэнне супольнага дабрабыту ва ўсім свеце. Касцёл заклікае вернікаў да ўдзелу ў гаспадарчай, грамадскай, культурнай дзейнасці, каб далучаючы свае сілы, ініцыятывы, ахвярнасць і малітву, клапаціцца пра распаўсюджаване хрысціянскіх каштоўнасцяў у грамадстве.

*К. дзеліць вучняў на 2 групы і кожнай дае ўрывак з «Gaudium et spes»* (74). *Вучні павінны знайсці і падкрэсліць адказ на пытанне, якія абавязкі мае хрысціянін у адносінах да сваёй дзяржавы.*

Група I:

*«Няхай грамадзяне велікадушна і верна захоўваюць патрыятызм, аднак без духоўнай абмежаванасці, заўсёды маючы на ўвазе дабро ўсёй чалавечай сям'і, у якую розныя сувязі яднаюць плямёны, народы і нацыі.*

*Няхай усе хрысціяне адчуваюць сваё асаблівае і ўласцівае ім пакліканне ў палітычнай супольнасці, дзякуючы якому яны павінны даваць яскравы прыклад сумленнага выканання абавязкаў і служэння агульнаму дабру, паказваючы на справе, як можна пагадзіць уладу са свабодай, прыватную ініцыятыву з салідарнасцю ўсяго соцыума, карыснае адзінства з плённай разнастайнасцю.*

Группа II:

*Няхай ва ўладкаванні часовых спраў яны ўлічваюць слушныя, хоць і розныя погляды, і шануюць аб'яднанні грамадзян, якія сумленна абараняюць гэтыя погляды. Палітычныя ж партыі павінны падтрымліваць тое, чаго на іх думку патрабуе агульнае дабро, аднак ніколі нельга ставіць уласную выгаду вышэй за агульнае дабро.*

*Трэба стаpанна клапаціцца пра грамадзянскую і палітычную асвету, так пільна сёння патрэбную людзям, асабліва моладзі, каб усе грамадзяне маглі выконваць сваю задачу ў жыцці палітычнай супольнасці. Тыя, хто мае здольнасць да палітычнай дзейнасці – складанай і ў той жа час вельмі высакароднай*[1] *– павінны падрыхтавацца да яе і старацца займацца ёй, не думаючы пра сваю матэрыяльную карысць. Няхай выступаюць супраць дыктату як з боку аднаго чалавека, так і самаўладства ці*

[1]

***неталерантнасці палітычнай партыі, дзейнічаючы мудра і беззаганна ў маральных адносінах, больш за тое, няхай прысвячаюць сябе агульнаму дабру ў шчырасці і праўдзе, з любоўю і палітычнай адвагай» (Gaudium et spes, 75).***

*Вучні запісваюць у падручнік:*
Абавязкі, якія маюць хрысціяне ў адносінах да сваёй дзяржавы:

— любіць сваю Айчыну.
— мець пашану для людей іншых расаў і нацыянальнасцяў.
— даваць прыклад сумленнага жыцця.
— добра выконваць свае абавязкі.
— служыць агульнаму дабру.
— дадаваць уласную ініцыятыву да будавання супольнага дабрабыту.
— шанаваць погляды і меркаванні іншых людзей.
— быць адказным грамадзянінам, супрацьстаяць несправядлівасці, прыгнёту, парушэнню закону.

Патрыёт – гэта не той, хто кажа, што з'яўляецца ім, а той, хто ўласным жыццём паказвае, як ім быць, ганарыцца традыцыямі пакаленняў і шматвекавой культурай і мовай уласнага народу, цікавіцца яго гісторыяй, заклапочаны сучаснымі праблемамі. Патрыёт разумее, што Айчына – гэта месца, дзе часам цяжка жыць, але гэта месца своеасаблівае, выключнае і па-сапраўднаму роднае. Паняцце "патрыятызм" трэба ўмець адрозніваць ад паняцця "нацыяналізм", бо для нацыяналізму характэрна тое, што ён прызнае толькі дабрабыт ўласнага народу і толькі да яго імкнецца, не лічачыся з правамі іншых. Тым часам патрыятызм прызнае аднолькавыя правы для сайго і ўсіх іншых народаў.

Тэме "любові да Айчыны" і "патрыятызму" прысвечаны некалькі раздзелаў кнігі Яна Паўла ІІ "Памяць і самасвядомасць". У гэтай кнізе аўтар падае нам больш глыбокі паняцце Айчыны (*падручнік вучня)*:

"Выраз "айчына" звязана з паняццю і рэальнасцю айца. Айчына ў пэўнай ступені — тое самае, што вотчына, гэта значыць запас багаццяў, якія мы атрымалі ў спадчыну ад бацькоў. Вызначальна тое, што часта гаворыцца таксама "айчына-маці". Ведаем з уласнага досведу, у якой ступені перадача духоўнай спадчыны адбываецца праз маці. Такім чынам, айчына – гэта спадчына і разам з тым – гэта наяўная маёмасць, якая вынікае з гэтай спадчыны, у тым ліку таксама землі, тэрыторыя, але яшчэ больш – каштоўнасці і духоўная сутнасць, якія складаюць культуру дадзенага народа.(…) Евангелле надало новае значэнне паняццю айчыны. Вотчына,

якою мы абавязаны Хрысту, скіроўвае тое, што належыць да спадчыны людзкіх айчынаў і людзкіх культураў, у бок вечнай айчыны. Хрыстус кажа: “ Я выйшаў ад Айца і прыйшоў у свет. Зноў пакідаю свет і іду да Айца” (пар Ян 16,28). Гэты адыход Хрыста да Айца азначае запачаткаванне новай айчыны ў гісторыі ўсіх айчынаў і ўсіх людзей. Часам гаворыцца “нябесная айчына”, “вечная айчына”. Гэтыя выразы ўказваюць менавіта на тое, што здзейснілася ў гісторыі чалавека і народаў праз справу прыйсця Хрыста на свет і Яго адыходу з гэтага свету да Айца.”

— Што Ян Павел II называе нашай айчынай?

**Чалавек адказвае Пану Богу**

*К. просіць вучняў, каб яны самі працягнулі спіс, дадаючы абавязкі хрысціяніна ў адносінах да краіны згодна са сваім меркаваннем. Напрыклад:*

— ведаць гісторыю і культуру сваёй краіны.
— шанаваць родную мову.
— захоўваць сямейныя традыцыі.
— маліцца за кіраўнікоў дзяржавы, аб дабрабыце краіны і яе развіцці.

***Разважанне:***

Мая Айчына – у небе, а зямное жыццё ў межах пэўнай краіны і ў пэўным грамадстве – гэта шлях да Нябеснай Айчыны.

— Як часта я малюся за сваю Айчыну?
— Што значыць для мяне паняцце патрыятызму?
— Якім чынам я клапачуся пра прыгажосць і развіццё сваёй дзяржавы?
— Як я адношуся да традыцый і мрвы свайго народу?
— Як я адношуся да людзей іншых нацыянальнасцяў?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Памаліся аб тым, каб жыхары нашай краіны будавалі сваё жыццё на фундаменце хрысціянскіх каштоўнасцяў.
2. Напішы, за што ты ўдзячны сваім продкам.

***Заключная малітва:*** падручнік вучня

Тэма № 27, Х кл.

## МАЛІТВА — ДЫЯЛОГ ЛЮБОВІ ПАМІЖ БОГАМ І ЧАЛАВЕКАМ

***Дыдактычная мэта:***

указваем моладзі на тое, што малітва – сустрэча чалавека з Богам – з’яўляецца самым істотным вымярэннем чалавечай сутнасці. Заахвочваем знайсці ў Бібліі шматлікія моманты апісання малітвы. Стараемся абудзіць у моладзі свядомасць таго, што малітва – гэта сіла, якая перамяняе свет.

***Выхаваўчая мэта*:**

заахвочваем да даверлівай і частай малітвы — дыялогу чалавека з Богам.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы*:**

Святое Пісанне: Лк 3,21; Лк 6,12; Лк 9, 18-22; Лк 9,28-29; Лк 22, 39-46 ; Лк 23,34-46; Мц 6,5-8.

***Метады катэхэзы:*** праца ў групах, “сонейка”.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Ойча наш.

***Чалавек пытае***

Сэрца кожнага чалавека ікнецца да свайго Стварыцеля. Гэтае імкненне нараджае жаданне навязаць дыялог з усемагутным, добрым, любячым Айцом. Хтосьці прыходзіць да Бога з пытаннямі, хтосьці хоча падзякаваць, хтосьці перапрасіць, а хтосьці проста паразмаўляць, адкрыць перад Ім сваё параненае сэрца, папрасіць аб патрэбных ласках.

Гартаючы малітоўнік, ты неаднойчы мог убачыць, якая вялікая колькасць малітваў у ім. Магчыма, ты таксама задаваў сабе пытанне якую з іх выбраць? Як навучыцца правільна маліцца?

**Пан Бог адказвае**

Узорам сапраўднай малітвы для кожнага чалавека з’яўляецца малітва Езуса. Евангелісты неаднойчы паказваюць нам Езуса, які моліцца. Найбольш такіх апісанняў мы знаходзім у Евангеллі паводле Лукі.

*Катэхет дзеліць клас на 4 групы і кожнай з іх раздае карткі, дзе вучні пішуць адказ на наступнае пытанне:*

— Дзе і калі Езус маліўся?

Група I:

**«І сталася калі хрысціўся ўвесь народ, і калі Езус, атрымаўшы хрост, маліўся, раскрылася неба, і Дух Святы ў цялесным выглядзе, як голуб сышоў на Яго, і быў голас з неба, які прамовіў: Ты Сын Мой умілаваны; Цябе ўпадабаў Я!»** (пар Лк 3,21)

**«А яшчэ больш распаўсюджваліся чуткі пра Яго, і вялікае мноства людзей сыходзілася, каб слухаць Яго і атрымаць аздараўленне ад сваіх немачаў. А Ён адыходзіў у пустыныя месцы і маліўся»** (пар Лк 5,15-16)

**Група II:**

**«У тыя дні Езус ўзыйшоў на гару памаліцца і правёў усю ноч у малітве да Бога. Калі настаў дзень, паклікаў сваіх вучняў і выбраў з іх дванаццаць, якіх і назваў Апосталамі»** (Лк 6,12)

**«Калі Езус маліўся ў самоце, вучні далучыліся да Яго. І спытаўся ў іх: Кім лічыць Мяне народ? Яны сказалі ў адказ: Янам Хрысціцелем, іншыя Ільлёю, некаторыя ж кажуць, што адзін з даўніх прарокаў уваскрос. Ён спытаўся ў іх: А вы кім лічыце Мяне? Адказаў Пётр: Месіяй Божым. Але Ён строга загадаў ім нікому не казаць пра гэта, кажучы, што Сын Чалавечы павінен выцерпець шмат, што адкінуць Яго старэйшыны, першасвятары і кніжнікі, што Ён будзе забіты, і на трэці дзень уваскрэсне»** (пар Лк 9, 18-22)

**Група III:**

**«Пасля гэтых словаў, дзён праз восем, Езус узяў з сабою Пятра, Яна і Якуба і узыйшоў на гару памаліцца. І калі Ён маліўся, выгляд твару Ягонага змяніўся, і вопратка Яго стала бліскуча-белай»** (пар Лк 9,28-29)

**«Калі Езус быў у пэўным месцы і маліўся, і калі перастаў, адзін з вучняў Ягоных сказаў Яму: Пане, навучы нас маліцца, як і Ян навучыў сваіх вучняў. Ён сказаў ім: Калі моліцеся, кажыце: Ойча, няхай свяціцца імя Тваё, няхай прыйдзе Валадарства Тваё. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння, і адпусці нам грахі нашыя, бо і мы адпускаем кожнаму даўжніку нашаму; і не дапусьці нас у спакусу, але ратуй нас ад ліхога»** (пар Лк 11,1-4)

**Група IV:**

**«І выйшаўшы пайшоў як звычайна на гару Аліўную; за Ім следам пайшлі і вучні Ягоныя. А прыйшоўшы на месца, сказаў ім: маліцеся, каб**

**не ўпасці ў спакусу. І сам адышоў ад іх - як кінуць каменем, і, схіліўшы калені, маліўся, кажучы: Ойча, о, калі б Ты дазволіў пранесці келіх гэты міма Мяне! Зрэшты, не Мая воля, а Твая хай будзе. І з'явіўся Яму анёл з нябёсаў і ўмацоўваў Яго. І ў змаганні ўнутраным руплівей маліўся; і быў пот Ягоны, як кроплі крыві, што падалі на зямлю. Устаўшы з малітвы, Ён прыйшоў да вучняў, і застаў іх у сне ад смутку, і сказаў ім: што вы спіце? устаньце і маліцеся, каб не ўпасьці ў спакусу**» (пар Лк 22, 39-46)

«**А Езус сказаў: Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць. І дзелячы адзенне Ягонае, кінулі жэрабя. Езус закрычаў моцным голасам: Ойча, у рукі Твае аддаю дух Мой. І сказаўшы гэта, сканаў**» (пар Лк 23; 34,46)

*Вучні запісваюць у падручнік:*

**Езус маліўся:**

— падчас хросту.
— у пустыні, пасля аздараўлення пракажонага.
— перад выбарам Дванаццаці.
— на гары Перамянянення.
— перад тым, як навучыў апосталаў малітве «Ойча наш».
— перад мукай.
— на крыжы.

*К. запрашае вучняў прааналізаваць яшчэ раз тэксты Святога Пісання, каб знайсці адказ на пытанне:*

— На што вы звярнулі ўвагу ў малітве Езуса?

*Свае адказы вучні запісваюць у падручнік. Напрыклад:*

- усё жыццё Хрыста аж да крыжа было прасякнута малітвай.
- малітвай суправаджаліся ўсе асноўныя здарэнні ў жыцці Езуса.
- Езус заўсёды знаходзіў час на малітву, нават тады, калі быў патрэбны людзям.
- размова з Айцом была для Езуса крыніцай моцы для сустрэчаў з людзьмі.
- малітва Езуса заахвочвала іншых людзей да малітвы (вучні папрасілі навучыць іх маліцца).
- Езус на малітве быў паслухмяны волі Айца.
- Езус моліцца за іншых (просьба прабачыць крыўдзіцелям)

***Чалавек адказвае Пану Богу***

Малітва Езуса –школа нашай малітвы. Езус, молячыся, дае нам яскравы ўзор таго, якой павінна быць нашая малітва. Езус перасцерагае нас перад тым, каб не рабіць з малітвы “тэатру”, бо гэта асабістая сустрэча з Богам.

*Кожны з вучняў у тэксце павінен падкрэсліць адказ на пытанне:*
— Якой павінна быць малітва? (*падручнік вучня)*

«**І калі молішся, не будзь, як крывадушнікі. Бо яны любяць стоячы маліцца ў сінагогах і на вуліцах, каб паказацца перад людзьмі. Сапраўды кажу вам: яны атрымліваюць сваю ўзнагароду. Ты ж, калі молішся, увайдзі ў пакой свой і, зачыніўшы дзверы свае, маліся да Айца твайго, Які ў таемнасці. І Айцец твой, які бачыць патаемнае, аддасць табе. Калі моліцеся, не гаварыце шмат, як язычнікі, бо яны думаюць, што ў мнагаслоўі сваім пачутыя будуць. Не будзьце ж падобнымі да іх, бо ведае Айцец ваш, у чым вы маеце патрэбу, раней, чым вы папросіце ў Яго**» (Мц 6,5-8)

Малітва – гэта размова з Богам. Якой яна будзе, у многім залежыць ад нас. У малітве можна сапраўды адкрыць перад Богам сваё сэрца, распачаць з Ім дыялог любові, адчуць Яго прысутнасць, пазнаць сябе, убачыць Яго ў падзеях пражытага дня. Каб добра маліцца, ты спачатку павінен засяродзіцца – знешне і ўнутрана. Знешне – значыць, адмовіўшыся ад усялякіх іншых заняткаў, прыняўшы належную паставу: седзячы, стоячы або ўкленчыўшы. Унутрана – значыць, адхіліўшы ў думках усе іншыя справы. Цяпер важныя толькі Бог і ты.

Святое Пісанне – гэта жывое Божае слова, скіраванае да нас, якое таксама з’яўляецца крыніцай малітвы і дыялогу з Богам. Адным з найпрыгажэйшых тэкстаў Святога Пісання, якія мы можам выкарыстоўваць для малітвы, з’яўляюцца псальмы.

***Разважанне:***

Жыццё кожнага з нас з’яўляецца адлюстраваннем нашай малітвы. Чалавек, з’яднаны з Богам у малітве, адчувае радасць жыцця, бачыць у ім сэнс, умее распазнаць Божую волю, бачыць сябе і іншага чалавека Яго вачамі, а цяжкія справы давярае Богу.

— Як выглядае мая малітва?
— Пра што я найчасцей размаўляю з Богам падчас малітвы?

| | |
|---|---|
| Месца маёй Малітвы | |
| Час, якія я штодня ахвярую на малітву | |
| Рысы маёй малітвы | |
| Асобы, за якіх я малюся | |
| Мая любімая малітва | |

***Пастанова.***
***Хатняе заданне:***

Святое Пісанне – гэта жывое Божае слова, якое таксама з'яўляецца крыніцай малітвы і дыялогу з Богам. Адным з найпрыгажэйшых тэкстаў Святога Пісання, якія ты можаш выкарыстоўваць для малітвы, з'яўляюцца псальмы.

1.Выпішы ў сшытак з Кнігі Псальмаў той псальм, які найбольш табе падабаецца ў якасці малітвы і старайся ім маліцца.

***Заключная малітва:*** Пс 43(42), 1